№ 41 (447) 4 лістапада 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



## Сын ардэнаносца

Аляксандар Мілінкевіч — пра сваіх бацькоў.

старонка 3

## Свабодны тэатар

На сцэне — лаянка, у залі — піва, гэтак выглядае «Беларуская самаідэнтыфікацыя». Рэпартаж з прэм’еры.

старонка 2




СКАНДАЛЫ

**Фальшываманэтнік, зьвязаны з КДБ?**
Арыштаваны Ўладзіслаў Ліпскі настойвае, нібыта ў Нямеччыну ён трапіў паводле заданьня КДБ з тым, каб укараніцца ў банды фальшываманэтнікаў з постсавецкіх краінаў. **Старонка 2.**

ГАСПАДАРКА

**Беларускі цуд**
Яраслаў Раманчук пра рэальны стан эканомікі. **Старонка 5.**

ПРАМЭНАД

**Ерусалім над Шчарай**
Беларусь трэба глядзець увосень, у самую раскошу. Шпацыр па Слоніме зь Сяргеем Харэўскім. **Старонка 13.**

СТЫЛЬ ЖЫЦЬЦЯ

**Джэніфэр Лопэс**
На вокладцы календара Pirelli. **Старонка 21.**

КУЛЬТУРА

**Паэт, які хацеў забіць Будзённага**
Валянцін Тарас пра Сяргея Дзергая. **Старонка 19.**


**Дык падпісвайся!**
Падпісны індэкс «НН» 63125. Падпіска каштуе 4510 рублёў на месяц. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3440 руб. на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі праўдзівай інфармацыі і вострых камэнтароў штотыдзень. Дык падпісвайся!

# Найважнейшае з мастацтваў

Элегантны пачатак выбараў: затрыманьня 70 сяброў ініцыятывы «Партнэрства», што, выкупіўшы білеты на тры сэансы фільму «Жах Амітывілю», сабраліся ў кінатэатры «Цэнтральны», каб стварыць грамадзкую арганізацыю для назіраньня за галасаваньнем–2006. У выніку моладзь зацьвердзіла статут і абрала кіраўніка проста ў Маскоўскім РУУС. **Старонка 3. На фота:** кіраўнік «Партнэрства» Мікола Астрэйка ў шпіталі, куды ён трапіў зь вязьніцы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## У студзені распачнецца буйная мадэрнізацыя «Нафтану»

Тым часам былога гендырэктара заводу выпусьцілі пад падпіску пра нявыезд.

У верасьні былому гендырэктару ААТ «Нафтан» Канстанціну Часнавіцкаму, які падазраецца ў крадзяжы 8 млн даляраў, выручаных ад экспартных апэрацый, утрыманьне пад вартай замянілі на хатні арышт.

К.Часнавіцкі знаходзіцца дома ў Наваполацку. Генэральны пракурор Пятро Міклашэвіч ахарактарызаваў справу як складаную ды адмовіўся назваць прыблізныя тэрміны перадачы яе ў суд. Сам К.Часнавіцкі, паводле нашых зьвестак, стаў актыўна супрацоўнічаць са сьледзтвам. Напэўна, таму і было прынята рашэньне пра хатні арышт.

**Працяг на старонцы 5.**

## У Баку ўсё магчыма

Перад выбарамі ў Азэрбайджане ўсё паблыталася. Спэцыяльна для «НН» з Баку піша Інга Пэц.

У слабым сьвятле пражэктара, крыху сагнуўшыся, сыпінай да залі, сядзіць чалавек. Ён схіліўся над клявішамі раяля і імправізуе. Салман Гамбараў — адзін з найбольш знакамітых джаз-піяністаў Азэрбайджану. Гэты чалавек, які самазабытна грае на сцэне бакінскага «Джаз-цэнтру», яўна мае што сказаць іншым. Адно што амаль ніхто яго ня слухае. У залі — тры-чатыры слухачы.

Вялікая заля на шумным бульвары Рашыда Бейбутава ў горадзе нафты звычайна пустая. Гэта выдатны сымбаль краіны, што забылася на тое, якую важнасьць маюць культура і мараль, калі трэба выстаяць, страціўшы ўсякую надзею. Краіны, якая праз 15 гадоў пасьля здабыцьця незалежнасьці шукае сваю ідэнтычнасьць недзе паміж нафтай, ісламам, Захадам і дэмакратыяй. Сёньняшні Азэрбайджан — гэта гропы і карупцыя, «мэрсэдэсы» і ўцекачы. У Баку ёсьць людзі, што спрабуюць дамагчыся зьменаў, але шукаць іх трэба доўга.

**Працяг на старонцы 10.**

## ЦЫТАТЫ

### Што застанецца ад дзяржавы, дзе кіраўнік мяняе канстытуцыю пад сябе?

Прэзыдэнт Расеі Ўладзімер Пуцін яшчэ раз пацьвердзіў, што не зьбіраецца балятавацца на трэці прэзыдэнцкі тэрмін, паведамляе ІТАР-ТАСС. Я цудоўна разумею, што мяжа 2008 году будзе для Расеі сур'ёзным выпрабаваньнем. Разам з тым, у адпаведнасьці з Канстытуцыяй Расеі прэзыдэнт выбіраецца тэрмінам на чатыры гады прамым тайным галасаваньнем і ня можа займаць гэту пасаду больш, чым два тэрміны запар», — заявіў ён нідэрляндзкім СМІ напярэдадні дзяржаўнага візыту ў гэту краіну. «Мне, канечне, неабыякава, у чыіх руках апынецца лёс краіны, якой я прысьвяціў усё сваё жыцьцё. Але калі кожны новы кіраўнік дзяржавы будзе мяняць канстытуцыю пад сябе самога, то ад такой дзяржавы хутка нічога не застанецца», — мяркуе Ўладзімер Пуцін.

### Еханураў параўнаў Лукашэнку

Выступаючы ў вашынгтонскім Фондзе Карнэгі, прэм'ер-міністар Украіны Юры Еханураў узгадаў пра сваю нядаўнюю сустрэчу з А.Лукашэнкам. Украінскі прэм'ер назваў беларускага лідэра таленавітым прапагандыстам, што ўмее працаваць з народнымі масамі, і дадаў: «Цяпер я разумею, чаму ў 30-я гады нямецкія жанчыны крычалі: «Хачу дзіця ад фюрэра!».

## КАМЭНТАР

### Супраць каго сьвяткуюць?

4 лістапада Расея адзначае Дзень нацыянальнага яднаньня — «вызваленьне Масквы ад польска-літоўскіх акупантаў». У 1612 г. расейскае апалчэньне пад кіраўніцтвам Мініна і Пажарскага штурмам узяло маскоўскі Кітай-горад, дзе засеў гарнізон Рэчы Паспалітай. Праз год на трон села дынастыя Раманавых.
Хто ведае, як бы павярнулася гісторыя Ўсходняй Эўропы, калі б у XVII ст. беларусы гетмана Яна Караля Хадкевіча здолелі прабіцца на дапамогу гарнізону, што засеў у Кітай-горадзе.

Працяг на старонцы 6.

# Цела з жывой галавой

На сцэне — лаянка, у залі — піва: гэтак выглядае «Беларуская самаідэнтыфікацыя». Пра новую пастаноўку Свабоднага тэатру піша **Антон Трафімовіч**.

Сумесь піва, закускі, цыгарэтнага дыму ў імправізаванай залі з будаўнікамі, расейскім матам і лямпачкамі замест бутэлек на імправізаванай сцэне. Што гэта такое? Ня што іншае, як спэктакль «Мы. Самаідэнтыфікацыя» «Свабоднага тэатру» (рэжысэр Уладзімер Шчэрбань). Менавіта ў такой не зусім звычайнай форме адбыўся паказ спэктаклю, які стаў вынікам праекту «Мы» — конкурсу сярод беларускіх драматургаў, у творах якіх даецца адказ на пытаньне «Хто такія беларусы?».

Адчуваньня таго, што ты ў тэатры, перад пачаткам спэктаклю не было. Перад уваходам не стаялі сур'ёзныя мужчыны ў касьцюмах і прыбраныя жанчыны. Квіткоў не пыталіся. Зайшоўшы ўнутр, падумаў, што не туды трапіў: людзі п'юць піва, ядуць, мітусяцца. Тэатрам нават і ня пахла — пахла дымам ад цыгарэт. Атмасфэра была больш падобная да ангельскага пабу. Але ўрэшце перад наведнікамі клюбу зьявіліся арганізатары і рэжысэр, і ўсё стала на свае месцы.

«Прапусьціце актораў!» — раздалося ў залі, і чатыры чалавекі ва ўніформе будаўнікоў з каскамі на галовах праз забітую залю прасунуліся ад дзьвярэй наперад, да вольнае прасторы перад столікамі. Вось гэтае «наперад» (больш-менш шырокая пляцоўка) і сталася месцам разгортваньня асноўных падзей. І людзі ў дзіўнай вопратцы сталі акторамі, наведвальнікі клюбу — тэатральнымі гледачамі, а невялічкі менскі клюб — сапраўдным тэатрам.

Але на гэтым ня скончыліся незвычайныя рэчы. Акторы адразу пачалі размаўляць на трасянцы, з выкарыстаньнем расейскай лаянкі. Уся рэч у тым, што пры падрыхтоўцы п'есы аўтар пабываў на будаўнічай пляцоўцы і запісаў на дыктафон размовы рабочых, зрабіўшы іх часткаю свайго твору. Для клясычнага тэатру гэта было б недапушчальна. Але не забывайцеся — гэта «Свабодны тэатар», а значыць, тут няма абмежаваньняў.

Наагул, у гэтай пастаноўцы адхіленьняў ад паняцьця «нармальна» хапала. Усе прадметы побыту замяняюцца нейкімі сымбалічнымі сурагатамі. Бутэлька — лямпачка, бутэрброд — цьвік.

Падзеі адбываюцца хутка. Паміж сабою яны ня зьвязаныя. Спэктакль складаецца зь невялікіх бытавых сцэн, якія перарываюцца будаўнікамі, што адбіваюць рукамі такт па касках на галовах. А пасьля — дыялёгі, дзе няма нейкіх альтэрнатыўных мацюкам выразаў.

Гледачы спачатку сьмяюцца з жывой размовы будаўнікоў, а пасьля асэнсоўваюць маналёг «цела з жывой галавой» пра рабства людзей у сёньняшнім грамадзтве.

Акторы, драматург, рэжысэр, ідэя — усё ў спэктаклі беларускае. Адзінае, што выбіваецца з гэтага шэрагу, — расейская мова. Але, паводле слоў арганізатараў, сёньня рыхтуюцца пераклады на беларускую мову дванаццаці п'есаў. Прычым пераклады павінны выйсьці «лепшымі за арыгінал».

**«Свабодны тэатар» — праект, арганізатарамі якога зьяўляюцца Гільдыя беларускіх драматургаў і сцэнарыстаў, тэатар-студыя «Малы тэатар» і іхныя прадстаўнікі Натальля Каляда, Андрэй Курэйчык, Мікалай Халезін. 27 кастрычніка былі падведзены вынікі першага міжнароднага конкурсу сучаснай драматургіі, у якім узяў удзел 141 аўтар зь дзевяці краін свету. На цырымоніі ўзнагароджваньня адбылася і прэм'ера спэктаклю «Мы. Самаідэнтыфікацыя».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Трэба біць іх іхнай жа зброяй

У пятніцу зранку я захацеў купіць «НН» і нехаця правёў маніторынг. Бо ў пошуках газэты прыйшлося прагуляцца па праспэкце ад Дому друку да Валадарскага. «Нашай Нівы» нідзе не было.

«НН» насамрэч прывозяць мала: іх раскупляюць ужо ўвечары чацьвярга.

Прасіць кіяскёрак, ветліва ці няветліва, няма сэнсу. Колькі б ні замовіла кіяскёрка, прывязуць колькі трэба. Колькі трэба, вырашаюць на Валадарскага, кажуць мне кіяскёркі («Менгарсаюздрук». — **«НН»**).

Гэта ня значыць, што чытачам ня варта нічога рабіць. Выхад падказала мне кіяскёрка ў пераходзе да ЦУМу. Яна прапанавала мне аформіць думкі ў кнігу прапаноў.

Сапраўды, гульня паводле лукашысцкіх правілаў можа мець карысьць. На кожную скаргу мусіць быць дадзены афіцыйны пісьмовы адказ.

Я напісаў у той кнізе за ўсе шапікі ад Дому друку да ЦУМу, хоць мог бы сьмела расьпісвацца за ўсе астатнія кіёскі, уключна з ускраіннымі паўднёва-заходнімі.

**Андрэй Ч-к, Менск**

**Ад Рэдакцыі.** Падобныя ж нараканьні прыходзілі ў Рэдакцыю і ад чытачоў зь іншых вуліцаў сталіцы. Але ў распаўсюдніцкіх арганізацыях нам адкрыта прызнаюцца, што ім забаронена браць на распаўсюд болей асобнікаў. Лукашэнкаўцы хочуць падперці кіем гару...

Парады: ветліва прасіце кіяскёрак замаўляць больш газэты, пішыце гэтую просьбу ў кнігах скаргаў. А найлепш падпісвайцеся — на шапікі гэта танна, а газэту можна забіраць ужо ў чацьвер.

Даставайце газэты любымі спосабамі і дзяліцеся чытанкай зь сябрамі. У межах сваіх суполак, дзе ёсьць стабільны попыт, ладзьце сеткі незалежнага распаўсюду.

# Фальшываманэтнік, зьвязаны з КДБ?

У Нямеччыне аднавіўся судовы працэс над групай фальшываманэтнікаў, мозгам якіх быў 33-гадовы жыхар Менску Ўладзіслаў Ліпскі. Паліцыя натрапіла ў Патсдаме на сьлед тайнай друкарні, што месьцілася ў старым будынку батанічнага саду, — нехта зь мясцовых данёс, што там вырошчваюцца каноплі. Але замест наркотыкаў паліцыя знайшла фальшывыя 50-эўравыя купюры. Як сьведчаць крымінолягі, такіх высакаякасных фальшывых эўра — а іх зроблена некалькі сотняў тысячаў — яшчэ не было ў Нямеччыне. Цымус у тым, што Ліпскі настойвае, нібыта ў Нямеччыну ён трапіў паводле заданьня КДБ з тым, каб укараніцца ў банды фальшываманэтнікаў з постсавецкіх краінаў.

**Паводле радыё «Свабода»**

## КРАЮ МОЙ РОДНЫ

### Вось дык мама

Праз дзікі выпадак паведаміла «Камсамолка»: двухгадовы Максім зь Верцяліпак (Гарадзенскі раён) выпіў 200 грамаў разьведзенага сьпірту. Ягоная маці заснула, пакінуўшы на стале пляшку з «напоем», якім частавалася на абед. Зь яе і выпіў хлопчык. Калі матка ачомалася і пабачыла сына без прыкметаў жыцьця, яна здагадалася выклікаць хуткую. Каб Максіма прывезлі на пару гадзінаў пазьней, выратаваць яго б не ўдалося.

Паводле дактароў, хлопчык змог выпіць столькі сьпірту, бо ў малых кепска развіты смакавыя рэцэптары. Ужо пасьля першага глытка наступіла алькагольнае ап'яненьне, і далей Максім не разумеў, што п'е горкую вадкасьць.

### Адкрыцьцё мэмарыялу Куліка

6 лістапада а 12-й гадзіне адбудзецца адкрыцьцё мэмарыялу на магіле Яўгена Куліка (Кальварыйскія могілкі, паўн.-зах. частка, уч. № 7, уваход з вул. Берута). Запрашаем усіх, найперш тых, хто спрычыніўся або жадае спрычыніцца сваім ахвяраваньнем да гэтай агульнаграмадзкай справы. Даведкі праз тэл.: 286-00-75, 400-89-86.



# Найважнейшае з мастацтваў

Стужка называлася «Жах Амітывілю».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Мін'юст нам адмовіў з фармулёўкай: «Адмоўлена па сутнасьці», кажа Зьміцер Саёнак.**

Лукашэнка пра сваю перамогу на выбарах у 2001 годзе сказаў: «Улада прадэманстравала сілу і арганізаванасьць, а беларускі народ — мудрасьць і пасьлядоўнасьць. Гэта элегантная перамога». Відавочна, «элегантная» гатовасьць да чарговае выбарчае кампаніі — пытаньне нумар адзін для ўладаў.

29 кастрычніка незарэгістраваная грамадзкая ініцыятыва «Партнэрства» меркавала правесьці ўстаноўчы зьезд. Зьезд пачаўся ў кінатэатры «Цэнтральны», скончыўся ў РУУС Маскоўскага раёну сталіцы.

Маючы досьвед апошніх гадоў, калі гарадзкія ўлады, дэманструючы сваю «сілу і арганізаванасьць», адмаўляюць у арэндзе памяшканьняў, удзельнікі зьезду «Партнэрства» пайшлі на неардынарны крок: набылі 60 квіткоў на тры ранішнія сэансы ў кінатэатры «Цэнтральны». Стужка называлася «Жах Амітывілю». У кінатэатры ад камэнтароў устрымліваюцца. Але для кіраўніцтва ўстановы пусьціць да сябе некалькі дзясяткаў чалавек, дамовіўшыся прадаць квіткі на сэансы, і не паказаць кіно, напэўна, было эканамічна выгадным.

Аднак праз 40 хвілінаў пасьля пачатку мерапрыемства ў залю ўвайшлі людзі ў форме і ў цывільным. Усіх затрымалі ды перавязьлі ў РУУС Маскоўскага раёну, дзе з затрыманых бралі тлумачальныя запіскі, адбіткі пальцаў ды фатаграфавалі для картатэкі. На чатырох чалавек, што сядзелі ў прэзыдыюме, склалі пратаколы за парушэньне грамадзкага парадку падчас масавых мерапрыемстваў. Суды над імі прайшлі ў панядзелак, 31 кастрычніка.

Старшыня Мікола Астрэйка і ягоныя намесьнікі Аляксандар Бондараў і Эніра Браніцкая — за арганізацыю несанкцыянаванага мерапрыемства асуджаны на 15 сутак арышту, Сьвятлана Конава заплаціць 30 базавых велічынь штрафу (870 тыс. руб.). Зрэшты, Астрэйку 1 лістапада перавялі ў 2-ю менскую клініку ў зьвязку з пагаршэньнем стану здароўʼя.

Улады могуць сьмела запісаць у свой актыў чарговую «элегантную» перамогу. Гэтым разам над грамадзянамі, якія ўсяго толькі хочуць кантраляваць сумленнасьць выбараў.

Цікава, што ў Маскоўскім РУУС актывістаў «Партнэрства» пасадзілі ў самую вялікую залю, якая зьмясьціла іх усіх. І пакуль супрацоўнікі міліцыі разьбіраліся, што да чаго, затрыманыя прадоўжылі ўстаноўчы зьезд, зацьвердзілі статут, абралі кіраўніцтва. Старшынём прагназавана стаў Мікола Астрэйка. Праўда, пратаколы былі канфіскаваныя супрацоўнікамі міліцыі як дакумэнты, якія сьведчаць пра правядзеньне несанкцыянаванага мерапрыемства.

«З аднаго боку, Мін'юст прымае рашэньне пра абавязковую рэгістрацыю ініцыятываў, а з другога — рэгістрацыю атрымаць немагчыма, — кажа Зьміцер Саёнак, каардынатар «Партнэрства» па Менску, выконвае абавязкі кіраўніка ініцыятывы ў сувязі са зьняволеньнем лідэраў. — Мы намагаліся зарэгістравацца яшчэ пры канцы 2002 г., але тады Мін'юст адмовіў зь дзіўнай фармулёўкай: «Адмоўлена па сутнасьці».

Толькі той, хто рыхтуе махлярствы, баіцца незалежнага назіраньня, лічаць хлопцы. «Будзем дзейнічаць, варыянтаў няма», — кажа адзін зь іх. А спосаб далейшых дзеяньняў будзе «вызначаны згодна з сытуацыяй».

**Зьміцер Дрыгайла**

## СЬЦІСЛА

### Пятро Міклашэвіч: стан пракуратуры катастрафічны

Генпракурор Пятро Міклашэвіч падаў прэзыдэнту службовую запіску аб катастрафічным становішчы, што склалася ў сыстэме пракуратуры. Паводле Міклашэвіча, 60% пракурораў Беларусі маюць стаж, меншы за тры гады, а бягучка кадраў, «выкліканая цяжкім матэрыяльным становішчам, прыводзіць да страшэннага непрафэсіяналізму супрацоўнікаў, якія губляюць і забываюць на месцы злачынства ўлікі, пакрываюць заказчыкаў і выканаўцаў злачынстваў, у тым ліку і забойстваў». Генпракурор просіць Лукашэнку вярнуць у пракуратуру кадры, якіх В.Шэйман зьвёў пасьля сыходу ў Адміністрацыю прэзыдэнта.

### Самсонаў — самы сумленны гулец

Беларускі майстар «малога» тэнісу Ўладзімер Самсонаў узнагароджаны прызам Міжнароднага алімпійскага камітэту Fair play («Сумленная гульня»). Падстава — учынак у фінале лютаўскага турніру «Топ-12» у Францыі, дзе Ўладзімер згуляў з расейцам Аляксеем Сьмірновым. Арбітар не прысудзіў дастаткова спрэчнага балу расейцу, але Самсонаў пасьля гэтага адмыслова двойчы згуляў у сетку, у выніку прайграўшы матч — 13:15. Свой учынак Уладзімер патлумачыў наступным чынам: «не захацеў гуляць у такі тэніс».

1 лістапада менавіта Ўладзімер прынёс беларусам перамогу ў матчы адборачнага турніру над зборнай Расеі. Беларусы выйгралі менскі матч зь лікам 3:2.

### Як пражыць на 70 даляраў?

Урад на падставе цэнаў верасьня зацьвердзіў новы бюджэт пражытачнага мінімуму — беларускую рысу беднасьці. Ягоны сярэдні памер — 150 тыс. рублёў (каля $70). Для працаздольнага насельніцтва БМП складае 165 тыс. руб., для пэнсіянэраў — 133 тыс. руб., для дзяцей у веку 3—16 гадоў — 176 тыс. Паводле зьвестак Мінстату, 16% насельніцтва краіны жывуць за рысай беднасьці.

### Марыніч у шпіталі

Стан здароўя палітвязьня Міхаіла Марыніча чарговы раз пагоршыўся, і яго перавялі ў турэмны шпіталь. Паводле словаў жонкі палітыка Тацяны Марыніч, яе мужа дабівае нізкая тэмпэратура ў камэры. «Пасьля інсульту ў яго трымаецца анямельне правай паловы тулава», — кажа спн.Марыніч.

**АР; afn.by, svaboda.org**

### А.Мілінкевіч выказаў спачуваньні сямʼі Валянціны Ганчар

31 кастрычніка Алесь Мілінкевіч выказаў спачуваньні родным і блізкім сямʼі Віктара Ганчара ў сувязі са сьмерцю ягонай маці Валянціны Адамаўны.

У размове з жонкай зьніклага палітыка Зінаідай Ганчар Алесь Мілінкевіч паабяцаў, што ў выпадку выбраньня яго прэзыдэнтам будзе створана незалежная сьледчая камісія, якая праўдзе поўнае расьсьледаваньне фактаў зьнікненьня вядомых палітыкаў у Беларусі і афіцыйна абвесьціць яго вынікі.

Пасьля таго, як у верасьні 1999 г. зьнік Віктар Ганчар, ягоная маці неадназова зьвярталася да кіраўніцтва краіны, але ніякага адказу на лісты не атрымала.

# Сын ардэнаносца

Аляксандар Мілінкевіч (на фота) расказвае пра свайго бацьку — кавалера ордэна Леніна і маці-настаўніцу.



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Калі за сьпінай цэлы сьвет

**— Аляксандар Уладзімеравіч, у беларусаў ёсьць прыказка «Які бацька, такі сын». Калі я заяжджаю ў родныя вёскі, старыя дзяды, каторыя мяне ня ведаюць, пытаюцца: «Ты чый будзеш, сынок?» Ім дастаткова пачуць, хто быў мой бацька, хто дзед… Беларусы — нацыя невялікая і дружная. Людзі любяць ведаць, хто адкуль, з каго. Вось чаму ўсіх так цікавіць паходжаньне палітыкаў. Хацеў бы распытацца Вас пра Вашых бацькоў. Як гарадзенец, я шмат чуў пра Вашага тату, дырэктара школы…**

— Першыя ўспаміны зьвязаныя з тым, што вельмі хацелася пабыць зь ім. Ён рана ішоў на работу і позна вяртаўся, ды яшчэ працягваў займацца справамі ў сваім пакойчыку, які мы гучна называлі кабінэтам. У адсутнасьць бацькі сяду за гэты стол, разгарну кнігу — і так лёгка чытаецца! Можа, уплываў строгі парадак, дзе кожная рэч займала сваё месца і нішто не адцягвала ўвагі… Сама атмасфэра была прасякнутая духам ведаў. Уяўляеце: гарэць настольная лямпа, на сьцяне вялікая геаграфічная карта, нібыта ўвесь сьвет у цябе за сьпінай. На паліцах — процьма кніг! Гэты таямнічы паўзмрок, памножаны на дзіцячую ўражлівасьць і фантазію, цішыня, калі ў цябе за сьпінай, здавалася, чувацьць шум усіх мораў і акіянаў, якія запрашалі ў падарожжа…

Часам думаю, што мой старэйшы брат Уладзімер менавіта ў гэтай атмасфэры адчуў цягу да мора — і па заканчэньні школы паступіў у Ленінградзкае мараходнае вучылішча.

**— Настаўнікі, якія працавалі разам з Уладзімерам Іванавічам, адзначаюць, што ў яго былі залатыя рукі.**

— Так, ён сапраўды быў умельцам. У вольны час працаваў у садзе. Вось тут я быў першым памочнікам! Бачылі б вы яго каля дрэваў! Пасьля пасадкі шчэпаў ён нянчыўся зь імі, як са сваімі школьнікамі. Асабліва любіў яблыню «белага наліву», старую, яшчэ з 1930-х гадоў.

### Які бацька, такі сын

**— Да Вас у школе і па-за школай увага была, відаць. Усё ж такі дырэктараў сын…**

— Што зьяўляюся сынам дырэктара, памятаў пастаянна. Цьвёрда ведаў, што нельга ставіць бацьку ў няёмкае становішча недарэчнымі выхадкамі. Падвесьці бацьку ня меў права. Памятаю, падыходзіць настаўніца і кажа: «Саша, у нас стварылі школьны хор. Хочаш запісацца?» Запісаўся. Калі б адмовіўся, то якраз і стварыў бы для бацькі невялікую праблему. Іншыя сказалі б: маўляў, дырэктараў сын Аляксандар адмаўляецца. А дырэктар заклікае ствараць хор, спартыўныя гурткі, духавы аркестар, танцавальныя сэкцыі… І, ведаеце, я ўдзячны лёсу, што сьпяваў у хоры, якім кіраваў знакаміты музыкант, заслужаны дзеяч культуры Адам Чопчыц.

**— Уладзімер Іванавіч сам падбіраў пэдагагічны калектыў?**

— Ён рэдка памыляўся ў кадрах, і мы дома ніколі ня чулі ад бацькі скаргаў на настаўнікаў. Меў талент зазірнуць у душу чалавека, знайсьці людзей, якія ведалі сваю справу. Адзін час у школе працаваў гішпанец Віяна, што паходзіў зь сямʼі гішпанскіх рэвалюцыянэраў. Гэты чалавек, найвыдатнейшы танцор, арганізаваў у школе адпаведны гурток. Аплата працы гэтых прафэсіяналаў была сымбалічная. Думаю, што людзі пагаджаліся займацца выхаваньнем моладзі з павагі да Ўладзімера Іванавіча. З падначаленымі бацька ніколі не гаварыў

**Працяг на старонцы 12.**

### Біяграфія Мілінкевічавага бацькі

тыповая для Заходняй Беларусі. Сямʼя была ў эвакуацыі падчас Першай сусьветнай. Вярнуліся зь Сібіры на папялішча. Ні капейкі грошай. Сямʼя была вялікай — дзясяцера дзяцей. Таму бацька дзіцем падрабляў пастушком. Апошняе аддавалі, каб сын атрымаў адукацыю.

Сам Уладзімер Іванавіч, як многія сялянскія дзеці, выбраў шлях настаўніцтва. Пачынаў ён пры Польшчы з працы ў славутым дзіцячым доме «Наш дом», дзе ягоным настаўнікам быў Януш Корчак. У савецкі час ён прайшоў дарогу да дырэктара школы і адпрацаваў ім 22 гады. Заслужаны настаўнік Беларусі, узнагароджаны ордэнам Леніна.

# Вялікая сіла

«Няважна, колькі прыйшло чалавек. Нават адзін чалавек, калі ён адолеў гэты шлях, мае вялікую сілу».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**30 кастрычніка ў Курапатах было шмат моладзі.**

### Субота. Талака

Суботнім ранкам курапацкі лес сустрэў талакоўцаў гукамі бэнзапілаў і трактароў. Кіравалі працай лесанарыхтоўшчыкаў вайскоўцы ды людзі ў цывільным.

Археоляг Мікола Крывальцэвіч, які займаўся ў свой час раскопкамі ў Курапатах, зьвязаў гэта з жаданьнем уладаў давесьці людзям пра клопат дзяржавы аб нэкропалі. Выглядала тое няўклюдна, асабліва калі трактары і КамАЗы з грукатам сунуліся проста праз натоўп.

Талакоўцы прыбіраліся ля крыжоў — іх на братніх магілах ахвяраў таталітарызму ўжо стаіць пяць соцень. Замежныя дыпляматы — прыехалі паслы ЗША і ўсіх краінаў Эўропы — з засяроджанымі тварамі слухалі аповед гісторыка Ігара Кузьняцова.

Апоўдні пачалося ўскладаньне кветак. Дыпляматы, аточаныя журналістамі, партыйцамі і «ціхарамі», рушылі ад пачатку мэмарыялу ўгару. Там прысутныя сабраліся ля памятнага каменя, на якім усталявалі недапрацаваную яшчэ шыльду, пра што распавядаў сам аўтар праекту Алесь Шатэрнік.

У гэты момант на гару падняўся кандыдат у прэзыдэнты Алесь Мілінкевіч. Гэта ўнесла ажыўленьне ў атмасфэру, нават «людзі ў цывільным» зь цікавасьцю зашапталіся між сабою. Счакаўшы, калі ўскладуць кветкі і запаляць сьвечкі дыпляматы, сп.Мілінкевіч паклаў букет белых і чырвоных ружаў, спавітых чорнай стужкай. Паклаўшы кветкі, перахрысьціўся і нейкі час пастаяў моўчкі ля каменя. Потым павітаўся з прадстаўнікамі дыпкорпусу і партыйцамі, пагутарыў з ахвотнымі.

Купка жанчын запела песьню. Побач, лузгаючы семкі, весела ўсьміхаліся «ціхары», якія калелі ў лесе ад самае раніцы. Але варта было людзям сабрацца ў кампанію і пачаць гаманіць, як побач зьяўляўся нехта зь міліцыянтаў і настойліва раіў не пачынаць мітынг. Калі ж фотакарэспандэнта «НН» сфатаграфавала аднаго з ушчувальнікаў, той прыгразіў адабраць фотаапарат і «засьвяціць стужку». Яшчэ раней міліцыянты спрабавалі перапісваць зьвесткі ў некаторых журналістаў.

На разьвітаньне пасолы ЗША і Францыі выказалі падзяку прысутным за экскурс у гісторыю. І сп.Крол, і сп.Шмялеўскі былі цалкам аднадушныя — толькі памятаючы ўрокі гісторыі, можна не дапусьціць паўтарэньня яе жахлівых старонак.

### Нядзеля. Шэсьце

Шэсьце на Дзяды. Наперадзе ідуць два хлопцы. Сёлета яны скончылі ўнівэрсытэт і працуюць па размеркаваньні ў дзяржканторах. Для іх шэсьце ў Курапаты — добрая звычка. «Ужо гадоў зь сем ходзім. А хто ладзіць — няважна, галоўнае, што людзі арганізавана ідуць», — кажа адзін зь іх.

30-гадовы Васіль трымае невялічкую дыстанцыю: «Дзяды — сьвята прыватнае, не пасуюць да яго палітычныя лёзунгі». Да нашай размовы далучаецца сталая жанчына: «Калі мы яшчэ можам спакойна прайсьці па праспэкце і данесьці да людзей нашы думкі?» У гэты час пару хлопцаў забягаюць дадому — іх вокны выходзяць на вул.Сядых, куды збочвае шэсьце, — і вывешваюць вялікі бел-чырвона-белы сьцяг. Раз-пораз аўтамабілісты падтрымліваюць удзельнікаў шэсьця гудкамі.

Наганяю добра апранутага спадара, які трымае за руку маленькую дачку: «Зусім забыўся, што сёньня шэсьце. Пайшлі ў краму, убачылі людзей — і адразу далучыліся». Душэўную раўнавагу парушае хіба што аўто з надпісам «СТВ», якое пастаянна мазоліць вочы. Апэратар цішком здымае з машыны. «Дзядзька, далучайся! Ці ты не беларус?» — міралюбна кпіць зь яго моладзь. Той толькі глыбей зашываецца ў свой швэдар.

«Невялікая розьніца, колькі сёньня чалавек. Нават адзін чалавек, калі ён адолеў гэты шлях і прыйшоў да Курапатаў, мае вялікую сілу», — кажа сталая бабуля ў капелюшы, абвязаным бел-чырвона-белай стужкай. Яна і яшчэ некалькі соцень чалавек сымбалічныя дзесяць кілямэтраў ад станцыі мэтро «Парк Чалюскінцаў» да Курапатаў у нядзелю адолелі.

**Сямён Печанко,**
**Сяргей Будкін**

# ТБМ больш не адраджае мовы

Улады не далі памяшканьня для зьезду Таварыства беларускай мовы.

30 кастрычніка ў Менску прайшоў IX Зьезд Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны. Напярэдадні арганізатарам мерапрыемства адмовілі ў правядзеньні зьезду ў Доме літаратара, які належыць прэзыдэнтуры, ды касьцёле Сьв. Сымона і Алены. У касьцёле спачатку пагадзіліся, але пасьля папрасілі прабачэньня. Цікава, што гэта адбылося праз два дні пасьля таго, як у Мін'юст, як патрабуе заканадаўства, былі дасланы ліст з запрашэньнем папрысутнічаць на сходзе. У выніку 128 дэлегатам прыйшлося ўшчаміцца ў цясьнюткі офіс Партыі БНФ. Людзі там сядзелі проста на галовах.

У якасьці гасьцей на форум запрасілі чыноўнікаў ды замежных паслоў. Але міністры ды старшыня Канстытуцыйнага суду ад удзелу ў зьезьдзе адмовіліся. А вось пасьлы ЗША і Польшчы — не. Джордж Крол падзякаваў сябрам ТБМ за дапамогу ў навучаньні беларускай мове, дзякуючы чаму ён «сяк-так размаўляе па-беларуску».

Справаздачны даклад старшыні ТБМ Алега Трусава стракацеў ад лічбаў. Колькасьць беларускамоўных навучэнцаў за 10 гадоў скарацілася з 40,7 да 23,8%, канал СТБ, што мае 10% беларускамоўнага вяшчаньня, узяў абавязак падняць плянку да 20%. 7000 сяброў арганізацыі рэгулярна плацяць узносы, 20 тысяч сымпатыкаў падкідаюць грошы нерэгулярна.

Старшыня ТБМ падзякаваў за павагу да роднай мовы некаторым прадпрыемствам і ўстановам: менскім хлеба- і лікёра-гарэлачным заводам, «Белпошце», Мінтранспарту — ды нагадаў пра папярэджаньне ад Мін'юсту, што ледзьве не прывяло да высяленьня сядзібы, ды расейскамоўнае вяшчаньне «Нямецкай хвалі».

Палітыкі, як звычайна, выкарыстоўвалі сход як магчымасьць выказацца. Выступалі Пятро Краўчанка, Уладзімер Колас. Вінцук Вячорка, на правах гаспадара перавысіўшы рэглямэнт, казаў пра непаразуменьні з краінамі старой Эўропы ў моўным пытаньні.

Адзіны кандыдат ад дэмсілаў Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што ня варта чакаць, пакуль зьменіцца ўлада, а змагацца за мову тут і цяпер. Ён таксама зьвярнуў увагу на двайныя стандарты дзяржаўных СМІ. Узгадваючы віскат пра ўціск нацменшасьцяў у Прыбалтыцы, яны замоўчваюць уціск прадстаўнікоў тытульнай нацыі ў Беларусі.

Паводле вынікаў зьезду былі прыняты стос дакумэнтаў: звароты да прэзыдэнта краіны з патрабаваньнем беларускамоўнага вяшчаньня на тэлебачаньні, заснаваньня нацыянальнага ўнівэрсытэту з цалкам беларускамоўным навучаньнем, зварот да Эўрапарлямэнту з патрабаваньнем вяшчаньня на Беларусь выключна па-беларуску, лісты ў пракуратуру, Мінадукацыі, віцэ-прэм'еру Дражыну пра заклапочанасьць нападам на сям'ю Лапіцкіх. Кантралявацць ход расьсьледаваньня справы даручана Радзе ТБМ. У.Колас нават заклікаў правесьці антыфашысцкі мітынг.

Алег Трусаў быў адзінагалосна пераабраны на чацьвёрты двухгадовы тэрмін.

Адметна, што актывісты ТБМ зьмянілі рыторыку: ня трэба адраджаць мовы, яна й не памірала; трэба ўмацоўваць яе пазыцыі, пашыраць сфэру яе ўжытку.

**СП**

## Янкаў прыклад

Міністар Радзькоў загадаў вырашыць пытаньне на карысьць беларускамоўнага школьніка.




«САЛІДАРНАСЦЬ»

**10-гадовы ліцэіст з Жодзіна Янка Лапіцкі зноў зможа вучыцца па-беларуску.**

Год спатрэбіўся бацькам Янкі Лапіцкага, 10-гадовага ліцэіста з Жодзіна, каб дамагчыся для сына права навучацца на роднай мове. Што толькі яны ні пачулі ад чыноўнікаў: і пра нерэнтабэльнасьць беларускамоўных клясаў, і пра парушэньне правы дзіцяці на адукацыю праз адмову вучыцца на народнай мове. Пасьля Лапіцкім прапанавалі вучыць сына ў беларускай школе ў вёсцы за 10 км ад гораду.

Бацькі дзяцей, што вучыліся зь Янкам, такога ціску ня вытрымалі. Цяпер іх дзеці вучацца ў клясах з расейскай мовай навучаньня. Лапіцкія вырашылі трымацца да канца. Вырашальным стаў ліст да міністра адукацыі Аляксандра Радзькова. Зь міністэрства ў аддзел адукацыі Жодзінскага гарвыканкаму прыйшоў загад: да 15 кастрычніка вырашыць пытаньне на карысьць Лапіцкіх.

Не зважаючы на тое, што цэлы год давялося вучыцца дома разам з бацькамі, Янка мае посьпехі ў вучобе. У яго шмат сяброў, якія атрымалі прыклад. І гэты прыклад не адзінкавы.

У Горках (Магілёўшчына) сям'я Каральковых таксама перамагла ў справе беларускамоўнага навучаньня для дачкі, і цяпер там пад сорак чалавек навучаюцца па-беларуску.

### Нацысты напалі на кватэру Лапіцкіх

У ноч на 24 кастрычніка невядомыя абстралялі кватэру, дзе жыве сям'я Лапіцкіх, шасьцю зарадамі з пнэўматычнай вінтоўкі. Былі разьбітыя шыбы, але ніхто не пацярпеў. У ноч з 24 на 25 кастрычніка ў тое ж акно кінулі два пакеты з чорнай фарбай. Па факце абстрэлу заведзена крымінальная справа. У Жодзіне мяркуюць, што гэта магло быць справай мясцовых нацыстаў. Янкаў тата **Аляксей Лапіцкі** ўзначальвае жодзінскія арганізацыі ТБМ і ПБНФ.

# Тозік паставіў заслон куантро і брамбуе

Мытны камітэт падрыхтаваў праект указу прэзыдэнта аб скасаваньні крамаў бяспошліннага гандлю.

З 52-х крамаў duty-free застанецца дзьве: адна ў Нацыянальным аэрапорце «Менск», другая — для абслугі дыпкорпусу. Крамы на пагранпераходах ліквідуюцца.

Асартымэнт такіх магазынаў традыцыйны — цыгарэты, шакаляда, парфума, сувэніры. Асноўны артыкул даходу — імпартны алькаголь, які ў duty-free танны, бо не абкладаецца акцызамі і ПДВ.

У першым паўгодзьдзі імпарт у Беларусь алькагольных напояў склаў 11,5 млн даляраў (341 тыс. дэкалітраў), зь іх на крамы duty-free прыходзіцца 8,3 млн даляраў (275 тыс. дэкалітраў). Але наіўна думаць, што плян такім крамам робяць чаўнакі на польскім і літоўскім памежжы. Крамы duty-free былі каналам увозу ў Беларусь алькаголю бяз сплаты падаткаў. Непадакцызны алькаголь ішоў падпольным распаўсюднікам прадукцыі, гаспадарам рэстаранаў.

Схема працавала, пакуль крамы не праверыў Камітэт дзяржкантролю. Праверка выявіла, што аб'ёмы нелегальных паставак на ўнутраны рынак з гэтых крамаў роўныя абароту афіцыйных аптовых імпартэраў алькаголю.

**Зьміцер Дрыгайла**




WWW.ORLANDOAIRPORTS.NET

# У студзені распачнецца буйная мадэрнізацыя «Нафтану»

**Працяг з старонкі 1.**

Былы гендырэктар «Нафтану» быў затрыманы работнікамі КДБ год таму, разам з в.а. камэрцыйнага дырэктара прадпрыемства С.Мартынавым.

Папярэдне ў ходзе сьледзтва было ўстаноўлена, што крадзеж ажыццяўляўся шляхам арганізацыі тэндэраў на продаж нафтапрадуктаў і незаконнага выяўленьня іх пераможцаў — літоўскіх кампаніяў — і іншых пасрэднікаў, блізкіх да кіраўніцтва прадпрыемства. Часнавіцкі і Мартынаў абвінавачваюцца па арт. 210 ч. 4 Крымінальнага кодэксу — крадзеж шляхам злоўжываньня службовым становішчам, учынены арганізаванай групай альбо ў асабліва буйных памерах, што прадугледжвае пазбаўленьне волі на тэрмін 5—12 гадоў з канфіскацыяй маёмасьці.

Тым часам жыцьцё на «Нафтане» працягваецца. Са студзеня распачнецца тэхнічнае пераабсталяваньне коштам 500 млн даляраў, што мусіць прывесьці да павышэньня колькасьці перапрацоўкі нафты з 9,5 млн т у год да 12 млн т. 50 млн даляраў «Нафтан» бярэ ў крэдыт (на прадпрыемстве кажуць, што не ў беларускіх банках), астатнія 90% складуць уласныя сродкі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Нафтаперапрацоўчы завод «Нафтан»**

працуе з 1963. У 2002 г. завод пераўтвораны ў ААТ. Дзяржава валодае 99,8% акцый, 0,2% належыць калектыву.

# Беларуская эканоміка на словах і на справе

Працэнты, якімі апэруюць беларускія міністры, — вынік спрытнасьці рук беларускіх статыстыкаў. Рэальныя тэмпы росту беларускай эканомікі нават адстаюць ад аналягічных паказчыкаў у нашых суседзяў. Піша лібэральны эканаміст **Яраслаў Раманчук**.

Усьлед за ідэолягамі ад улады асобныя экспэрты — як на Захадзе, так і ў Расеі — пачалі казаць пра беларускі фэномэн. Маўляў, краіны Усходняй Эўропы абралі рынак і дэмакратыю, але атрымалі нестабільнасьць і шэраг сацыяльна-эканамічных праблем. А беларускі ўрад зрабіў стаўку на аднаўленьне асноў сацыялістычнай, плянавай эканомікі з захаваньнем манаполіі на палітычную ўладу. У пацьверджаньне гэтаму кажуць пра нізкае беспрацоўе ў Беларусі, імклівы рост ВУП, рэгулярную выплату заробкаў і пэнсіяў, бесьперабойную працу буйных прамысловых прадпрыемстваў. Але ці ёсьць краіна ў нашым рэгіёне, дзе эканоміка цяпер не расьце, а заробкі не выплачваюцца?

### На тле сусьветнай мапы

Найлепшым чынам месца беларускай эканомікі ў сьвеце ілюструюць паказчыкі валавага нацыянальнага даходу (ВНД) на душу насельніцтва. Падлік вядзецца Сусьветным банкам.

Згодна з апошнімі зьвесткамі, ВНД Беларусі ў 2004 г. склаў $20,9 млрд, альбо $2120 на душу насельніцтва. У гэтых паказчыках наша краіна апярэдзіла Азэрбайджан з Армэніяй, але затое нас абагналі нават партнэры па Адзінай эканамічнай прасторы, за вынняткам Украіны. Казахстан мае ВНД $2260 на душу насельніцтва, Расея — $3410. ВНД Польшчы ў 2,9 разу большы за беларускі, Літвы — у 2,7 разу. ВНД на душу насельніцтва Нямеччыны ў 14,2 разу вышэй за нашы, а сярэдняя амэрыканская «душа» ў 19,5 разу багацейшая за беларускую.

Не зьяўляюцца ўнікальнымі й тэмпы росту ВУП, якія ў 2003—2004 г. на душу насельніцтва склалі 11,5%. Украіна за гэты час павялічыла ВУП на 12,9%, Туркмэністан — на 15,4%. Калі ж узяць часавы прамежак 2000—2004, то тэмпы росту ВУП Беларусі (6,7%) губляюцца на тле дзясяткаў іншых краінаў. Украіна мае паказчык у 2000—2004 г. — 8,6%, Кітай — 8,7%, Малдова — 6,9%, Літва і Латвія — па 7,5%.

### Крызіс сельскай гаспадаркі

Айчынныя ідэолягі ставяць у прыклад беларускую сельскую гаспадарку — маўляў, тут вялікія дасягненьні. Але статыстыка пераконвае ў адваротным: пры велічэзных датацыях (за апошнія 10 гадоў у сярэднім у год ля $700—900 млн) чысты прыбытак сэктару ў 2004 г. склаў толькі $190 млн.

Сёньняшняе вядзеньне сельскай гаспадаркі ў краіне — накачка бясплатнымі альбо вельмі таннымі рэсурсамі калгасаў і саўгасаў, прымусовыя пастаўкі сыравіны, паліва і фактараў вытворчасьці для сельскагаспадарчых вытворцаў па заніжаных цэнах, а таксама загадны характар збыту на ўнутраным рынку. Таму ўся эфэктыўнасьць дасягаецца вялікімі аб'ёмамі дзяржпадтрымкі аграсэктару. Інвэстыцыйная палітыка ў сфэры сельскай гаспадаркі таксама правалена, пра што сьведчыць наступная выснова Сусьветнага банку: «Дзяржпадтрымка сканцэнтравана на неэфэктыўных гаспадарках і застаецца недастаткова празрыстая, што сур'ёзна адбіваецца на функцыянаваньні банкаўскай сыстэмы. Гэта падрывае дэкляраваныя намаганьні дзяржавы па садзейнічаньні росту вытворчасьці ў галіне». Вынікам такой сельскагаспадарчай палітыкі зьяўляецца вельмі дарагі для падаткаплатнікаў і скрайне неэфэктыўны АПК.

**Працяг на старонцы 15.**

## СЬЦІСЛА

### Гандаль цалкам прыватны

Аснову раздробнага тавараабароту ў краіне складаюць прыватныя гандлёвыя прадпрыемствы, заяўляе Міністэрства статыстыкі й аналізу. На прыватнікаў прыпадае 81,6% розьнічнага тавараабароту, на дяржаўныя прадпрыемствы — 16 %, на замежныя — 2,4%.

### «Залаты Талер» пазбаўлены ліцэнзіі

З 8 лістапада ў беларуска-брытанскага банку «Залаты талер» будзе адклікана ліцэнзія на прыцягненьне ва ўклады сродкаў фізычных асоб. Прычына — памер уласнага капіталу банку меншы, чым устаноўлена Нацбанкам для банкаў, што маюць ліцэнзію на работу з укладамі грамадзян (10 млн эўра). У «Залатым талеры» ён складае 8 млн эўра.

### Нацбанк супраць СЭЗаў

Нацбанк адмяніў ільготы па мінімальным памеры статутнага фонду і ўласнага капіталу банкаў, зарэгістраваных на тэрыторыі свабодных эканамічных зонаў. Цяпер статутны фонд банку, зарэгістраванага ў СЭЗ, мусіць быць такі ж як і звычайнага банку — ня менш за 5 млн эўра (раней — 500 тыс.). Калі ж банк жадае прыцягваць сродкі фізычных асобаў, то яго мінімальны статутны фонд павінны быць ня меншы за 10 мільёнаў эўра. З 31 беларускага банку на тэрыторыі СЭЗаў зарэгістравана сем.

### NMT-сувязі больш ня будзе

Да канца году апэратар мабільнай сувязі «БелСэл» згорне базавыя станцыі аналягавай сувязі стандарту NMT-450, што працавала ад 1992 г. Усе абанэнты будуць пераведзены на стандарт cdma2000 («diallog»). Сёньня колькасьць абанэнтаў «БелСэлу» складае каля 100 тыс. чалавек.

### Беларускі павільён у Маскве

У адным з павільёнаў маскоўскай ВДНГ адкрыецца беларускі гандлёвы цэнтар. Агульная плошча павільёну — 3,3 тыс. м$^2$. На ім будуць выстаўленыя тавары з усіх абласьцей.

**ЗД**

## КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 3 лістапада:**

1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 582,69 рубля
1 брытанскі фунт — 3 793,35
1 швайцарскі франк — 1671,27
1 латвійскі лат — 3 709,77
1 літоўскі літ — 748,10
1 польскі злоты — 651,26
1 расейскі рубель — 75,23
1 украінская грыўна — 426,22

**Паводле Нацбанку**

Polonia
POLSKIE RADIO

**з 1 лістапада** **пашырылася рэтрансьляцыя** перадач беларускай службы радыё **«Палёнія»** — праграмы для замежжа Польскага радыё. «Baltic Waves» рэтрансьлюе аднагадзінную перадачу апоўначы на сярэдніх хвалях (частата 612 кГц), а «Radio znad Wilii» — дзьве паўгадзінныя перадачы: у 4.30 і 22.00 на ультракароткіх хвалях (103,8 МГц).

Перадачы беларускай службы радыё «Палёнія» можна слухаць на кароткіх хвалях у 16.30 і 19.30 (частоты 6035 і 7180; 6050 кГц), па спадарожніку «Eutelsat II F–6 Hot Bird» (13° усходняе даўжыні, частата 11.474 ГГц, гарызантальная палярызацыя, нясучая гуку 7,38 МГц, у 7.30, 16.30, 19.30 і 23.30) ды ў Інтэрнэце ў жывым этэры і ў запісе — у некалькіх лічбавых фарматах: «Real Audio» і «Windows Media».

Дастаткова зайсьці на старонку беларускае службы сайту радыё «Палёнія»
www.pols– kieradio.pl/polonia
і слухаць у любы час.

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

## Хвоя зь фігавым лісьцем



**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

У дзень выдачы заробку ў Алешчы пачынаюцца крытычныя дні. Люд незадаволена бурчыць, атрымаўшы так званыя «разьліковыя лісткі», у якіх бухгальтэрыя расьпісвае кожнаму налічэньні й выдаткі за месяц. Сумневу падвяргаецца як сыстэма падлікаў у цэлым, так і правілы арытмэтыкі ў прыватнасьці: «Дзе мае начныя за другую зьмену?», «Мабыць, сталоўка нешта хімічыць з прадуктамі», «Ніяк не зразумею, чаго яны акруглялі: у слупок ня сходзіцца» — як мурашнік, гудзе лесапункт. Затым, памусоліўшы ў руках колькі каляровых паперак, народ пераходзіць ад матэматычных і тэхналягічных аспэктаў да сацыяльна-эканамічных: «Ды як за гэта можна жыць?», «І мы месяц укалваем за тыя капейкі?!.» Кіпеньне абуранага розуму завяршаецца рэвалюцыйнымі, ужо цалкам палітычнымі высновамі: «Паша, тэлефануй карэспандэнтам!», «З такімі заробкамі лепш у апазыцыю». І, нарэшце: «Усё. Галасуем за Мілінкевіча!»

Праўда, назаўтра — і на бліжэйшы тыдзень — народ сыходзіць у запой.

Зарабляюць тут мала. За верасень мне налічылі 120943 рублі, адмінусавалі падаткі й харчаваньне ў сталоўцы і выдалі на рукі 71 тысячу. Дзякуй богу, дапамагаюць наведнікі й праваабаронцы — інакш хапала б адно на хлеб і малако. А большасьць алешчынцаў ды маласіценцаў так і жывуць — на 30—50 даляраў штомесяц. Палова хлопцаў з Полацкай службы занятасьці, што купіліся на тамтэйшыя абяцанкі заробкаў «ад 400 тысяч», пасьля першага разьліку звольніліся, астатнія засталіся, бо не спадзяюцца знайсьці на Полаччыне што лепшае. Лукашэнкавы 250 даляраў тут атрымліваюць хіба што вадзіцелі лесавозаў ды начальства.

У апошняга на ўсе бурчаньні й пратэсты адказ адзін: «Не выконваеце плян! Дасьцё 120 кубоў за суткі — будзе вам добры заробак. А так — ані».

Калі казаць шчыра, выканаць 120-кубовы сутачны плян цягам месяца для Алешчы практычна нерэальна. Штодня ламаюцца краны або транспартэрная стужка, напіваецца раскрыжоўшчык або кранаўшчык — і праца становіцца. У Полацку пра гэта ведаюць, але паранейшаму трымаюць перад носам у лесапункту моркаўку-плян: «Дасі кубы — заробіш». Плян у Алешчы — яўная прымета каманднa-адміністрацыйнай эканомікі. «Дзяржава робіць выгляд, што нам плаціць, — мы робім выгляд, што працуем». Завезьці б усіх абаронцаў плянавае гаспадаркі сюды ды тыцнуць пысай у гэты разьвіты сацыялізм!

Паводле накладных, гружаны тутэйшымі хваёвымі шпаламі самазвал — гэта 1,8 млн рублёў. За дзень працы на алешчынскім тартаку (пакуль яго не спалілі) тры чалавекі пілавалі па некалькі самазвалаў. Між тым супольны месячны заробак больш чым трыццаці працаўнікоў алешчынскага Ніжняга складу — мільёнаў пяць. «Працуем на золаце, а атрымліваем капейкі», — абураюцца людзі. Хто ж распараджаецца грашыма? Фармальна «Полацаклес» — адкрытае акцыянэрнае таварыства. 43% акцый належаць працоўнаму калектыву, 57% — дзяржаве.

— 43% — доля немаленькая. Усталі б на сходзе акцыянэраў ды заявілі свае правы, — кажу рабочым, але ў адказ чую караценькае ды вычарпальнае: «Ну-ну». Усе разумеюць, што аб’яднаньне, як і ў савецкія часы, — усяго толькі ніжні паверх у дзяржаўнай індустрыяльнай герархіі, а дадатак «ААТ» — фігавы лісток.

Увогуле, гэты эканамічны абсурд зь бессаромнай высечкай і вывазам драўніны, заробкамі на ўзроўні афрыканскіх краін і цыркам «рыначнага сацыялізму» глядзіцца недарэчна, як хвоя зь фігавым лісьцем.

Рэальны ж плян разьвіцьця вытворчасьці й павышэньня заробкаў у Алешчы — не ўстаноўка чарговае планкі на якім-небудзь сэлектары ў Менску, а прыватызацыя й мадэрнізацыя ўсёй лясной гаспадаркі. Хай «Полацаклес» канкуруе зь «Віцебсклесам» і «Пінскдрэвам», а бізнэсоўцы з Наваполацку наладжваюць у Алешчы зборку драўляных домікаў на продаж. Толькі тады, за сапраўдным гаспадаром, люд будзе і даражыць працоўным месцам, і працаваць як сьлед.

Дзеля гэтага ў 2006-м трэба перамагаць.

*Малое Сітна*

# Ушанавалі Каліноўскіх

30 кастрычніка ў Сьвіслачы адбыўся штогадовы фэст, прысьвечаны памяці братоў Каліноўскіх і паўстанцаў 1863 году.

На ўрачыстасьці ў райцэнтар зьехаліся 60 чалавек — з Горадні, навакольных мястэчкаў, а таксама Берасьця, Менску, Бабруйску і Барысава. Міліцыянты затрымалі гісторыка архітэктуры зь Берасьця Ірыну Лаўроўскую. Яна ля магілы Віктара Каліноўскага стаяла з нацыянальным сьцягам. Спн. Лаўроўская прасіла не забіраць сьцяг, але яго не вярнулі, а жанчыну «запрасілі» на суд — за выкарыстаньне «незарэгістраванай сымболікі».

Удзельнікі фэсту запалілі зьнічкі ля помнікаў братам Каліноўскім і апошняму кіраўніку паўстаньня — Рамуальду Траўгуту, а таксама наведалі былую сядзібу сям’і Каліноўскіх у Якушоўцы.

**Сяргей Максімовіч, Сьвіслач—Горадня**



СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ

**Бард Зьміцер Сідаровіч грае на дудзе на сядзібе Каліноўскіх у Якушоўцы.**

СЬЦІСЛА

**У Казуліна сканфіскавалі пісьмо Мілінкевічу**

У старшыні БСДП (Г) **Аляксандра Казуліна** 27 кастрычніка падчас мытнага нагляду ў Нацыянальным аэрапорце «Менск» былі сканфіскаваны матэрыялы, якія палітык назваў партыйнай перапіскай. У выніку доўгага складаньня пратаколу Казулін, які ляцеў на зьезд швэдзкіх сацыял-дэмакратаў, спазьніўся ў самалёт. Палітык зьбіраецца падаваць заяву ў суд за зьнявагу маральнай і дзелавой рэпутацыі.

Пунктам нумар 1 у сьпісе сканфіскаваных рэчаў стаіць «Письмо А.Козулина Милинкевичу А.В. от 19 кастрычника 2005 г.». Фатакопію дакумэнту надрукавала «Народная воля».

**КДБ мае пытаньні да дзяўчат**

Аддзел пашпартна-візавай службы Кастрычніцкага раёну Менску 28 кастрычніка ня даў дазвол на выезд каардынатарцы праваабарончага аддзелу незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Ірыне Тоўсьцік**. Растлумачылі тым, што ў КДБ да яе «ўзьніклі пытаньні».

Менская гарадзкая калегія адвакатаў 28 кастрычніка адмовіла праваабаронцы **Веры Страмкоўскай** у адпачынку за свой кошт. Спн.Страмкоўская мелася ехаць у Тбілісі на міжнародную канфэрэнцыю АБСЭ ў пытаньнях незалежнасьці адвакатуры.

**Вось вам сумленныя выбары**

Міліцыянты 29 кастрычніка спынілі ўстаноўчы зьезд незарэгістраванага грамадзкага аб’яднаньня **«Партнэрства»** ў менскім кінатэатры «Цэнтральны», абвінавац累ўшы ў правядзеньні несанкцыянаванага сходу; каля 70 актывістаў трапілі ў аддзяленьне міліцыі. Пасьля пісьмовых тлумачэньняў каля 60 чалавек адпусьцілі. У спэцпрыёмнік трапілі лідэр арганізацыі **Мікалай Астрэйка**, ягоныя намесьнікі **Эніра Браніцкая** й **Аляксандар Бондараў**. 31 кастрычніка Астрэйка, Бондараў і Браніцкая атрымалі па 15 сутак арышту, **Сьвятлану Конаву** асудзілі на 30 базавых велічынь (870 тыс. руб.). Мэта «Партнэрства» — назіраньне за выбарамі, каб яны былі сумленнымі.

**Ліст пратэстанцкіх япіскапаў**

**Япіскапы пратэстанцкіх саюзаў і аб’яднаньняў** (пяцідзясятнікаў, баптыстаў і поўнаэвангельцаў) напісалі 28 кастрычніка адкрыты зварот кіраўніку Адміністрацыі прэзыдэнта Віктару Шэйману, прэм’ер-міністру Сяргею Сідорскаму і старшыні Менгарвыканкаму Міхаілу Паўлаву: яны просяць спыніць перасьлед пратэстанцкай царквы **«Новае жыцьцё»**.

**Абы прыдзерціся**

26 кастрычніка Вышэйшы гаспадарчы суд пакінуў у сіле папярэджаньне Міністэрства інфармацыі рэдакцыі газэты **«Белорусы и рынок»** у частцы, якая тычылася назвы выданьня. Такім чынам, выданьне пакуль ня зможа выкарыстоўваць у лягатыпе абрэвіятуру «БР», якая выкарыстоўвалася цягам двух год.

**Палякаў цягаюць**

У Шчучын 26 кастрычніка на допыт выклікалі журналістаў **Андрэя Пачобута** і **Анджэя Пісальніка**, а таксама намесьнікаў старшыні СПБ **Юзафа Пажэцкага** і **Веслава Кеўляка**.

28 кастрычніка Гарадзенская абласная пракуратура скасавала падпіску аб нявыезьдзе журналісту А.Пачобуту, аднак выехаць за мяжу ён ня можа: журналісту анулявалі дазвольны штамп у пашпарце.

Кіраўніцу СПБ **Анжаліку Борыс** 28 кастрычніка сем гадзін трымалі на памежным пераходзе «Бераставіца—Баброўнікі».

**Лябедзьку затрымалі**

27 кастрычніка ў аэрапорце «Менск-2» затрымалі лідэра АГП **Анатоля Лябедзьку**, які вяртаўся са Страсбургу з сустрэчы з кіраўніцтвам Эўразьвязу. Памежнікі й мытнікі з супрацоўнікамі КДБ пратрымалі яго ў аэрапорце паўтары гадзіны, а пасьля пільнага нагляду канфіскавалі працоўныя матэрыялы палітыка.

**Затрыманьні актывістаў**

25 кастрычніка актывісткі арганізацыі «Зубр» **Алена Копач** і **Натальля Вушко** былі затрыманы ў Менску міліцыянтамі за распаўсюд улётак.

25 кастрычніка супрацоўнікі УУС Цэнтральнага раёну затрымалі сяброў моладзевай фракцыі БНФ **Паўла Батуева** і **Алеся Мазаніка** за распаўсюд «Народнай волі». Міліцыянты перапісалі іх пашпартныя зьвесткі і адпусьцілі.

27 кастрычніка затрымалі «зуброўца» **Міхася Ісмаілава** з улёткамі, прысьвечанымі Дню салідарнасьці 16 лістапада.

**У Віцебску**

Судзьдзя Чыгуначнага раённага суду Віцебску Юры Урбан прысудзіў 25 кастычніка актывісту КХП-БНФ **Уладзімеру Плешчанку** штраф у 29 000 руб. за «дробнае хуліганства». Міліцыянты абвінавацілі яго ў абразе прахожых на тым месцы, дзе У.Плешчанка звычайна распаўсюджваў партыйны бюлетэнь «Беларуская салідарнасьць». Адзіным сьведкам хуліганства быў супрацоўнік міліцыі, які і затрымаў актывіста.

29 кастрычніка стала вядома, што **віцебскую арганізацыю ПБНФ** пазбаўляюць офісу і юрыдычнага адрасу. Новае памяшканьне шукае таксама недзяржаўная газэта **«Витебский курьер»**.

**Сяргей Будкін, Аркадзь Шанскі**

## Супраць каго сьвяткуюць?

**Працяг са старонкі 2.**

Ды справа ня ў тым.

На 4 лістапада ў Маскве заплянавана шэсьце расейскіх патрыятычных арганізацый пад лёзунгамі «Выгнаць акупантаў», «Гэта наша зямля» ды «Расейцы ідуць». Ахвотных ксэнафобаў запрашаюць прыйсьці на акцыю пад імпэрскімі бела-жоўта-чорнымі сьцягамі. Акцыя дазволена мэрыяй.

Новы прэзыдэнт Польшчы Лех Качыньскі ў інтэрвію «Новой газете» назваў гэта «дзіўным выбарам нацыянальнага сьвята». Пагатоў што ёсьць лепшыя нагоды: «Значна раней была бітва на Кулікоўскім полі, перамога ў якой пацьвердзіла, што расейскі народ існуе як народ эўрапейскі і хрысьціянскі», — сказаў ён. А быў жа яшчэ Напалеон… Зрэшты, палякі — і беларусы зь літоўцамі — ня Францыя і ня братнія татары. Перамогу над імі можна і адсьвяткаваць.

Расея ўсё сьвяткуе перамогі. Як і Беларусь — як афіцыйная, так і дэмакратычная. Улады адзначаюць перамогу ў Вялікай айчыннай, нацыяналісты — бітву пад Воршай. Добра, што сьвяткуюць. Кепска, калі сьвяткуюць супраць. Супраць «літоўскіх заваёўнікаў», супраць «маскоўцаў», супраць… супраць… Заходняя Эўропа даўно адышла ад такой традыцыі — адзначаючы нейкія гадавіны, яна імкнецца не ўшчамляць гістарычнае памяці ніводнага народу. Пару тыдняў таму з размахам было адзначана 200-годзьдзе Трафальгарскай бітвы — калі брытанскі флёт пад кіраўніцтвам адмірала Гарацыё Нэльсана разграміў французаў. Але на гэтым акцэнт не рабіўся. Было проста супольнае адзначэньне юбілею — супольнае перамогі і супольнае паразы брытанцаў, французаў і гішпанцаў з удзелам найвышэйшых асоб трох краін. І ніякіх заяваў, што брытанцы ад некага кагосьці выратавалі. Эўропа жыве іншымі катэгорыямі. Ёсьць чаго павучыцца.

**Алег Раявец**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Разбураюць, каб аднавіць

У Менску разьбіраюць апошні захаваны дом на Ніжнім Рынку, пад саборам. Уладзімер Папруга: «Мінкульт робіць злачынства».

Дом па вуліцы Гандлёвай 27, пастаўлены ў другой палове XIX—пач.XX ст., унесены ў дзяржаўны Сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў. Каля гістарычнага будынку, што месьціцца ля Сьвята-Духавага сабору, 2 лістапада прайшоў пікет у яго абарону. На абарону помніка архітэктуры сабралося тры дзясяткі чалавек — студэнты, мастакі, музыкі. Яны былі без плякатаў, таму ўсё адбылося незаўважна.

Будаўнікі, што працуюць на «аб'екце», кажуць, што дом маюць зьнесьці ў сьнежні.

У 1996 г. будынак з уласнасьці Фонду культуры перайшоў Экзархату РПЦ, які мяркуе стварыць тут духоўна-адукацыйны цэнтар. Былі праведзеныя кансэрвацыйныя работы, унутры дагэтуль відаць нядаўнюю цэглу.

Намесьнік начальніка ўпраўленьня па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Ігар Чарняўскі зазначыў, што будынак разьбіраюць, бо ён «вісіць у паветры: на працягу многіх гадоў яго падмывала вада». Паводле Чарняўскага, дом разьбяруць, а на яго месцы адновяць будынак у першапачатковым выглядзе зь першапачатковым дэкорам.

Але былы галоўны дзяржаўны інспэктар па ахове гісторыка-культурнай спадчыны па Менску Ўладзімер Папруга лічыць: «У адпаведнасьці з законам гэта злачынства, у адпаведнасьці з працэдурай — легітымны акт». Паводле яганых слоў, гэта адзіны гістарычны будынак, які застаўся на спуску да Ніжняга рынку. «Усё адбываецца па адной і той самай схеме: інсьпіруецца зварот легітымнай установы, у гэтым выпадку — РПЦ, а потым органы, якія павінны сачыць за выкананьнем закону, прымаюць рашэньне, якое парушае ўсе законы і мэтодыкі. Верхні горад ужо адрэстаўравалі так: вычышчалі цалкам культурны слой, залівалі падмуркі бэтонам і на іх ставілі зусім новыя дамы».

Пры канцы савецкай эпохі дзякуючы пратэстам грамадзкасьці гэты будынак удалося ўратаваць ад разбурэньня. Цяпер усё зайшло далей.

**Аркадзь Шанскі**

**Дом сіяністаў сьцерты зь зямлі**

**У кастрычніку зьнік яшчэ адзін выдатны помнік архітэктуры XIX ст. — комплекс дамоў №3 і №3а па вуліцы Калектарнай, на рагу зь Нямігаю. Гэтыя дзьве двухпавярховыя камяніцы з арыгінальным закрытым дваром з галерэямі былі апошнімі, што ацалелі ад колішняе вуліцы Габрэйскае. У адным зь іх 4—10 верасьня 1902 г. прайшла другая Усерасейская канфэрэнцыя сіяніцкіх арганізацыяў. Гэта быў першы легальны ў Расеі сход сіяністаў, дазвол на які даў сам міністар унутраных справаў. На тую славутую канфэрэнцыю зьехалася ажно 526 чалавек з розных краінаў. Адным махам была сьцертая памятка пра цэлы разьдзел гісторыі Беларусі.**

**У адрозьненьне ад прэзыдэнта Ірану, што прагне сьцерці з мапы дзяржаву Ізраіль, нашыя ўлады, мусіць, зьнішчылі «сіяніцкі» дом несьвядома. Калі гісторыя для цябе пачынаецца з 1994 году, як ты будзеш яе шанаваць?**

## СЬЦІСЛА

### Раньні Цецярэўскі

25 кастрычніка ў Полацкім цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур адкрылася выстава патрыярха фатасправы Эрнста Цецярэўскага. На вэрнісаж сабралася багата людзей. Фотамастак выставіў раньнія працы — краявіды гораду й калекцыю фотапартрэтаў вядомых людзей — барда Сержука Сокалава-Воюша, экс-дэпутата Валера Шчукіна, мастака Аляксандра Канавалава.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Маленькі герой

Трэцякласьнік Красьненскай сярэдняй школы, што на Карэліччыне, выратаваў з агню двух маленькіх дзетак. Калі пачаўся пажар, бацькоў у хаце не было, і дзяўчынкі-дашкольніцы апынуліся зь бядой сам-насам. На шчасьце, пажар заўважыў суседзкі хлопчык, які адразу кінуўся ў ахоплены полымем дом і вывеў адтуль перапалоханых сясьцёр. Прадстаўнікі МНС узнагародзілі героя каштоўным падарункам. А калгасны прафкам падарыў хлопцу новую куртку, бо ягоная згарэла ў юнага ратавальніка на плячах. Завуць героя Аляксандар Ложачнік. Болей бы такіх Аляксандраў!

**СП, Карэлічы**

### Па Лукашэнкавых мясьцінах

Адна зь фірмаў Воршы пачала ажыцьцяўляць падарожжы па маршруце Ворша—Ляўкі—Копысь—Александрыя. Спачатку турысты накіроўваюцца ў музэй Купалы ў Ляўках. Экспазыцыю музэю, відаць, не мянялі з часу яго адкрыцьця, хіба за апошні час добраўпарадкавалі тэрыторыю Купалавага лецішча. Наступны пункт падарожжа — пасёлак Копысь — найстарэйшае паселішча Аршаншчыны і, згодна з энцыкляпэдыямі, месца нараджэньня першага прэзыдэнта РБ. За гадзіну экскурсанты наведаюць т.зв. Пятроўскі вал — умацаваньне часоў Паўночнай вайны. Пакажуць гасьцям цэнтральную вуліцу мястэчка, на добраўпарадкаваньне якога ў 2003 г. было выдаткавана 8 млрд рублёў. Аднак за прыгожай абгорткай не відаць галоўнай праблемы мястэчка — беспрацоўя. Адзінае значнае прадпрыемства тут — керамічны цэх, дзе робяць з прывазной гліны зграбныя гаршкі ды вазы. Высокай якасьці мясцовая гліна даўно не здабываецца, бо шмат каштуе яе перапрацоўка. А некалі вырабы копыскіх кафляроў былі вядомыя далёка за межамі Беларусі. У адной з заляў Эрмітажу й сёньня можна ўбачыць вялізную прыгожую кафлю «Тайная вячэра», зробленую ў Копысі ў XIX ст. Пасьля Копысі турысты накіроўваюцца на другі бераг Дняпра — там ужо Шклоўскі раён Магілёўскай вобласьці. Сёлета ў ліпені Аляксандар Лукашэнка наведаў малую радзіму й загадаў пабудаваць тут стацыянарны мост (пантонны працуе пэўны шэсьць месяцаў у год). Для пабудовы нават прыйдзецца зьнесьці тры дамы.

У вёсцы Александрыя, адкуль пайшоў у вялікі сьвет будучы прэзыдэнт, пакажуць школу, дзе ён вучыўся, ды месца, дзе стаяла матчына хата. Час знаходжаньня ў вёсцы абмежаваны 15 хвілінамі. Мабыць, для таго, каб цікаўныя турысты не пачалі задаваць розныя недарэчныя пытаньні, накшталт таго, чаму разбурылі прэзыдэнтаву хату.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

ТЭНДЭНЦЫІ

## У чаканьні Спартака



**СЯМЁН ПЕЧАНКО**

Купляючы квіток на цэнтральным аўтавакзале, убачыў на акенцы касы налепку, што засьцерагала грамадзянаў нашай краіны ад замежнага рабства. Але тут у чэргах стаяць людзі, што не выяжджаюць за мяжу, а жыхары райцэнтраў, мястэчак і вёсак.
Яны амаль штодня сутыкаюцца калі ня з рабствам, то з паўпрыгоннай залежнасьцю ад уладаў — пачынаючы ад калгаснага брыгадзіра і завяршаючы кіраўнікамі вобласьці. Шматлікія суботнікі, паборы на рэканструкцыю чарговай сталіцы дажынак — што гэта, як не прыгон? Часам самі слугі народу робяцца закладнікамі сытуацыі. Некалькі год таму, рыхтуючы Мір да чарговага дня «непісьменства і ўздруку», раённае кіраўніцтва выправіла і сваіх дэлегатаў на працу. Дзіўнавата глядзеліся бухгальтаркі з пэндзлямі, фарбуючы платы побач зь сінюшнымі шабашнікамі. Альбо абсякаць гальлё на прыдарожных тапалях — ці гэта справа супрацоўніцы сельсавету?
Асобная гісторыя — праца школьнікаў. Вясковыя школы наўпрост залежаць ад мясцовых калгасаў. Таму першыя месяцы навучальнага году дзеці ня вучацца, а працуюць. Для настаўнікаў немалое выпрабаваньне — утрымаць дысцыпліну на полі. Са старэйшымі вучнямі яшчэ можна неяк паладзіць, а вось малодшыя амаль не кіроўныя. А чаго яшчэ хацець ад пяціклясьнікаў? Дзеці проста адбываюць свой прыгон. А разам зь імі і настаўнікі, якія мусяць адпрацаваць і на бульбе, і на бураках. Начальства тым часам цікуе, каб «прыгонныя» ня неслі дамоў з поля моркву, каб ня зьбеглі раней часу. Крый божа выканаць плян раней часу і разысьціся па хатах. Абурацца ў голас наважваецца далёка ня кожны. Звыклі да хамута? Старэйшае пакаленьне нібы вярнулася ў мінулы час. Маладыя ж чакаюць моманту, калі можна будзе вырвацца з гэтае пасткі. Хоць куды — у горад ці нават за мяжу.
У савецкай яшчэ Латвіі ў цэнтральнай газэце надрукавалі разгневаны допіс цудоўнай артысткі Віі Артманэ. Акцёраў тэатру выправілі на сельгасработы, дзе артыстка моцна застудзілася. На другі дзень яна выконвала ролю Кардэліі ў драме Шэкспіра і выклікала ў гледачоў нашмат больш спачуваньняў, чым няшчасны Кароль Лір. Ці варта казаць, што такія эпізоды ў гісторыі Латвіі, якую так любіць ганіць БТ, засталіся незваротна ў мінулым? Аднак нельга казаць, што і ў нас усе моўчкі пагаджаюцца зь існым станам рэчаў. Зразумела, у сёньняшніх варунках надта не памітынгуеш, асабліва ў правінцыі. Але людзі пачынаюць задумваца. І яны чакаюць свайго Спартака.

# Кіраўніцы ТЮГу падабаецца трохмоўе


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Але яна абвяргае інфармацыю пра пераход тэатру на расейскую мову.

«Гэта паклёп. За чуткі ўхапіліся тыя, хто намагаецца вылезьці на палітычную арэну». Паводле словаў галоўнай рэжысэркі Тэатру юнага гледача Натальлі Башавай **(на фота)**, прычынай чутак стала мастацкая рада тэатру, дзе абмяркоўвалася пытаньне пастаноўкі аднаго-двух спэктакляў па-расейску. У ТЮГ пэрыядычна зьвяртаюцца бацькі дзяцей з пытаньнем, ці будуць спэктаклі для маленькіх дзяцей на расейскай мове. Сябры мастацкай рады ў большасьці сышліся на меркаваньні, што, калі зьявіцца прапанова паставіць твор па-расейску, яе варта разглядзець. Тым больш што на экспэрымэнтальнай сцэне ТЮГу ўжо даўно ідуць спэктаклі па-расейску. «У рэпэртуары Купалаўскага і Тэатру беларускай драматургіі таксама ёсьць расейскамоўныя пастаноўкі, але ад гэтага згаданыя тэатры не перастаюць быць беларускімі. Расейскі тэатар імя Горкага, наадварот, шукае цяпер п'есу для пастаноўкі на беларускай мове. Ад гэтага ж ён не перастане быць Расейскім драматычным», — кажа Н.Башава.

Спн.Башава, якая выхоўвае сына-другаклясьніка, зазначае, што часьцяком дзеці ўпершыню ў сваім жыцьці сутыкаюцца зь беларускай мовай менавіта ў ТЮГу. Яна катэгарычна супраць «русіфікацыі» тэатру. «Аднак што адказваць тым, хто хоча ўбачыць у нас і расейскамоўныя пастаноўкі? У нас дзьве дзяржаўныя мовы, і з гэтым нічога ня зробіш. Мы павінны ўлічваць інтарэсы ўсіх нашых гледачоў».

Н.Башавай падабаецца прыклад казаскага ТЮГу, які працуе на трох мовах. Там у адзін дзень ставяць Шэксьпіра паказаску, на наступны дзень — па-расейску, а потым — па-ангельску.

Рэжысэрка заўпэўнівае: рашэньні, якія выходзяць за кола ўнутраных праблем тэатру, будуць папярэдне выносіцца на суд шырокай тэатральнай грамадзкасьці. А сёньня тэатар як працаваў на беларускай мове, так і будзе працаваць. «Бо гэта Беларускі рэспубліканскі тэатар юнага гледача. Адзіны ў краіне. І ён адназначна застанецца беларускім», — кажа Башава.

Налета тэатру спаўняецца роўна 50 год. У найбліжэйшых плянах — шмат пастановак беларускіх аўтараў. Тэатар супрацоўнічае з драматургамі С.Кавалёвым, П.Васючэнкам, А.Дударавым, А.Карэлінам. А ў новым сэзоне гледачоў чакае прэм'ера: «Марныя высілкі каханьня» паводле Шэксьпіра ў перакладзе Р.Барадуліна.

**Сяргей Будкін**

## Як можа мова ўплываць на папулярнасьць тэатру?

Камэнтуе тэатральны крытык **Вячаслаў Ракіцкі**, радыё «Свабода».

«Ніколі за трыццаць гадоў, якія займаюся тэатральнай крытыкай, я ня бачыў, каб хтосьці ў Беларусі, і ў тым жа ТЮГу, не разумеў беларускай мовы. Не разумелі дрэннага спэктаклю, так, і вельмі часта, а мовы — ніколі! Я памятаю часы, калі й спэктаклі Беларускага ТЮГу на беларускай мове ў той жа Прыбалтыцы сустракалі авацыямі.

Знакаміты расейскі драматург Аляксандар Валодзін з сотняў пастановак сваёй п'есы «Зь любімымі не расставайцеся» менскую пастаноўку лічыў лепшай. Ён казаў, што менавіта беларуская мова менскіх тюгаўцаў дадала п'есе нейкай асаблівай вастрыні. Не магу я забыць маскоўскія гастролі Тэатру Янкі Купалы: заля Малога тэатра аж стагнала ад захапленьня, калі па-беларуску гаварыла Стэфанія Станюта. Ніхто ня браў навушнікаў дзеля перакладу. Беларускамоўным спэктаклям пляскаў у далоні і раздаваў прызы прэстыжны Эдынбурскі фэстываль.

Калі кажуць, што мова замінае мастацтву, дык падаюць самы непрафэсійны аргумэнт. Зрэшты, ён жа і самы банальны з тых, якімі карыстаюцца, каб прыхаваць сваю прафэсійную нядатнасьць. Мова ўвогуле ня ёсьць перашкодай для ўспрыманьня спэктаклю. Больш за тое, спэктакль паўстае з мовы. Пастаноўкі Андрэя Барысава на якуцкай мове стоячы вітаў ці ня ўвесь сьвет. І калі б якуты іх ігралі на расейскай мове, то нават да Масквы не даехалі б, ня тое што да Мэксыкі. Таленавітыя акторы і рэжысэры ў тым ліку і праз мову адчыняюць тонкасьці нацыянальнага характару, праз мову дасягаецца нацыянальная вобразнасьць.

Творца — гэта ня толькі рамесьнік, які лепш ці горш іграе на сцэне, а яшчэ і місіянэр, які ў ідэале нясе адказнасьць шмат за што, у тым ліку і за стан нацыянальнай культуры, уключна з мовай».

## СЬЦІСЛА

### Першы піяр Мілінкевіча

Гіт-парад музычнага сайту «Тузін гітоў» будзе камэнтаваць Алесь Мілінкевіч. Дагэтуль экспэртамі выступалі К.Камоцкая, Л.Вольскі, А.Памідораў. Каардынатар праекту Аляксей Мінчонак кажа, што на «ТГ» заўсёды туры камэнтавалі цікавыя асобы. Сярод іх былі музыкі і прадусэры, а вось палітыкаў яшчэ не было. Таму й вырашылі запрасіць Мілінкевіча, ведаючы ягоную любоў да беларускай музыкі. На Tut.by-еўскім форуме гэта ўжо назвалі «першым удалым піяр-ходам адзінага» :).

### Дыск Данчыка

«БМА Group» выдала кампакт-дыск з песьнямі Багдана Андрусішына, якія 20 гадоў таму былі запісаныя ў Нью-ёрскай студыі Angel Sound і выйшлі на кружэлцы «Я ад вас далёка». Своеасаблівым «відэабонусам» выступае запіс канцэрту Данчыка ў менскай філярмоніі ў 1996 г. Сам сьпявак і рэдактар беларускай службы радыё «Свабода» заявіў, што не мяркуе ладзіць з нагоды выхаду дыску канцэрт, бо ня лічыць сябе падрыхтаваным. «БМА Group» плянуе перавыдаць на кампакт-дысках усе альбомы сьпевака.

### «Саша і Сірожа» шукаюць таленты

Вядомы тэледуэт зьбіраецца экранізаваць увесь дэбютны альбом «Ска-ты!». Хутка зьявіцца ўжо чацьвёрты відэаролік. Гэтым разам абралі песьню «Новы год». У кліпе будзе прысутнічаць сцэна масавай фіззарадкі. «СіС» запрашаюць у ёй зьняцца ўсіх ахвотных. Здымкі трэ было дасылаць да 1 лістапада на e-mail: klip@lyapis.com, але для асаблівых ахвотнікаў тэрмін будзе падоўжаны.

### «Бардаўская восень»

У фэстывалі «Бардаўская восень-2005» на Беласточчыне галоўны прыз (магчымасьць запісаць альбом у прафэсійнай радыёстудыі) не атрымаў ніхто. Прафэсійную гітару атрымала бардаўская трыё з Польшчы (Ілона Карпюк, Мажэна Русачык, Андрэй Грэсь), барды зь Беларусі Ільля Паплоўка й Андрэй Касьцень — па 10 гадзін студыйнага запісу.

### Pager-вершы Лабадзенкі

Накладам 300 асобнікаў убачыла сьвет кніга Глеба Лабадзенкі «Pager-вершы: начная лірыка». Прадмову да кнігі напісаў Рыгор Барадулін, пасьлямову — Андрэй Хадановіч. Кніга выйшла за сродкі самога аўтара. Pager-вершы — творы, дасланыя аўтарам праз пэйджар. У кнізе яны падаюцца з асаблівасьцямі «незьбеларушчанага» пэйджара: з «1» заміж «і», бязь літар «ё» ды «ў».

**Адам Воршыч**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Глеб Лабадзенка ўвекавечыў пэйджар у вершах.**

## КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Borowik, Przemyslaw. Jurydyki miasta Grodna w XV—XVIII wieku. Stanowy podzial nieruchomosci.** — Suprasl: Collegium Supraslienѕe, 2005. — 412 s. — (Acta Collegii Supraslienѕis. Tom VII). [**Баравік, Пшэмыслаў. Юрыдыкі места Горадня ў XV—XVIII ст. Саслоўны падзел нерухомасьці**].

Кніга прысьвечана гісторыі ўзьнікненьня і фармаваньня ў Горадні юрыдыкаў — адміністрацыйна адасобленых частак гораду, якія належалі шляхце ці царкве і жыхары якіх судова і падаткова не падпарадкоўваліся гарадзкой магдэбургіі. Адметнасьць Горадні паўплывала на тое, што рэпрэзэнтацыйныя рэзыдэнцыі шляхты, а таксама маёмасьць кляштараў ды цэркваў выштурхнулі мяшчанскую забудову з цэнтру гораду на менш прыцягальныя тэрыторыі.

**Гарбачова В.В. Удзельнікі паўстаньня 1830—1831 г. у Беларусі: Біябібліяграфічны слоўнік.** — Менск: БДУ, 2004. — 400 с. Наклад 100 ас.

У беларускай гістарыяграфіі захоўваюцца ўяўленьні, што паўстаньне 1830—1831 г. на абшарах былой Рэчы Паспалітай мела ў Беларусі тэрытарыяльна абмежаваны характар, а ўдзельнікі яго былі нешматлікія. Зьвесткі пра 2300 удзельнікаў паўстаньня, якія сабрала аўтарка, сьведчаць пра цікавыя лёсы і вельмі розныя характары змагароў за адраджэньне былых шляхецкіх вольнасьцяў ды страчанай дзяржаўнасьці.

**АДз**

# Дзісна, радзіма Апалінэра

**Алесь Аркуш** і **Зьміцер Бартосік** скіраваліся на Дзісеншчыну шукаць рэшткі маёнтку Кастравіцкіх — продкаў францускага паэта **Гіёма Апалінэра**. Маршрутам, якім калісьці будуць езьдзіць турысты з Парыжу.

Сяргей Дубавец першы выказаў здагадку, што род Кастравіцкіх, які даў сьвету слыннага Гіёма Апалінэра, жыў не на Наваградчыне, як сьцьвярджалі энцыкляпэдыі, а ў паўночна-заходняй Беларусі, у Дарашковічах (ці Дарожкавічах, як пазначана на сёньняшніх мапах) над Дзісной. С.Дубавец адшукаў у «Польскім слоўніку геаграфічным» канца XIX ст., што каля 1780 г. Дарашковічы на Дзісеншчыне былі ўласнасьцю Міхала Кастравіцкага, полацкага падваяводы, ад якога перайшлі да ягонага сына Адама, дзісенскага харужага.

Маёнтак у братоў Кастравіцкіх (Адама, Караля і Апалінар'я) канфіскавалі за ўдзел у паўстаньні 1863—1864 г. Караля, бацьку беларускага пісьменьніка Каруся Каганца, і Адама выслалі зь Беларусі, а Апалінар разам з дачкой зьбег ад царскіх рэпрэсій у Італію. У Рыме 26 жніўня 1880 г. і нарадзіўся будучы выбітны францускі паэт Гіём Апалінэр (Вільгельм Апалінары Кастравіцкі).


АЛЕСЬ АРКУШ

Зьміцер Бартосік ля адноўленага маёнтку Кастравіцкіх у Дарошкавічах.

### Тут хаваўся Адам Міцкевіч

У 2003 г. у Польшчы выйшла кніга былога дзісенца «Арлінае гняздо» — успаміны пра гісторыю Дзісенскай польскай гімназіі ў 1930-я гады.

У кнізе гаворыцца: «Каля мястэчка, побач зь якім пад ветразямі бяроз сівеў пяскамі Напалеонаўскі тракт, знаходзіўся маёнтак са старым, зьдзічэлым паркам. У парк, разьмешчаны высока над шумліваю камяністаю ракою, мы ня раз уцякалі з заняткаў. Маёнтак Дарашковічы калісьці належаў Кастравіцкім. Адам, сын Адама, маршалка Віленскай губэрні, быў сасланы як удзельнік паўстаньня 1863 г. у Арэнбург. Маёнтак канфіскавалі на карысьць нейкага царскага «унтэр Прышыбеева» высокага рангу. Маці Адама Людвіка з роду Пагоўскіх была добра знаёмая зь Міцкевічам, апекавалася зьняволенымі філярэтамі. Верш Міцкевіча «Матрос» быў пакінуты ў яе альбоме. Таксама мясцовае паданьне казала, што Міцкевіч пэўны час хаваўся менавіта ў гэтым маёнтку, у капліцы… Мы заўсёды падчас прагулак шукалі тую капліцу, але бяз выніку. Урэшце ўбачылі па-над Дзьвіной спаруду зь вежачкамі і пераконвалі сябе, што акурат у ёй хаваўся паэт. Прозьвішча Кастравіцкіх, тых самых, з Дарашковічаў, зьвязанае, паміж іншым, з францускім паэтам Апалінэрам».

### Капец-гарадок

Месца сядзібы Кастравіцкіх мы адшукалі хутка. Дарожкавічы сёньня знаходзяцца на самай ускраіне Дзісны, што на Мёршчыне. За апошнімі Кастравіцкімі ад маёнтку да Дзісны была вярста. Сёньняшняя Дзісна — мястэчка з насельніцтвам пад дзьве тысячы чалавек.

У Вінцэся Мудрова ёсьць аповед «Дваццаць крокаў дарогі», падзеі якога адбываюцца ў Дзісьне: мясцоваму жыхару закарцела выцягнуць зь Дзьвіны помнік Сталіну і паставіць перад домам (у Дзісьне сапраўды помнік Сталіну ўтапілі ў рацэ). Футаралягічны прагноз ня спраўдзіўся. Ніхто Сталіна з ракі тут не зьбіраецца выцягваць, наадварот — два гады таму дзісенцы зьнялі з пастамэнта Леніна, які пачаў развальвацца.

За часамі незалежнасьці збанкрутавала і ўся мясцовая прамысловасьць — малочны і кансэрвавы камбінаты, цагельны завод. З трох школ засталася адна. Эканоміка Дзісны ліпіць на двух прадпрыемствах — Лінейнай дыспэтчарскай станцыі, што пампуе наваполацкія нафтапрадукты на Вэнтспілз, ды Дзісенскім лясгасе.

### Бацюшка-фэрмэр

Мы былі зьдзіўлены, калі сярод рэштак сядзібнага парку знайшлі цалкам адноўлены будынак маёнтку! Будаўнічыя работы яшчэ працягваюцца, але сам дом мае дах і шыбы. Як нам паведамілі дзісенцы, радавую сядзібу Кастравіцкіх аднавіў мясцовы бацюшка Генадзь Каранеўскі.

Самога сьвятара мы пабачылі за рулём трактара. Айцец Генадзь мае 20 гектараў зямлі, камбайн, гадуе бычкоў. Сапраўды фэрмэр, ды яшчэ будаўнік. Сам лазіў па рыштаваньнях, калі дзісенцы аднаўлялі Ўваскрасенскую царкву, дзе захоўваецца сьпіс славутага абраза Смаленскай Маці Божай. Сам працаваў і на аднаўленьні маёнтку Кастравіцкіх.

Бацюшка, спасылаючыся на брак вольнага часу, доўга адмаўляўся ад гутаркі. Урэшце пагадзіўся. Айцец Генадзь паходзіць зь мястэчка Радунь, што на Воранаўшчыне. У Дзісьне — з 1989 г. Панскі маёнтак, ад якога засталіся толькі рэшткі асобных муроў, адбудоўвае дзесяць гадоў. «Навошта аднаўляеце?» — пытаемся. «Буду жыць». — «А ці ведаеце, што гэта радавы маёнтак роду Кастравіцкіх, зь якога паходзіць Гіём Апалінэр?» — «Ведаю». Айцец Генадзь цікавіўся гісторыяй сядзібы, сам рабіў праект рэстаўрацыі, мае здымкі старога панскага дому, імкнуўся аднавіць яго ў ранейшым выглядзе. Праўда, краязнавец Пётар Баговіч сьцьвярджае, што дакладна аднавіць дом а.Генадзю не ўдалося.

Зінаіда Казлоўская, што жыве побач з маёнткам, памятае апошняга ўладальніка сядзібы — Аляксандра Капылова. Яна нам расказала, што ў сядзібным парку некалі была магіла аднаго з Кастравіцкіх. Магчыма, што ў парку ці на каталіцкіх могілках некалі быў і фамільны склеп роду.

Справа тамтэйшых краязнаўцаў, ды і ўладаў Дзісны, — расшукаць магілы і аднавіць помнікі. Бо калі ў гарадок паедуць турысты з самога Парыжу, будзе сорамна казаць, што магілаў няма.






**Гіём Апалінэр**
(Вільгельм Апалінары Кастравіцкі) 26 жніўня 1880, Рым — 9 лістапада 1918) францускі паэт, пачынальнік сюррэалізму. Большасьць вершаў апублікавана пасьмяротна. На беларускую мову яго вершы перакладала Эдзі Агняцьвет (зб. «Зямны акіян»).

**Дзісна — сатэліт Полацку**

Полацкія крывічы заснавалі Дзісну ў X ст., пабудаваўшы тут крэпасьць Капец-гарадок. Дзісна была абарончай фартэцыяй на Дзьвіне, на сваім гербе таксама мела выяву ладзьдзі. Іван Жахлівы да Дзісны не дайшоў, таму менавіта сюды зьбеглі багатыя полацкія купцы і шляхта. Тут зьбіраў войскі Сьцяпан Батура, каб вызваліць Полацак. Дзісна ад XVI ст. мела магдэбурскае права. Два стагодзьдзі таму гэта быў другі па колькасьці насельніцтва горад на Полаччыне. На сутоку Дзісны і Дзьвіны цудоўныя краявіды.


WWW.RADZIMA.ORG


WWW.RADZIMA.ORG

**Дзісна. Мост цераз Дзьвіну, збудаваны ў 1908 годзе.**


WWW.RADZIMA.ORG

**Рэшткі шпіталю канца XIX стагодзьдзя.**

# Між нафтай і дэмакратыяй

Пра краіну «дзядулі Гейдара» піша аспірант Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту Аляксей Лашук.

Бакінская набярэжная. Вецер з Касьпійскага мора. «Горад вятроў» — так перакладаецца назва Баку. Зьлева і справа па баках бухтыпадковы гарацьць агні сталіцы Азэрбайджану, а сьпераду — чорная бездань Касьпію злучаецца з чорным бяздонным небам. Але гарызонт убачыць усё-такі можна: па ўсім далягляздзе — там, дзе мора сустракаецца зь небам, — рассыпаны ледзь бачныя агеньчыкі… Гэта ліхтары нафтавых плятформаў на шэльфе Касьпійскага мора.

Нафта — галоўны складнік азэрбайджанскага экспарту. Нафтаздабыча прыносіць штогод мільярдныя


AP

**Працэс галасаваньня ў Азэрбайджане адпавядае міжнародным нормам, але апазыцыі не дазваляюць праводзіць мітынгі ў цэнтры Баку.**

прыбыткі. Ужо больш як дзясятак гадоў апэратарамі нафтабізнэсу ў Азэрбайджане зьяўляюцца ня толькі дзяржава і канцэрн Azpetrol, але і карпарацыі British Petroleum, Shell, Total і іншыя нафтавыя гіганты.

У найбліжэйшы час экспарт нафты стане яшчэ зручнейшы — ужо адбылося ўрачыстае адкрыцьцё нафтаправоду Баку—Тбілісі—Джэйхан. Труба даўжынёй 1767 км злучае нафтавыя радовішчы касьпійскага шэльфу з турэцкім портам Джэйхан на Міжземным моры. Засталося толькі напоўніць трубу нафтай, стварыць патрэбны ціск — і праблема расейскага транзыту вырашаная. Пазыцыі Азэрбайджану як экспартэра нафты становяцца ўпэўненымі і гарантуюць стабільныя даходы ў цьвёрдай валюце.

«Каб гэтыя звышпрыбыткі накіраваць у рэальны сэктар эканомікі, можна было б палепшыць бізнэс-клімат і ўзровень жыцьця ў краіне, — кажа малады інтэлектуал Вугар. — Тое, што адбываецца цяпер, — у найлепшым выпадку праяданьне грошай, у горшым — крадзеж». Вугар — тыповы прадстаўнік маладога пакаленьня азэрбайджанскай інтэлектуальнай эліты. Атрымаўшы выдатную адукацыю за мяжой, ён працуе ў бакінскім прадстаўніцтве адной зь міжнародных арганізацый і надта цікавіцца падзеямі ў краіне. «Частка даходаў ад нафты нават не трапляе ў Азэрбайджан, частка даходзіць, але марнуецца на палацы. Толькі на мэблі для будынку навастворанага Фонду імя Гейдара Аліева ў цэнтры Баку пайшло больш за 30 млн даляраў».

Фонд імя Г.Аліева ўзначальвае жонка Ільхама Аліева, сына Гейдара. Пасьля сьмерці бацькі адказныя пасады ва ўрадзе і ў эканоміцы бязь зьменаў засталіся за сямейнікамі й сябрамі «клану». Затое пасьля сьмерці Гейдара значна зьмянілася гарадзкая тапаніміка. «Гэта — алея імя Гейдара Аліева, — гаворыць наш гід, — а гэта — плошча імя Гейдара Аліева, праспэкт імя Гейдара Аліева, спартовая арэна…» «...Імя Гейдара Аліева!» — працягваюць замежныя госьці. Паўсюль вялізныя зялёна-чырвона-сінія (колеры нацыянальнага сьцягу) бігборды з выявамі «вечна жывога» Гейдара і яго сына Ільхама. Адзін зь бігбордаў лепш за ўсё ілюструе культ былога прэзыдэнта, які стварэцца ў Азэрбайджане. На плякаце — трое маленькіх дзяцей гуляюць у кубікі. А на кубіках — літары, зь якіх дзеці складаюць словы: «Heydar baba» — «дзядуля Гейдар».

Сёлета ад зялёна-чырвона-сініх колераў і твараў на плякатах на вуліцах Азэрбайджану стракаціць увачку. Акрамя Алиевых, гэта яшчэ й выявы кандыдатаў на парлямэнцкіх выбарах. Пад узьдзеяньнем міжнароднай супольнасьці азэрбайджанскія ўлады лібэралізавалі выбарчае заканадаўства і зрабілі празрыстым працэс вылучэньня ды рэгістрацыі кандыдатаў. У выніку ў краіне адбываецца сапраўдны выбарчы бум. На 125 месцаў у «Мілі Мэджлісе» прэтэндуюць 1800 кандыдатаў. Выбары адбудуцца ў гэтую нядзелю.

**Баку—Менск**

## «Гэта ня проста Поўдзень, гэта яшчэ і Ўсход»

**Хто пераможа на выбарах у Азэрбайджане?** Найбольшыя шанцы мае партыя ўлады «Ені Азэрбайджан». Выклік ёй кінула апазыцыйная кааліцыя «Азадлык» («Свабода») у складзе трох партыяў: Народнага Фронту, «Мусават» і Дэмакратычнай. Трэба адзначыць, што палітычная барацьба ў Азэрбайджане цяпер грунтуецца не на ідэалягічных, а на кланавых падзелах. І ўрад, і апазыцыя арыентуюцца на ЗША і Турцыю. Заходнія дыпляматы ў Баку ў прыватных гутарках прызнаюць, што між лідэрамі ўлады і апазыцыі цяпер бывае цяжка знайсьці адрозьненьні, таму лічаць патрэбным «падтрымліваць сам дэмакратычны працэс». Які з часам народзіць новых палітыкаў і новую этыку, спадзяюцца яны. Этыку, што будзе выключаць карупцыю. «Як гэта было ў нас на поўдні Італіі», — сказаў журналісту «НН» італьянскі дыплямат у Баку. — «Што вы хочаце — гэта ня проста Поўдзень, гэта яшчэ і Ўсход», — разводзіць рукамі ён.



АЛЯКСЕЙ ЛАШУК

**Бігборды з Гейдарам — частка бакінскага пэйзажу.**

**Партыя Аліева «Ені Азэрбайджан» застаецца самай папулярнай.**


AFP

**Баку—Тбілісі—Джэйхан**

**Працягласьць трубаправоду Баку—Тбілісі—Джэйхан складае 1767 км. Прапускная здольнасьць — каля 1 млн барэляў у дзень. Апроч азэрбайджанскай, па нафтаправодзе пацячэ нафта з Казахстану. Кошт праекту складае 2,95 млрд даляраў, а з улікам выплат па крэдытах — 3,6 млрд даляраў. Пад 30% сродкаў былі выдзелены кампаніямі — удзельнікамі праекту, астатнія дадзены Эўрапейскім банкам рэканструкцыі і разьвіцьця (ЭБРР) і Сусьветным банкам. Аналітыкі зьвязваюць спадзевы на падзеньне цэнаў на нафту з увядзеньнем у дзеяньне гэтага трубаправоду.**

# У Баку ўсё магчыма

Працяг са старонкі 1.

Раін Султанаў — вядомы ў Азэрбайджане саксафаніст і ўладальнік «Джаз-цэнтру» — належыць да такіх людзей. «Мой унёсак — музыка», — кажа ён і падкрэсьлівае, што слухачоў у Цэнтры заўсёды няшмат. «Мала хто цікавіцца культурай. Мараль нуварышаў, што пануе апошнія пятнаццаць гадоў, разбурыла адукацыю і культуру. Нашы міністры любяць спорт і даюць багата грошай на футбол. А нашы арткестры знаходзяцца ў вартым жалю стане».

### Лібэральны Ільхам

Султанаў кажа, што ня бачыць у апазыцыі нікога, хто б палепшыў становішча: праблема не ў прэзыдэнце, а ў людзях зь ягонага атачэньня. Гэта распаўсюджанае меркаваньне ў Азэрбайджане напярэдадні выбараў. Замін Хаджы, папулярны малады публіцыст, зазначае: «У любым разе Ільхам больш дэмакратычны за свайго бацьку Гейдара. У Ільхама за два з паловай гады мы вырвалі больш свабоды, чым у ягонага бацькі за цэлае дзесяцігодзьдзе. Гейдар быў разбурыў усё тое добрае, на чым некалі трымаўся Азэрбайджан».

Паводле апытаньняў грамадзкай думкі, перамогу на выбарах у люстэрку атрымае кіраўнічая партыя «Ені Азэрбайджан». Ёй могуць дастацца больш за 50% галасоў. Кааліцыя «Азадлык» («Свабода») — блёк трох апазыцыйных партый на чале з Алі Керымлі. На аранжавым штандары — лёзунгі дэмакратыі, свабодных выбараў і пераадоленьня карупцыі. Гучыць добра, але экспэрты скептычна ставяцца да дэмакратычнасьці «Азадлыку»: «Паглядзіце, як Керымлі кіруе сваім Народным Фронтам. Калі хто што супраць яго скажа, імгненна вылятае з партыі. Да таго ж вакол яго ўжо сфармаваўся няслабы культ асобы», — кажа палітычны аналітык Зардушт Алі-задэ.

Некалькі тыдняў таму сацыёлягі прадказвалі атрыманьне апазыцыйнымі партыямі на выбарах 13% галасоў. У той час прэзыдэнт Азэрбайджану яшчэ адмаўляўся дапусьціць да назіраньня за выбарамі няўрадавыя арганізацыі, якія амаль на траціну фінансуюцца за кошт міжнароднай дапамогі, не пагаджаўся на пазначэньне пальцаў выбаршчыкаў адмысловым чарнілам дзеля прадухіленьня шматразовага галасаваньня і разганяў мітынгі апазыцыі ў цэнтры Баку.

### Рэвалюцыя зьверху

Відаць, пад ціскам з боку амэрыканскага пасла, які мае вялікі ўплыў на Ільхама Аліева, усе гэтыя патрабаваньні былі прынятыя. Апроч таго, былі звольнены некаторыя найбольш вядомыя сваёй карумпаванасьцю міністры — найбольш заможныя людзі краіны, накшталт міністра аховы здароўя Алі Інсанава. Гэта адбылося напярэдадні абвешчанага вяртаньня ў Баку старшыні Дэмакратычнай партыі Расула Гуліева, які вось ужо 9 гадоў жыве на выгнаньні. Нечаканыя затрыманьні былі абгрунтаваны нібыта плянамі дзяржаўнага перавароту.

Намесьнік галоўнага рэдактара газэты «Эхо» Наір Аліеў кажа, што гэта не было нейкай прэзыдэнцкай хітрасьцю, і сапраўды на наступны дзень пасьля вяртаньня Гуліева быў запланаваны дзяржаўны пераварот. «Рэвалюцыяй зьверху» назвалі некаторыя газэты актыўныя захады Аліева па ўмацаваньні сваіх шэрагаў, якія, аднак, могуць быць небясьпечныя для ўлады самога прэзыдэнта.

«Да галоваў, што пакаціліся, былі прымацаваныя вялікія арганізмы, якія валодаюць вялікімі грашыма і ўплывам. Гэтыя звальненьні ня ўпісваюцца ў схему звычайных міжкланавых разборак. Бо калі Інсанаў належаў да групы «карабахцаў», дык звольнены разам зь ім міністар эканамічнага разьвіцьця Фаргад Аліеў паходзіць з поўдня краіны. Гэтыя арышты прывялі азэрбайджанскі палітыкум у даволі хісткае становішча».

Пакуль што манэўр прэзыдэнта Аліева меў посьпех. «Прэзыдэнт выбіў глебу з-пад ног апазыцыі, — кажа адзін з экспэртаў лёнданскай арганізацыі «Лінкс», што займаецца каўкаскімі канфліктамі. — Рэвалюцыі ня будзе».

### Суцэльная карумпаванасьць

Выходжу з «Джаз-цэнтру» ў цёплую сталічную ноч. Шум машынаў хутка глушыць музыку піяніста. Баку — «малох», «магутны станок па вытворчасьці грошай», «залатая шахта», кажуць бізнэсоўцы. Нафта напаўняе дзяржаўную казну мільярдамі даляраў, асабліва пасьля пабудовы трубаправоду Баку—Тбілісі—Джэйхан. Паўсюль як грыбы пасьля дажджу растуць новыя шматпавярховікі — імклівa, неўтаймоўна, без усялякага пляну паміж змрочнымі панэльнымі дамамі эпохі Брэжнева-Аліева і абадранымі камяніцамі XIX ст., часоў першага нафтавага буму — «залатым векам Баку».

Велізарных маштабаў дасягае разрыў паміж багатымі і беднымі. Па некаторых зьвестках, 80% насельніцтва ня мае працы. На ніжніх прыступках сацыяльнай лесьвіцы людзі зарабляюць па 50—100 даляраў у месяц, на версе гэтай герархіі мяжы даходам няма. Аднак кожны з прыкладна трох мільёнаў бакінцаў нечым ды займаецца — гандлюе агароднінай ці працуе таксістам.

Сацыяльны статус вызначаецца грашыма, сямейнай і кланавай прыналежнасьцю, зьмяніць яго амаль немагчыма. Прынамсі, не праз адукацыю і асабістыя дасягненьні. Паводле рэйтынгу «Transparency International», краіна належыць да дзесяці найбольш карумпаваных дзяржаў сьвету. Заробкі дзяржслужачых сёлета вырасьлі ў мэтах барацьбы з карупцыяй, але захаваліся жудасныя дыспрапорцыі. Калі прафэсар-гуманітарый зарабляе да 150 даляраў у месяц, дык даішнік — усе 500.

### Мы — недарэкі

Алі Акбар — адзін з маладых незалежных інтэлектуалаў, што імкнуцца разбурыць старыя савецкія структуры. Разам з калегамі ён заснаваў Незалежны зьвяз пісьменьнікаў, што мае стаць апанэнтам Саюзу пісьменьнікаў, ачольваваму Анарам і Чынгізам Абдулаевым. «Яны разбурылі азэрбайджанскую літаратуру, але існуюць і дагэтуль, бо гэта канфармісты, якія добра дамовяцца зь любой сыстэмай», — кажа Акбар. Летась ён выдаў кнігу «Я — недарэка». «Мы бачым жахлівыя парушэньні правоў чалавека. Журналістаў, накшталт Эльмара Гусэйнава, забіваюць. Паліцыя займаецца катаваньнямі. Але наш народ заняты адным: ён працягвае любіць самога сябе. Мы занадта самазакаханыя. Трэба пакласьці гэтаму канец і зірнуць у твар рэальнасьці. Менавіта мы нясём адказнасьць за гэтую нікчэмнасьць. Мы ўсе недарэкі».

**Інга Пэц** — нямецкі журналіст. Працаваў як фрылансэр для «Зюддойчэ цайтунг» у Новай Зэляндыі ды Азэрбайджане. Ведае беларускую мову. Арганізатар канцэртаў «N.R.M.» у Бэрліне. Гэты артыкул напісаны спэцыяльна для «НН».



AP

Браты Лех (справа) і Яраслаў Качыньскія ўзышлі на польскі палітычны алімп дзякуючы галасам каталіцкага электарату. На фота зьнізу: у польскім консульстве ў Менску галасуюць манашкі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# І Качыньскія зь Беларусі

Бацькі Качыньскіх пазнаёміліся ў Баранавічах, але ажаніліся ўжо ў Польшчы.

Згодна з аповедамі прэзыдэнта Польшчы Леха Качыньскага, ён мае беларускія карані па кудзелі. Па мячы ягоны дзед — Аляксандар Качыньскі — быў чыноўнікам, прысланым з этнічнай Польшчы ў Заходнюю Беларусь.

Маці братоў Качыньскіх Ядвіга паходзіць з роду Ясевічаў (герб Равіч), які, паводле яе слоў, належаў да «спалянізаванай літоўскай шляхты». Прадзед прэзыдэнтавай маці Вінцэнт за ўдзел у паўстаньні 1863 г. быў высланы ў Сібір. Яго жонка Канстанцыя сама выхавала дваіх дзяцей — Зоф'ю і Станіслава. Сын Станіслава Вінцэнт (дзед Качыньскіх па матчынай лініі) быў намесьнікам камандзіра брыгады Войска польскага ў Баранавічах.

У 1927 г. у Баранавічы са станцыі з-пад прускай мяжы перавялі высокага чыгуначнага чыноўніка Аляксандра Качыньскага. У Баранавічах Качыньскім жылося нядрэнна — яны мелі два дамы, вялікі сад і 12 га лесу. У заходнебеларускім горадзе Аляксандар і пазнаёміўся зь сям'ёй Ясевічаў, але ў 1939 г. яго накіравалі ў Берасьце, і знаёмства перарвалася. Аляксандар Качыньскі набыў у Берасьці вялікую камяніцу для сям'і, але скарыстацца набыткам не ўдалося — пачалася вайна.

Сяброўства сем'яў аднавілася пасьля вайны. І ўжо ў 1948 г. у Варшаве ажаніліся Аляксандраў сын, удзельнік Варшаўскага паўстаньня, інжынэр Раймунд Качыньскі і філёляг Ядвіга Ясевіч. 18 чэрвеня 1949 г. у іх нарадзіліся сыны-блізьняты Яраслаў і Лех. Але іх бацькі згадвалі пра Беларусь толькі ва ўспамінах.

**Руслан Равяка, паводле матэрыялаў польскай прэсы**

### Новы шэф польскай дыпляматыі

Міністрам замежных спраў ва ўрадзе Казімежа Марцінкевіча стаў гісторык, прафэсар гуманістычных навук Стэфан Мэлер.

Мэлер, удавец, бацька траіх дзяцей, нарадзіўся ў 1942 г. Скончыў Варшаўскі ўнівэрсытэт, працаваў у Інстытуце міжнародных спраў, філіі Варшаўскага ўнівэрсытэту ў Беластоку, выконваў функцыі навуковага дырэктара ў Вышэйшай школе грамадзкіх навук у Парыжы, цягам некалькіх гадоў быў галоўным рэдактарам гістарычнага месячніку «Mowia wieki». Апошняе «месца працы» — пасол Польшчы ў Маскве. Менавіта ад пазыцыі міністра замежных спраў Польшчы будзе залежаць беларуская палітыка. Для ведама беларускіх уладаў: любімы прадмет зацікаўленьня новага міністра — Вялікая француская рэвалюцыя.

## СЬЦІСЛА

### Дзяды ў Антвэрпэне

30 кастрычніка беларуская грамада ў Антвэрпэне (Бэльгія) адзначыла Дзяды. Вернікі разам са сьвятаром наведалі могілкі ў Лёвэне, дзе на магіле кампазытара Міколы Равенскага была адпраўлена паніхіда за душы ўсіх «прашчураў-дзядоў Беларускага народу», паведамляе Беларуска-эўрапейскае задзіночаньне. У беларусаў Бэльгіі стала добрай традыцыяй у памятныя дні зьбірацца на месцы пахаваньня аўтара музыкі «Магутнага Божа».

### Пуцін ня пойдзе на трэці тэрмін

Падчас візыту ў Нідэрлянды Ўладзімер Пуцін яшчэ раз заявіў пра тое, што не зьбіраецца балятавацца на трэці прэзыдэнцкі тэрмін. «Калі кожны новы кіраўнік дзяржавы будзе мяняць канстытуцыю пад самога сябе, то ад гэтай дзяржавы хутка нічога не застанецца», — сказаў прэзыдэнт Расеі. Таксама У.Пуцін зазначыў, што «быў бы шчасьлівы» атрымаць ад Эўразьвязу запрашэньне ўступіць у гэту арганізацыю, паколькі лічыць Расею краінай з эўрапейскім насельніцтвам.

**МБ**

### Японская праграма дапамогі бедным

Цягам пяці гадоў аб'ём дапамогі бедным краінам, якая ў 2003—2004 г. склала 89 млрд даляраў, будзе павялічаны на 10 млрд даляраў. Японія — адна з вядучых краінаў-донараў, на якую прыпадае 20% сусьветных аб'ёмаў фінансавае падтрымкі трэцяга сьвету. 60% усей дапамогі ідзе ў краіны Азіі. Асноўныя мэты праграмы — барацьба з галечай і спрыяньне ўстойліваму развіцьцю.

**Падрыхтаваў Павал Лычкоўскі**

# Дэпард'ё сыходзіць

Вялікі францускі актор завяршае кар'еру. Як жа хутка чалавек старэе... Як шмат ён пасьпявае зрабіць!



WWW.KINOMANIA.RU

У мінулую нядзелю, на здымках карціны «Мішу д'Абэр», зорка францускага кіно Жэрар Дэпард'ё абвясьціў, што завяршае акторскую кар'еру. «Я зьняўся ў 170 карцінах, — сказаў 56-гадовы актор, — мне няма чаго больш даказваць. Я не зьбіраюся чапляцца, як дурань».

Дэпард'ё нарадзіўся ў 1948 г. у Шатару (Цэнтральная Францыя) у шматдзетнай сям'і. Ягонымі ўнівэрсытэтамі была вуліца: Жэрар займаўся рабаўніцтвам, выпіваў, раз нават трапіў на бальнічны ложак. Але аднойчы разам зь сябрам сабраўся і паехаў у Парыж, каб стаць акторам. У аматарскай трупе «Кафэ дэ ля Гар» Дэпард'ё быў і выканаўцам, і рэжысэрам, і аўтарам спэктакляў. Маленькі тэатар стаў вядомы ўсяму Парыжу.

У 1974 г. Бэртран Бліе запрасіў Дэпард'ё на карціну «Вальс». Фільм стаўся самай скандальнай кінападзеяй году.

Неўзабаве моцны, упэўнены ў сабе Дэпард'ё склаў камічны дуэт з П'ерам Рышарам.

Яму асабліва добра атрымліваліся ролі людзей з народу. Так у эпасе Б.Бэрталючы «XX стагодзьдзе» ён сыграў селяніна-бунтаўшчыка, у карціне «Жэрміналь» — гарняка. Вялізнае аблічча цельпукаватага актора кантраставала з «духоўнымі» ролямі і дадавала ім нечаканай глыбіні: у карціне Марыса П'яла «Пад сонцам Сатаны» Дэпард'ё стаўся сьвятаром, а сыграны акторам Сырано дэ Бэржэрак прызнаны недасягальным узорам.

Гальскі тэмпэрамэнт актора захоўваўся і ў міжнародных пастаноўках, як роля Калюмба ў фільме «1492: пакарэньне раю». Нават у ролі прывіда — былі і такія! — Дэпард'ё напіваецца, скандаліць, б'ецца — і дэманструе грунтоўны псыхалягізм («Простая фармальнасьць»).

Скандалы суправаджаюць Дэпард'ё і ў жыцьці: так, кавалер ордэну Ганаровага легіёну ў тэлеперадачы назваў аднаго з крытыкаў «ідыётам, крэтынам і паўдуркам». Але за грубасьцю хаваецца незвычайная духоўная сіла і нават безабароннасьць.

Нягледзячы на заявы аб сыходзе, знаёмыя актору не паверылі. «Я чую такія заявы дзесяць гадоў і ня веру ім ані», — заявіў асабісты агент Дэпард'ё. Зрэшты, нават калі актор завяжа з кіно, ён мае чым заняцца — Дэпард'ё займаецца вінаградарствам.

**Андрэй Расінскі**

# Сын ардэнаносца



**Бацька Аляксандра Мілінкевіча**

Ўладзімер Іванавіч Баран (1908—1991) нарадзіўся ў в.Пілюкі (сёньня — Гарадзенскі раён), скончыў Гарадзенскую настаўніцкую гімназію (1931), гуманістычны факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэту (1935). Працаваў настаўнікам і выхавацелем у дзіцячым доме «Наш дом», дзе працаваў славуты пэдагог Януш Корчак, настаўнікам геаграфіі ў Гарадзенскай гімназіі імя А.Міцкевіча, у СШ №1 Горадні, у тым ліку дырэктарам (1950—1972). Заслужаны настаўнік Беларусі, узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак пашаны», мэдалямі. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам гарадзкога савету дэпутатаў.



**Уладзімер Іванавіч і Марыя Аляксандраўна у час работы ў інтэрнаце для сіротаў, пачатак 1930-х.**

**Працяг са старонкі 3.**

на павышаных тонах, быў надзвычай ураўнаважаны. Бацька мог навязаць кантакт з кожным суразмоўнікам. Умеў згладжваць вуглы, а дзе трэба, ішоў на разумны кампраміс. Але не паступаўся прынцыпамі.

**— Няўжо не даводзілася бачыць Уладзімера Іванавіча ўсхваляваным?**

— Ён быў вельмі ўзрушаны, калі я паведаміў яму пра паступленьне ў асьпірантуру Акадэміі навук. Цешыўся, што сын пасьля заканчэньня пэдынстытуту здолеў паказаць лепшыя веды па фізыцы, чым выпускнікі сталічных унівэрсытэтаў.

Другі раз быў моцна ўсхваляваны, калі яго пазбавілі пасады дырэктара школы. Якраз у Горадні зьявіўся новы першы сакратар абкаму КПБ, і ягоную жонку прызначылі кіраўніком СШ №1. Мець «раскручаную» школу, вядомую сваімі здабыткамі на ўсім Саюзе, куды лепш, чым пачынаць са звычайнай і даводзіць яе да ладу. На гэта патрэбны гады працы. А Ўладзімер Іванавіч ужо быў на пэнсіі. Тут справа ня толькі ў крыўдзе на органы адукацыі. Перад выхадам на пэнсію бацька запытаўся ў аддзеле народнай адукацыі гарвыканкаму: «Можа, мне пакінуць работу?» У адзін голас перакаралі, што рабіць гэтага ня трэба: маўляў, будзеце працаваць столькі, колькі сілы.

І тут такая неспадзяванка. Мне прызнаўся, што хацеў сам годна сысьці са школы, па сваім жаданьні, а не па волі кагосьці. Дачакаўся загаду вызваліць кабінэт на працягу трох дзён. Як адчапнога, прапанавалі працаваць у роднай школе настаўнікам. Любоў да прафэсіі была вышэй за асабістыя крыўды, і Ўладзімер Іванавіч, як дысцыплінаваны пэдагог корчакаўскай закваскі, працягваў работу простым настаўнікам.

**— Наколькі ваш бацька цікавіўся вучобай сыноў?**

— Ніколі не казаў, што трэба садзіцца за ўрокі. Гэта было само сабой ясна. Не скажу, што вучоба давалася лёгка. Іншы прачытае тэкст, паглядзіць на формулу — і запомніць. Мне ж даводзілася ўнікаць у сутнасьць той жа тэарэмы, завучваць верш. Дарэчы, у нашай клясе вучыліся 42 чалавекі. Зь іх 21 закончылі школу з мэдалём, як я. 41 адразу паступілі ў ВНУ. Той адзіны, які ня стаў студэнтам, ажыцьцявіў свой намер праз год. Традыцыйна сустракаемся клясай. Нядаўна зьбіраліся на 40-годзьдзе заканчэньня школы. Восемдзесят працэнтаў нас сабралася. Так што трымаемся адзін аднаго.

## Пэдагогі Корчакавай закваскі

**— У нашай размове не прагучала імя вашай мамы…**

— Яе звалі Марыя Аляксандраўна. Маладзейшая за бацьку на год. За польскім часам скончыла курсы дамаводзтва. На той час гэта была вельмі прэстыжная навука. Я, напрыклад, усе школьныя гады прахадзіў у штанах і сарочках, пашытых маці. Яны выдатна вязала. А калі б вы паспыталі яе кулінарных вырабаў, то на іх смак не забыліся б ніколі! У нас дома не пераводзіліся дамашнія піражкі з рознай начынкай, пячэньне, варэньне. Яе сяброўкі па даваенным часе, якія таксама закончылі курсы дамаводзтва, часьцяком прыходзілі да нас са сваімі кулінарнымі вырабамі, і тады мы, дзеці, былі найпершымі дэгустатарамі.

З бацькам яна ўзяла шлюб перад вайной. Разам працавалі ў Варшаве ў прытулку для дзяцей-сірот «Наш дом», якім кіравала Марыя Фальская і дзе працаваў пэдагог і доктар Януш Корчак. Выхаваньне вялося паводле яго распрацовак. Маці наладзіла там дамашнюю ўтульнасьць. Вучыла падлеткаў дамаводзтву, карміла іх.

> У нашай клясе вучыліся 42 чалавекі. Зь іх 21 закончылі школу з мэдалём.

Жыцьцё бацькі і маці можна назваць ідэальным. Хаця, канечне, здараліся і спрэчкі. Аднак мы, дзеці, ніколі ня чулі папрокаў Уладзімера Іванавіча і Марыі Аляксандраўны на адрас адно аднаго. Свае праблемы яны вырашалі самі. Маці памерла ў 1974 г. Мела няпоўных 66. Вельмі хацела ўбачыць свайго ўнука, майго першага сына. Ён нарадзіўся якраз на саракавіны па ёй.

## Уратавала Вольская

**— З нашай размовы вымалёўваецца бесканфліктны вобраз Уладзімера Іванавіча. Нібы ў яго ўсё было лёгка на шляху. Няўжо так?**

— І так, і не. Сям'я бацькі была ў эвакуацыі падчас Першай сусьветнай. Апынуліся ажно ў Сібіры. Там Уладзімер Іванавіч закончыў тры клясы школы. Вярнуліся дахаты — усё спалена. Ні капейкі грошай. Бацька рабіў пастушком. Але была вялікая цяга да навукі. Сам настаўнік прыходзіў да майго дзеда і прасіў вучыць хлопчыка далей, бо «мае талент і ахвоту да ведаў». Апошняе аддавалі, каб сын атрымаў адукацыю. Сям'я была вялікай — дзясяцера дзяцей. Старэйшыя хлопцы, мае дзядзькі Пётар, Аляксандар, Іван, нарыхтоўвалі сена, дровы, везьлі ў Горадню, каб прадаць, і гэтыя грошы ішлі на Валодзеву вучобу.

Неспакойны быў 1939 г. Калі немцы захапілі Польшчу, Уладзімер Іванавіч зь сябрам накіраваліся з Варшавы на ўсход, на радзіму. Немцы прапусьцілі, а чырвонаармейцы — не. У бацькі былі дакумэнты, якія пацьвердзілі яго сапраўдные месца жыхарства. Сябар у сьпешцы забыў ці згубіў паперы і за гэта быў расстраляны. Але дома чакала новая бяда. Савецкая ўлада прызнала сям'ю дзеда кулацкай. Дзеда схапілі міліцыянты і павалаклі ў сельсавет. Разам зь ім апынуўся і мой бацька з адным з братоў. Размова была кароткая: паставілі да сьценкі. На шчасьце, побач аказаўся знаёмы чалавек, не апошні чыноўнік у сельсавеце. Абмежаваліся канфіскацыяй маёмасьці.

З пачаткам вайны бацька перабраўся ў Горадню, не было іншага заробку. У горадзе працаваў рабочым па найме. Была так званая біржа працы, куды ранкам зьбіраліся людзі зь сякерамі і піламі. Так зарабляў сродкі, каб утрымаць жонку і майго старэйшага брата Валодзю.

У 1947-м у розныя інстанцыі паступалі ананімкі, дзе Ўладзімера Іванавіча выкрывалі як ворага народу, прыхаванага антысаветчыка. Умяшалася сакратар гаркаму партыі Ганна Вольская. Яе сын Аркадзь (у будучыні — відны савецкі і расейскі дзяржаўны дзеяч. — **Рэд.**) быў вучнем Уладзімера Іванавіча, таму яна была знаёмая з настаўнікам, які заходзіў на кватэру, каб пацікавіцца ўмовамі жыцьця школьніка.

Вось яна аднойчы запрасіла бацьку на гутарку і наўпрост сказала: «Мяне турбуе ваша будучыня, Уладзімер Іванавіч. Паклёпам на вас дадзена хада. Справа набірае нядобрыя абароты. Паратункам можа стаць уступленьне ў партыю. Прычым неадкладна». «Хто ж мне дасьць рэкамэндацыю пасьля гэтых папераў?» — горка ўсьміхнуўся бацька. «Я», — спакойна адказала спн.Вольская. Яна выратавала бацьку ад арышту. Растлумачыць яе ўчынак можна толькі чалавечнасьцю і годнасьцю гэтай асобы. Неўзабаве яе перавялі на работу ў Ліду, затым у Менск, Маскву.

**— Ёсьць зьвесткі, што Ўладзімер Іванавіч мог стаць Героем Сацыялістычнай Працы…**

— Яго прадстаўлялі да Героя. Былі падрыхтаваны неабходныя дакумэнты. Аднак знайшліся людзі, якія здолелі пераканаць «каго трэба і дзе трэба», што Ўладзімер Іванавіч — заходнік, адукацыю атрымаў «ня там і ня тую» і ўвогуле падазроны чалавек, адным словам — ня наш.

Вось і рабіце выснову, ці быў мой бацька шчасьлівым і яму шанцавала ў жыцьці як нікому іншаму, ці ён жыў па сумленьні і на яго жыцьцёвым шляху сустракаліся дастойныя людзі. Апошніх проста на сьвеце больш.

**Гутарыў Антон Лабовіч, Горадня**

# Ад Менску на Паўднёвы Захад

Глядзець Беларусь трэба ўвосень, пасьля дажынак, у самай раскошы, калі ў паветры можна амаль намацаць радасьць спрацаваных гаспадароў. Рэпартаж **Сяргея Харэўскага** з Слоніму.

Беларусь — краіна восені. У кастрычніку наш край выглядае найбольш адпаведным сваёй натуры ды, бадай, наканаваньню… Восень выгодна выстаўляе ў найлепшым сьвятле тое, што маем, — дубы на курганах, каплічкі на даляглядах, хаты ў залатых шатах садоў. Вецер вымятае пыл і ўсьцілае ўсё гаючым лісьцем. Глядзець Беларусь у самай раскошы трэба ўвосень, пасьля дажынак, калі ў паветры можна амаль намацаць радасьць гаспадароў, якія могуць даць сабе разьняволіцца.

Пагодныя дні надаліся, каб зьдзейсьніць даўно заплянаваныя выправы ў краі, дзе некалі бываў. Найперш скіраваўся на Паўднёвы Захад, у Слонім. Абярнуцца за дзень у горад грамадзкім транспартам немагчыма. Аўтобусаў мала, цягнікоў яшчэ менш. Затое слонімскі вакзал — выдатны помнік дойлідства міжваеннага часу. Сёньня ён — харашун. Адрэстаўраваны старасьвецкі будынак выгадна глядзіцца што з боку чысьцюткае плошчы, што з вокнаў цягніка. Гэтак усё ахайна й прычасана…

Кідаецца ў вочы і адметнасьць пасажырскага кантынгенту, добрую частку якога складаюць пілігрымы. Яны рушаць у Жыровічы, да цудоўнага абраза Маці Божае, што тры стагодзьдзі апякуецца насельнікамі беларускага краю бяз розьніцы ў веравызнаньні… Паломнікі, між іншым, рэзка вылучаюцца з натоўпу слонімцаў — цемнавокіх, смуглявых, каржкаватых, коратка пастрыжаных і ахайна паголеных.

## Ерусалім над Шчарай

Слонімцы ганарацца тузінам сьвятыняў розных канфэсій — касьцёлы, малельныя дамы, праваслаўныя цэрквы, мячэт, мінарэт якога ўзвышаецца над Шчарай.



**Касьцёл бэрнардынак.**

У Слоніме нарадзіўся рэлігійны дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстаньня Хведар Данілюк. У 1942 г. ён браў удзел у Царкоўным саборы ў Менску, дзе была наноў абвешчана аўтакефалія. З канца 1940-х сьвятараваў у Нью-Ёрку. Са Слоніму паходзіць славуты пратэстанцкі дзеяч Лукаш Дзекуць-Малей, аўтар малітоўніка ў беларускай мове. У горад пры канцы 1930-х быў высланы польскімі ўладамі кс.Адам Станкевіч, тут жылі аўтары «Нашае Нівы» Кандрат Лейка й Гальяш Леўчык.

Дарэчы, горача прывітаўшы савецкую ўладу ў мясцовым клюбе, Лейка зьехаў у акупаваную немцамі Варшаву. Пазнаёміўшыся бліжэй са слонімцамі, я не дзіўлюся гэтаму экстравагантнаму ўчынку. Слонімцы — народ кемлівы й практычны. Тон задаюць тутэйшыя мусульмане, што і ў шарую гадзіну нястомна корпаюцца ў гародчыках па ўскрайках. Пагатоў гэта дзівіць у кастрычніку, калі ўжо й апошні яблык упаў.

## Сынагога ў стылі ракако

Пасярод старажытнага цэнтру разбудоўваецца наноў Праабражэнскі сабор, што да 1846 г. быў касьцёлам Канонікаў Лятэранскіх. У сярэдзіне XIX ст. яго зьнявечылі ў псэўдарускім стылі архітэктар Чагін, а праз стагодзьдзе сьвятыню зруйнавалі саветы.

Цяпер усё вяртаецца на свае месцы. Сучасныя дойліды выправілі памылкі Чагіна, і сымбіёз рэнэсансава-барочных формаў з праваслаўнымі канонамі выйшаў вельмі арганічны. Мясцовыя каталікі маюць сваіх пакутнікаў — блаславёных сёстраў-непакаланак Марту Валоўскую й Еву Наішэўскую, што былі арыштаваныя 18 сьнежня 1942 г. разам з Адамам Штаркам і ўначы расстраляныя сярод сотняў іншых вязьняў на Петралевіцкай гары.

Манашкі й ксёндз загінулі за тое, што ва ўмовах ваеннага шаленства давалі прыклад хрысьціянскае міласэрнасьці.

Тутсама спачываюць парэшткі тысячаў габрэяў са Слоніму й ваколіц. Памяць пра іх няма каму перахоўваць — слонімская жыдоўская грамада існуе сёньня толькі ў Ізраілі. У самім горадзе пра іх найбагацейшую спадчыну нагадвае толькі мэмарыяльны знак на недаруйнаваных колішніх могілках і часткова захаваная сынагога 1642 г., некалі самая вялікая ў Беларусі. Нават у такім жахлівым стане ейны гмах пануе над старасьвецкімі кварталамі. Рызыкуючы жыцьцём (у літаральным сэнсе), можна знайсьці дзірку ў будаўнічым плоце ды праз кучы хлуду паспрабаваць трапіць усярэдзіну. Калі ўсё абыдзецца, не пашкадуеце. Убраньне слонімскае сынагогі ў стылі ракако — выдатны ўзор старасьвецкага мастацтва! Каб ня дзіркі ў сьценах і выбітыя зь невядомых прычын вокны, то можна было б забыць аб усім на сьвеце. З-пад скляпеньняў вуркочуць галубы. Відовішча і захапляльнае, і вусьцішнае ў адначасьсе.

У той жа час пад недабураным помнікам шуміць базар, дзе можна набыць шчодрых восеньскіх дароў, усялякае плястыкавае лухты й недзяржаўнае прэсы.

## Вуліца Патрыса Лумумбы

І ўсё ж жыцьцё ў Слоніме, самавітае й экзатычнае, як для чалавека са сталіцы, разрастаецца й квітнее сотнямі красак. Ну ў якім яшчэ беларускім горадзе можна прайсьціся па вуліцах Опэрнай ды Студэнцкай, хоць ані опэры, ані ўнівэрсытэту тут цяпер няма (але ж будзе, будзе!). Затое тут свой тэатар, што разгарнуў дзейнасьць за часамі незалежнасьці. Па-расейску. Што да назваў вуліц, то апроч звыклага савецкага набору зь Першамайскіх, Леніна, Камсамольскіх тут дадаецца трыяда Пушкіна—Міцкевіча—Купалы ды вуліца Патрыса Лумумбы, пра якога забыліся ў роднай Афрыцы. Але толькі ня ў Слоніме!

Слонімская суполка мусульманаў — якіх тут дзьве сотні — найстарэйшая ў Беларусі. Праўда, уласна беларускіх татараў зь іх цяпер толькі трацiна. Але не былі б яны слонімцамі, каб не захоўвалі аўтаномнасьць сваёй суполкі нават у межах мусульманскае грамады Беларусі.

А на касьцельных лавах раскладзены малітоўнікі кірыліцай па-польску. Цяпер у Слоніме аднаўлены кляштар — першы кантэмпляцыйны кляштар у Беларусі, дзе сёстры-бэрнардынкі, жывучы з ахвяраваньняў, служаць Богу й людзям. Іх прысутнасьць у горадзе навідавоку. Запрашэньне ў іх сталоўку для беспрацоўных зроблена па-беларуску.



**Адноўлены Праабражэнскі сабор, што да 1846 г. быў касьцёлам Канонікаў Лятэранскіх.**

## Там, дзе спыніўся час

А яшчэ ў горадзе ёсьць помнік… помніку дойлідства. Гэта мэмарыяльны знак у памяць пра касьцёл Арханёла Міхала кляштару дамініканцаў, разбураны яшчэ за царскім часам акупацыйнымі ўладамі. Хоць гэты помнік пастаўлены не на тым месцы — не бяда. Мэта дасягнута — вярэдзіць памяць. Дарма што побач, у самым цэнтры, сёньня руйнуюць на вачах яшчэ жывыя помнікі старасьвеччыны й выдзіраюць з-пад ног таўшчэзныя сутарэньні й падмуркі без усялякіх археолягаў ці ахоўнікаў спадчыны. Але тое ж і ў сталіцы робіцца.



**Царква Сьвятой Тройцы.**

А наагул у Слоніме ацалела багата помнікаў. Насуперак усім чыноўніцкім захадам. Гэткай колькасьці шыкоўных храмавых інтэр'ераў, што ацалелі з дарасейскіх часоў, няма нават у Навагардку ці сівым Полацку. У Слоніме яшчэ можна ўбачыць цэлыя вуліцы й дамы на іх, што зусім не зьмяніліся за апошнія сто гадоў. Больш за тое, у тых дамах яшчэ зьбераглiся дзьверы, вокны й часам нават шыбы (!), што перажылі ўсё мінулае стагодзьдзе. З-пад тынку часам можна прачытаць надпісы па-польску ці на ідыш зь бясконца далёкіх эпох. А ўжо ж старасьвецкіх каванак, кратаў ці балконаў і не зьлічыць. Ацалела тут нешта большае, чым проста дамы ці сьвятыні. Ацалела тутэйшая самавітасьць, распарадак жыцьця й спрадвечныя вартасьці. Тут цалкам натуральна гучыць мова, зваротам на якой нікога не зьбянтэжыш. Тут цяжка працуюць, пякуць смачны хлеб і шчыра моляцца. А ў вольную хвіліну ідуць на бераг Шчары, каб пасядзець на лавах, паглядзець на людзей і на поўную вады раку, што зносіць за далягляд пярэсты карагод восеньскага лісьця.

**Здымкі Веранікі Дзядок**



**Старажытная сінагога стаіць у занядбаньні.**



**Новаму мячэту 14 гадоў.**



**Сьпіць слонімскі леў.**

# Андрэй Суздальцаў адказвае Алесю Кудрыцкаму

**Мая дзейнасьць як палітоляга і заключаецца ва ўвязваньні двух геапалітычных вэктараў, піша палітоляг Андрэй Суздальцаў.**

Зь вялікай павагай ставячыся да Вашага выданьня як да неабходнага і да таго ж надзвычай яскравага кампанэнту беларускіх *пакуль* апазыцыйных СМІ, я ўсё-такі асьмелюся выказаць недаўменьне з нагоды ў цэлым добрага артыкулу вашага аўтара Алеся Кудрыцкага («Чаму беларусы не прарасейцы», №40).

Камэнтуючы мае погляды, аўтар, у прыватнасьці, адзначае, што «А.Суздальцаў закідае апазыцыі няздатнасьць стварыць прарасейскі праект, які склаў бы альтэрнатыву прарасейскаму праекту А.Лукашэнкі. «Прарасейскі праект», на ягоную думку, мусіць прадугледжваць поўную адмову ад кантактаў з Захадам — як у Лукашэнкі».

Спадар Кудрыцкі, відаць, трохі памылкова зразумеў мае погляды, якія ў асноўным і выкладзены ў трылёгіі «Менск—Масква» (www.nmnby.org). У прыватнасьці, закранаючы ўдзел аб'яднанай апазыцыі ў передвыбарнай кампаніі — 2006 у фармаце «заходняга праекту» (я ня толькі не адмаўляюся, але і пацьвярджаю аўтарства гэтага тэрміну), я пісаў, што «*заходні», між іншым, не азначае, што* дрэнны. *Не, гэты праект сапраўды накіраваны на дэмакратызацыю беларускага грамадзтва, якая рэальна насьпела. Бяда ў тым, што «ўсходняга» праекту, які б апаніраваў А.Лукашэнку, проста няма. Ён толькі павольна высьпявае ў галовах маскоўскай экспэртнай супольнасьці, і ніхто не гарантуе, што высьпее*».

Якраз уся мая дзейнасьць як палітоляга і заключаецца ва «ўвязваньні», «сшываньні» двух геапалітычных вэктараў, якія пануюць, апрача трэнду А.Лукашэнкі, на беларускім палітычным полі — заходнім і ўсходнім. Паводле майго глыбокага перакананьня, пры дасягненьні нейкага кансэнсусу паміж Вашынгтонам, Брусэлем і Масквой дэмакратызацыі Беларусі быў бы дадзены такі магутны штуршок, зь якім кіроўны рэжым быў бы вымушаны лічыцца.

Адсюль і ўсе мае прэтэнзіі, перш за ўсё да беларускай апазыцыі, бо менавіта яна, выказваючы перадавыя і дэмакратычныя інтарэсы беларускага народу, па ідэі ў першую чаргу павінна праяўляць ініцыятыву ня толькі на заходнім напрамку, але і на ўсходнім, як бы цяжка ні было весьці дыялёг з Масквой.

У Расеі далёка ня ўсе бачаць рэальную сытуацыю ў Беларусі, многія жывуць мітамі і забабонамі, як, дарэчы, і шмат хто на Захадзе, але ж зьмяненьне палітычнай абстаноўкі ў краіне — гэта перш за ўсё наша работа, а ня Пуціна ці Буша! Ім мы цікавыя пакольки, пастолькі. Вось таму я яшчэ раз паўтараю свае словы з маёй трылёгіі «Менск—Масква»:

«*Апазыцыя … наўмысна праігнаравала сыстэмную работу з Усходам, не стварыла для абмеркаваньня рэальную стратэгію работы з Масквой. Апазыцыя ніколі не культывавала ў сваім асяродзьдзі прарасейскага флянгу, маўкліва пагаджаючыся з манапалізацыяй расейска-беларускіх адносін у руках А.Лукашэнкі. …Існуючыя ў партыйных праграмах «расейскія блёкі» фантазійныя і фанабэрыстыя. …Частка беларускай апазыцыі — у негалосным саюзе зь беларускімі ўладамі — занялася распальваньнем варожасьці паміж Масквой і Вашынгтонам, Варшавай, Брусэлем. …У выніку палітычная трансфармацыя рэжыму аказалася замарожана*».

Можа, сказана празьмерна жорстка, але абстаноўка патрабуе. Наш посьпех у аб'яднанай падтрымцы дэмакратыі з Усходу і Захаду.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

**Суседзей Беларусі палохае агрэсіўная антыэўрапейская рыторыка А.Лукашэнкі. Прэзыдэнт Літвы Вальдас Адамкус заявіў падчас візыту ў Нямеччыну: «Калі ты прачынаесься раніцай у Вільні, ты ніколі ня ведаеш, што адбылося ў суседнім Менску...»**

# Падарунак для мазахіста

**Цэлы тыдзень мяне даставалі сябры і знаёмцы адным і тым жа пытаньнем: «Ці чытаў ты ў «Нашай Ніве» пра Пацюпу?» («НН», №38).**

Прыходзілася тлумачыць, што не заўсёды знаходзіцца час на такую сьвятую і амаль рытуальную справу, як прачытаньне (праглынаньне) адзінай цалкам беларускамоўнай газэты. Праўда, чытаць артыкул не хацелася зь іншай прычыны: таварыш Аляксандар Фядута (канечне, ён спадар, як і ўсе журналісты «НН») у ролі беларускага літаратуразнаўца не выклікаў пачуцьця цікавасьці. Нічога новага, акрамя параўнаньня Юрася са збачэнцам, аўтар артыкулу не прыдумаў. Ну пахваліў, але ж і безь Фядутавага панібрацкага паляпваньня па плячы Пацюпа ведае сваю цану, як ведае яе кожны пашаноўнік сучаснай беларускай паэзіі.

Затое мяне зьдзівіла іншае: «усяго толькі чытач» пнецца даваць камэнтар рэчам, у якіх зялёнага паняцьця ня мае. І робіць ён гэта з такой самаўпэўненасьцю, што ў першую сэкунду нямееш ад прачытанага: «Як бы ні запэўнівалі філёлягі, што беларуская літаратура прайшла ўсе тыя ж стадыі разьвіцьця, што і іншыя эўрапейскія літаратуры, відавочна — паэзія на беларускай мове пачала паўнаварта разьвівацца толькі пры канцы рамантызму». Сёньня для чалавека, які хоць крыху знаёмы з гісторыяй беларускай літаратуры, такая заява гучыць абсурдна. Гэтаксама гучала б сьцьвярджаньне, напрыклад, такога роду: «Як бы ні запэўнівалі вучоныя, што плянэта круглая, відавочна — Зямля ўяўляе сабой пляскатую паверхню, прычым трымаецца яна на трох сланах і вялізнай чарапасе».

Калі таварыш-спадар Фядута нічога ня ведае ці ня хоча ведаць пра беларускае барока, гэта ня значыць, што яго не было. Яно было і мела сваіх прадстаўнікоў — ня горшых за Джамбатыста Марына або Люіса дэ Гонгара-і-Арготэ. Згадаю таго ж Дамініка Рудніцкага ці Сімяона Полацкага, якія распрацоўвалі чыста барочныя формы, паэзія якіх характарызуецца ўскладненай мэтафарычнасьцю, багатай сымболікай, шырокім выкарыстаньнем мудрагелістых алегорый.

Таму, як бы ні запэўніваў Фядута, што «першая хваля паэтычнага экспэрымэнтатарства» не дакацілася да нас, што ў тыя часы «з натуральна-гістарычных прычын» не было беларускай літаратурнай мовы, відавочна, што гэта ня так. Была беларуская літаратура, была і беларуская літаратурная мова. Калі ж кіравацца Фядутавай лёгікай, можна прыйсьці да высновы, што барока абмінула і іншыя мовы, напрыклад польскую і расейскую — іх сучасны варыянт таксама адрозьніваецца ад варыянту, што меўся стагодзьдзі назад.

Не абмінула нас і «другая хваля — эпохі дэкадансу», як сьцьвярджае прафэсар. Зрэшты, чаму другая? Неяк спрытна перакаціўся Аляксандар Фядута з эпохі барока адразу ў дэкаданс, роўна як той пэрсанаж расейскай народнай казкі, што ад усіх уцёк. Ну ды бог зь імі, нябачнымі для Фядуты хвалямі… «У расейскай літаратуры былі Блок і Севяранін, у францускай — Малярмэ, а ў нас — Гарун і Цётка…» — нібыта скардзіцца наш кампаратывіст. А пры чым тут Цётка, калі гаворка ідзе пра Блока і Севяраніна?

Беларуская паэзія пачалася не з рамантызму. Рудніцкі або Полацкі распрацоўвалі барочныя формы ня горш за Люіса дэ Гонгара-і-Арготэ.

Чаму не прыгадаць М.Багдановіча, В.Ластоўскага ці якога кольвек іншага беларускага аўтара, чые творы поўняцца сымбалісцкай эстэтыкай? Зьдзекліва выглядае таксама іронія Фядуты, калі ён адводзіць месца паэтцы «недзе паміж Іванам Сурыкавым і Іванам Нікіціным». Менавіта ў такім духу любяць іранізаваць супраціўнікі ўсяго беларускага. Прыкладна так некалі іранізаваў і сумнавядомы рэжысэр Азаронак. Калі на тое пайшло, то ў кампанію да згаданых расейскіх паэтаў лепш далучыць ня Цётку, а Стэфана Малярмэ — ён хоць быў аднагодкам Івана Сурыкава. А калі А.Фядута ня можа «падабраць францускіх аналягаў» Цёткі, то гэта не «праз адсутнасьць апошніх», а праз адсутнасьць элемэнтарных ведаў па гісторыі эўрапейскай літаратуры. Няхай тады папросіць будучага ляўрэата Нобэлеўскай прэміі, каб той прачытаў яму патрэбную лекцыю з курсу «Француская літаратура».

І апошняе. Пан дасьледчык убачыў у Юрасю Пацюпу садыста, які «хвошча чытача сваімі радкамі і назірае за рэакцыяй». Дзіўная мэтафара. Аднак калі ўзяць пад увагу, што аўтар рэцэнзіі разьбіраецца ў літаратуры як Ніф-Ніф у цытрынах, то чытаньне вершаў Пацюпы для яго падасца сапраўднай пакутай. Але ж калі Аляксандар Фядута любіць займацца вэрбальным мазахізмам, то і мой водгук на ягоны артыкул, спадзяюся, стане прыемным падарункам. Атрымлівайце асалоду, пане мазахісьце!

**Анатоль Брусэвіч, Горадня**

**Ад Рэдакцыі.** Асобныя ўвагі сп.Брусэвіча вартыя дыскусіі. Зь ягонымі катэгарычнымі вывадамі не згаджаемся. З увагі да беларускай паэзіі, узьнятай артыкуламі А.Фядуты, цешымся.

### Зьвяртаюся да Казуліна

У мяне зварот да спадара Казуліна — чалавека, якога я паважаю за сьмелую пазыцыю, адукаванага. Паважаны лідэр партыі, я за Вас бы галасаваў у якасьці кандыдата ў прэзыдэнта, але ўжо выбраны адзіны кандыдат сп.Мілінкевіч. Можа, я б хацеў, каб гэта быў А.Лябедзька ці С.Шушкевіч, але ім стаў Алесь Мілінкевіч. Трэба падпарадкоўвацца дзеля будучага. Але як я зразумеў, Вы не зьбіраецеся працаваць на Мілінкевіча, тады на каго — на сябе? І 100% прайграць, затое застацца лідэрам партыі. Дзеля чаго? Гэта гаворыць аб Вас не як аб патрыёце. Сягоньня ёсьць сьвятая задача заміняць Лукашэнку! Усе сілы за Мілінкевіча! Як Вы, сп.Казулін, прыстойны, высакародны чалавек, можаце мысьліць па-другому? Трэба дзяліць шкуру *забітага* мядзьведзя.

**Апанас Семяновіч, Бараўляны**

### Кастрычніцкія сустрэчы

У Літаратурным музэі М.Багдановіча прайшлі дзьве літаратурна-музычныя сустрэчы пад назвай «Што рабіць з гэтай восеньню?». На пытаньне паспрабавалі даць адказ паэтка Людміла Паўлікава-Хейдарава і бард Алесь Камоцкі.

Адначасова з гучаньнем вершаў сп.Паўлікавай-Хейдаравай на экране дэманстраваліся слайды з краявідамі Беларусі, зробленыя ейным мужам-фатографам. Гучалі песьні на ейныя вершы ў выкананьні маладой кампазытаркі з Маладэчна Тацяны Беланогай і Алеся Камоцкага.

Алесь Камоцкі на наступны дзень выступаў у дуэце з Алегам Змушко. Выступ пачынаўся песьнямі на вершы Людмілы Паўлікавай-Хейдаравай, потым прагучалі ўласныя творы паэта і барда. На вечарыне таксама была прадстаўлена ягоная кніга «Неспадзяванае».

Так што адказ на пытаньне «Што рабіць з гэтай восеньню?» для кожнага ўдзельніка і слухача быў свой.

**Андрэй Шчарбовіч, супрацоўнік Музэю М.Багдановіча**

СВОЙ СЛОЎНІЧАК

# Як песьню слухаю

Выразы накшталт «пасьвіў коні», «даглядаў сьвіньні» не ўспрымаюцца тут як прыклады з падручніка. «Дзетачка, пастаў торбу долу», — рэдка дзе цяперака пачуеш такое, а ў Асіповіцкім раёне пачуеш.

Жыхароў паўднёвага захаду Магілёўшчыны, асабліва бабруйчан, можна пазнаць па адметнай інтанацыі ў размове, нават калі тыя па-расейску гавораць. «Пойдам, паедам, картопля» — як надарыцца пачуць у транспарце ці па радыё, дык сяджу і як песьню слухаю. Мова паўднёва-заходняй Магілёўшчыны, той яе часткі, што клінам убіваецца між Меншчынай і Гомельшчынай, розьніцца ад мовы магілёўскага ўсходу. Гутарковая мова ў гэтых краях блізкая да літаратурнай, але мае свае асаблівасьці. Яна аднымі рысамі нагадвае слуцкія гаворкі, другімі — усходнепалескія. Чым далей на поўдзень, тым больш прымет палескага дыялекту. Старыя вяскоўцы скажуць не «памёр», а «пам'ёр», ня «ловіць», а «лавае», ня «гэты», а «еты».

Беларуская мова — ёмкая ва ўжытку.Тут гэта адчуваецца яшчэ вастрэй.

На мяжы Бабруйшчыны і Глушчыны замест «Ці добрая ў гэтым годзе ўрадзіла бульба?» прамовяць: «Картопля сёлета дарма?»

Смакавыя якасьці ежы вызначаюцца кароткімі «ідзе» — «не ідзе» або «варт» — «ня варт». Словазлучэньне «хутка езьдзіць» (на машыне), «спрытна хадзіць» (па грыбах), «часта бываць» (у горадзе) замяняюцца ўнівэрсальным «лётаць» (на машыне, па грыбах, у горад). Пра таго, хто спакойна гуляе па вуліцы, кажуць «шпацыруе». Каб запытацца ў таго, хто пабач, ці чысты ў вас твар, не абавязкова фармуляваць шматслоўны сказ, дастаткова зрабіць так, як вясковая пэнсіянэрка на бабруйскім вакзале. Яна ціхенька тыцнула мяне ў бок і, павярнуўшыся тварам, прамовіла добразычліва, гучна, з выразнай пытальнай інтанацыяй: «Ці ўдзелалася?» Я паглядзела на яе ды адказала гэтак жа каротка: «Не, чыстыя».

Ці паразумеліся б у такім выпадку не землякі? Ня ведаю. Слоўнік жыхароў Бабруйшчыны, Глушчыны, Асіповіччыны разнастайны і самабытны. На тэрыторыі аднаго Бабруйскага раёну можна пачуць і «варыўня», і «стопка», а як на мэтар глыбей у зямлю пабудавана, дык ужо і «склеп». Адначасова ўжываюцца словы «чарнабыл» і «палын». Толькі вось азначаюць яны хоць і падобныя між сабой, але дзьве розныя расьліны. Палын ніжэйшы і белаваты. А чарнабыл вышэйшы, цямнейшы. «Здор» і «жыр» — таксама не адно і тое ж. Здор — гэта толькі тое, што наўмысна з заколатага кабана сабрана. А калі сала на патэльню нацякло — гэта ўжо жыр. Апроч вядомых дыялектных слоў — «кабат», «заслон», «мост» — сустракаюцца і такія, якіх ня ўбачыш у слоўніку, у друку. Частка зь іх дасюль шырока распаўсюджана ў гутарковай мове. Частку можна пачуць ужо толькі ад 80—90-гадовых старых. Зьяўляюцца такія словы дыялектнымі ці проста ўстарэлымі, мне меркаваць цяжка. Мае сваякі, ураджэнцы Асіповіцкага раёну, актыўна выкарыстоўваюць у сваёй мове такія словы:

**паўрозік** — матузок;

**ачэртаць** — надакучваць;

**кутніца** — сьляпая кішка (найчасцей выкарыстоўваецца як лаянка);

**цугалік** — маленькі болцік;

**распарэх** — разрэз на адзеньні;

**пастроіць (падстроіць)** — адрамантаваць адзеньне, бялізну;

**пацянуць** — нашыць новую тканіну паверсе старога верхняга адзеньня (абліцоўка);

**устроіцца** — прыгожа, святочна апрануцца;

**брат у другой стрэчы, сястра ў трэцяй стрэчы** — стрыечны брат, траюрадная сястра;

**перавясло** — вязьмо;

**выстрэнчваць** — празьмерна дагаджаць каму-небудзь;

**падносік** — сподачак;

**махлак** — прасьцякаваты, абы-які з выгляду чалавек;

**хлупіцца** (націск на другім складзе) — церазь сілу есьці нясмачную страву;

**бацькаўшчына** — непасрэдна тое месца, дзе была пабудавана бацькоўская хата;

**нотны** — залішне фанабэрысты і крыўдлівы чалавек;

**біля** — бэлька;

**лічыць** (націск на першым складзе) — пасаваць да твару;

**камешнік** — куча абы-як пакіданых рэчаў, пакамечанага адзеньня;

**салапяка** — чалавек, які высалапіў язык (лаянка).

**Тацяна Барысік, Магілёў**

# Беларуская эканоміка на словах і на справе

Працяг са старонкі 5.

Валавы нацыянальны даход на душу насельніцтва ў 2004 годзе, тыс. $




## Ні сабе, ні людзям

Праз адмысловую ўнутраную і вонкавую палітыку Беларусь пазбавіла сябе міжнароднай дапамогі. Аб’ём міжнароднай дапамогі ў нас складае $3 на чалавека ў год. У той час як у 2003 г. армяне атрымалі ў 27 разоў болей дапамогі на душу насельніцтва, а літоўцы — у 36 разоў.

Слаба разьвіты ў Беларусі і ўнутраны фінансавы рынак, інтэнсіўнасьць якога характарызуецца доляй унутранага крэдыту банкаўскага сэктару да ВУП (у 2004-м — 21,2%). Амаль усе суседзі — Літва, Латвія, Польшча і Ўкраіна — маюць больш дынамічныя фінансавыя рынкі, што азначае таньнейшыя крэдыты, больш надзейнае захоўваньне ўкладаў, а таксама магчымасьць зарабляць ня толькі на дэпазытах у нацыянальнай валюце.

## Стагнацыя ў індэксе чалавечага разьвіцьця

Афіцыйныя СМІ любяць таксама хваліцца сацыяльнымі дасягненьнямі Беларусі — нібыта сьледзтвам нашай своеасаблівай эканамічнай палітыкі. Вось за цывілізаваным сьветам не пайшлі і дасягнулі ў выніку больш стабільнага, справядлівага і сацыяльнаарыентаванага грамадзтва. Але дынаміка Індэксу разьвіцьця чалавечага патэнцыялу (ІРЧП) абвяргае гіпотэзу. З падрыхтаванага ў верасьні ў рамках Праграмы разьвіцьця ААН «Дакладу аб разьвіцьці чалавека ў 2005 г.» бачна, што становішча Беларусі ў ІРЧП пагоршылася. Пазалетась мы былі на 53-м месцы, летась ссунуліся на 62-е, сёлета адбыўся яшчэ адзін скачок уніз — на 67-е месца. Калі ў 1990 г. індэкс складаў 0,787, то па выніках 2003 г. — 0,786. У гэты час іншыя краіны, напрыклад суседзі, што абралі эўрапейскі шлях разьвіцьця і ўступілі ў Эўразьвяз, упэўнена ідуць наперад. У 1990—2003 г. Польшча здолела павысіць ІРПЧ з 0,803 да 0,858, Эстонія з 0,814 да 0,853, Літва з 0,823 да 0,852.

## Так званы «фэномэн»

Улетку Міжнародны валютны фонд апублікаваў даклад «Моцны эканамічны рост Беларусі: загадка ці не?», робячы наступную выснову: «Няма ніякай загадкі: спалучэньне ўнутранай эканамічнай палітыкі і спрыяльных вонкавых фактараў дазволіла ў апошнія гады паскорыць рост... Аднак праз адсутнасьць буйнамаштабных структурных рэформаў гэты рост няўстойлівы».

Галоўныя прычыны эканамічнага посьпеху Беларусі палягаюць у мяккай крэдытна-грашовай і падаткова-бюджэтнай палітыцы. У той жа час улады ніякім чынам не аналізуюць доўгатэрміновыя наступствы накачкі дзяржсэктару таннымі крэдытамі і датацыямі. Прадпрыемствам загадваюць павялічваць заробак, не зважаючы на дынаміку вытворчасьці працы.

Беларускі экспарт канкуруе паводле цэнавага фактару, а не паводле якасьці, а дзяржаўныя закупкі вядуць да рэзкага завышэньня выдаткаў спажыўцоў і бюджэту. Усе гэтыя фактары маглі б ужо прывесьці да стагнацыі, калі б не галоўны фактар устойлівасьці: «Добра адукаваная і дысцыплінаваная працоўная сіла зьяўляецца ключавым фактарам эканамічнага росту».

У такіх умовах улады маглі б дапамагчы людзям: стварыць спрыяльны клімат для замежных інвэстыцыяў, спрыяй трансфэрту ведаў, інвэстуй у сучасную адукацыю і інфраструктуру, паздымай абмежаваньні на абмен таварамі і паслугамі ўнутры краіны і з вонкавым сьветам — і творчы патэнцыял людзей будзе разьняволены. Менавіта гэтага не хапае для забесьпячэньня ўстойлівасьці эканамічнага росту.

Праблема каардынацыі эканамічных дзеяньняў у сацыялізьме — вось што робіць рост беларускай эканомікі фундамэнтальна няўстойлівым. Самыя добрыя, лепшыя намеры самых адукаваных чыноўнікаў не заменяць функцыі рынку і ягоных базавых кампанэнтаў: свабоднай цаны, мэханізму «прыбытак — страты» і творчай ролі прадпрымальніка.

**Шэсьць прычынаў, чаму няможна давяраць беларускай статыстыцы.**

1. Палітызацыя статыстычных зьвестак.
2. Падгонка вынікаў пад плян.
3. Спэцыфіка разьліку і ўліку вартасьці складзкіх запасаў.
4. Адсутнасьць надзейнага цэнавага дэфлятара па імпарце. Адміністрацыйнае рэгуляваньне цэнаў.
5. Розьніца ў інтэрпрэтацыі выдаткаў вытворчасьці.
6. Закрытасьць інфармацыі і адсутнасьць незалежнага аўдыту.

## Начальнік-разбуральнік

Час, калі цана беларускіх тавараў была на 40% ніжэйшая за цану на небеларускія, прайшоў. Пра гэта сьведчыць падзеньне аб’ёмаў гандлю з Расеяй у першай палове году. Апроч таго, канкурэнтныя перавагі беларускай эканомікі аслабленыя высокімі тэмпамі росту заробку. У нармальнай эканоміцы рост заробку павінен ісьці за ростам вытворчасьці, а ён, у сваю чаргу, грунтуецца на росьце інвэстыцыяў і рэнтабэльнасьці. Паколькі рэнтабэльнасьць у беларускай эканоміцы застаецца нізкай, то інвэстары губляюць да яе цікавасьць.

Дзяржаўныя інвэстыцыі працуюць кепска, прыватнікі нас баяцца з-за неспрыяльнага інвэстыцыйнага клімату. «Пры цяперашняй сыстэме матывацыі кіраўніцтва прадпрыемстваў празьмерны ўпор робіцца на выкананьне кароткатэрміновых мэтавых паказьнікаў па тэмпах росту і дасягненьні прыярытэтных сацыяльных мэтаў, пастаўленых урадам», — зазначаюць экспэрты. Так што ўрад разбурае тыя перавагі эканомікі антыпрадпрымальніцкім, надзвычай рэакцыйным дзелавым кліматам. Кіраўнікі беларускіх прадпрыемстваў скардзяцца на пазаплянавыя праверкі, рэгуляваньне цэнаў (на 66% прадпрыемстваў), складаную працэдуру атрыманьня дазволаў, высокія падаткі, цяжар якіх куды вышэйшы, чым у суседніх краінах. Прыблізна 30% усіх падаткаў, якія плацяць прамысловыя прадпрыемствы, бяруцца з абароту, што падрывае канкурэнтныя перавагі рэальнага сэктару. Пры гэтым больш за ўсё церпіць прамысловасьць. У 2000 г. дзяржава адбірала 80% дабаўленай вартасьці прамысловасьці ў цэлым і 70% у ключавым яе сэктары — машынабудаваньні. У 2003 г. гэтыя дадзеныя панізіліся — і складаюць крыху менш 60% і 65% адпаведна.

Беларуская сыстэма генэруе зоны галечы і адзінкавыя астраўкі працьвітаньня.
Іх уладары езьдзяць на «мэрсэдэсах», жорстка ахоўваючы сваю манаполію ў калідорах улады і судоў.

## Гэраклы беларускага экспарту

20 найбуйнейшых экпартэраў Беларусі забясьпечваюць 55% агульнага аб’ёму экспарту і больш 80% экспарту па-за межы краін СНД, большасьць беларускіх прадпрыемстваў працуе ў рэжыме малой закрытай эканомікі. Вынікае, што падтрымліваць на плаве 20 прадпрыемстваў, што дасталіся ў спадчыну ад СССР, прасьцей, чым ствараць новыя. Таму беларускі рост ВУП і экспарту забясьпечаны рукамі, а не мазгамі.

Беларусь не зважае на парады міжнародных арганізацыяў. У сьвеце няма гістарычнага прэцэдэнту пасьпяховай барацьбы з галечай, пабудовы сацыяльна справядлівай дзяржавы і забесьпячэньня ўстойлівага росту краіны на аснове дзяржаўнай уласнасьці, дыскрымінацыі прыватнага капіталу, манапольных практык і цэнавага рэгуляваньня. Беларусь, ігнаруючы багаты міжнародны досьвед і інтэлектуальную дапамогу, ужо 12 гадоў экспэрымэнтуе ў рамках менавіта гэтай мадэлі, а яе кіраўніцтва старанна падбірае статыстычныя індыкатары. Кажа пра мір, стабільнасьць і працьвітаньне — нічога не дапамагае.

Бо аніякага эканамічнага, сацыяльнага і любога іншага фэномэну ў Беларусі няма. Затое функцыянуе несправядлівая, шмат у чым амаральная сыстэма. Яна генэруе вялізныя кішэні галечы і адзінкавыя выспачкі працьвітаньня. Іх уладары надменна езьдзяць на «мэрсэдэсах» і «бумэрах», жорстка ахоўваючы сваю манаполію ў калідорах улады і судовай сыстэмы. Такая мадэль можа быць палітычна і эканамічна ўстойлівая на працягу некаторага прамежку часу, пры спрыяльнай эканамічнай каньюнктуры і палітычнай падтрымцы кіраўніцтва Расеі альбо расейскіх манаполій і алігархаў. Аднак рэальная эканамічная інтэграцыя на рэгіянальным узроўні супярэчыць лёгіцы яе разьвіцьця.

*Скарочана.*



**Яраслаў Раманчук** (нар. 1966, Сапоцкін пад Горадняй), лібэральны эканаміст, намесьнік старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі, кіраўнік навуковага дасьледчага цэнтру Мізэса АЦ «Стратэгія».

**Індэкс разьвіцьця чалавечага патэнцыялу, 2005 г.**

| Месца ў Дакладзе 2005 | Краіна | Месца ў Дакладзе 2004 | Чакальная працягласьць жыцьця пры нараджэньні. Даклад 2005 | ІРЧП у Дакладзе 2005 | ІРЧП у Дакладзе 2004 | ВУП на душу насельніцтва ў пераразьліку на пакупніцкую здольнасьць Даклад 2005 | ВУП на душу насельніцтва ў пераразьліку на пакупніцкую здольнасьць Даклад 2004 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Нарвэгія | 1 | 79,4 | 0,963 | 0,956 | 37670 | 36600 |
| 2 | Ісляндыя | 7 | 80,7 | 0,956 | 0,941 | 31243 | 29750 |
| 3 | Аўстралія | 3 | 80,3 | 0,955 | 0,946 | 29632 | 28260 |
| 38 | Эстонія | 36 | 71,3 | 0,853 | 0,853 | 13539 | 12260 |
| 48 | Латвія | 50 | 71,6 | 0,836 | 0,823 | 10270 | 9210 |
| 39 | Літва | 41 | 72,3 | 0,852 | 0,842 | 11702 | 10320 |
| 36 | Польшча | 37 | 74,3 | 0,858 | 0,850 | 11379 | 10560 |
| 62 | Расея | 57 | 65,3 | 0,792 | 0,795 | 9230 | 8230 |
| **67** | **Беларусь** | **62** | **68,1** | **0,786** | **0,790** | **6052** | **5520** |
| 78 | Украіна | 70 | 66,1 | 0,766 | 0,777 | 5491 | 4870 |
| 80 | Казахастан | 78 | 63,2 | 0,761 | 0,766 | 6671 | 5870 |
| 115 | Малдова | 113 | 67,7 | 0,671 | 0,681 | 1510 | 1470 |
| 85 | Кітай | 94 | 71,6 | 0,755 | 0,745 | 5003 | 4580 |
| 127 | Індыя | 127 | 63,3 | 0,602 | 0,595 | 2892 | 2670 |

# КДБ церпіць нацыстаў, але змагаецца з «экстрэмізмам»

Праваабаронца **Валянцін Стэфановіч** пра законапраект аб супрацьдзеяньні экстрэмізму.

Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытаньні законапраект «Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму», які быў унесены на разгляд КДБ Беларусі. Маўляў, КДБ не хапае заканадаўчай базы, каб супрацьстаяць экстрэмісцкай дзейнасьці ў краіне. Паводле слоў прадстаўніка названага ведамства, экстрэмізм і яго праявы атрымалі шырокае распаўсюджаньне ў Беларусі, а краіны Захаду рыхтуюць інтэрвэнцыю супраць нашай краіны.

Безумоўна, праявы экстрэмізму ў грамадстве ёсьць, і змагацца зь імі трэба. Але ці сапраўды для змаганьня з такімі праявамі не хапае юрыдычнай базы? У Крымінальным кодэксе ёсьць артыкулы, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасьць і за распальваньне нацыянальнай, расавай, рэлігійнай і іншай варожасьці (арт. 130 КК РБ), і за дзейнасьць арганізацый, якія замахваюцца на законныя правы асобы і грамадзян краіны (арт. 193 КК РБ), і за стварэньне незаконнага ўзброенага фармаваньня (арт. 287 КК РБ), і за заклікі да зьвяржэньня існуючага канстытуцыйнага ладу (арт. 361 КК РБ). Вядома, ёсьць пэўныя прагалы ў дзеючым заканадаўстве, якія варта было б ліквідаваць у мэтах больш дзейснага прадухіленьня праяў эстрэмізму ў краіне.

Прыгадваецца выпадак, калі ў 2004 годзе на адзін з «ланцугоў неабыякавых людзей», у гадавіну зьнікненьня Юр'я Захаранкі, прыйшлі скінгэды. На Кастрычніцкай плошчы было, як заўсёды, дастаткова шмат прадстаўнікоў праваахоўных органаў, як у форме, так і ў цывільным. На рукаве аднаго са «скіноў» я заўважыў стылізаваную свастыку РНЕ. Я падышоў да маладзёна і, узяўшы яго за руку, падвёў да аднаго зь міліцыянтаў. «Паглядзіце, зь якой выявай у 60-ю гадавіну вызваленьня Беларусі ад нацыстаў ходзіць гэты малады чалавек!» — сказаў я міліцыянту. Той загадаў «скіну» апрануць куртку і… адпусьціў яго. Чаму? Таму што нідзе ў законе няма забароны на публічную дэманстрацыю фашысцкай сымболікі. Як нідзе ў дзейным заканадаўстве няма апісаньня, што зьяўляецца фашысцкай сымболікай. Такія законы прынятыя на ўсіх эўрапейскіх краінах. Ёсьць такі закон і ў Расеі. У Латвіі і Эстоніі разам з забаронай на публічную дэманстрацыю фашысцкай сымболікі (свастыкі і яе стылізаваных выяў) забаронена публічная дэманстрацыя савецкіх сымбаляў (сярпа і молата).

У Беларусі ёсьць арт. 167.2 КаАП Рэспублікі Беларусь, які забараняе карыстацца незарэгістраванымі сьцягамі, вымпэлямі, а таксама эмблемамі, выявамі, зьмест якіх наносіць шкоду грамадзкім і дзяржаўным інтарэсам, падчас правядзеньня спартыўных, культурна-масавых і іншых масавых мерапрыемстваў. Але па гэтым артыкуле чамусьці прыцягваюць да адказнасьці за карыстаньне нацыянальнымі бел-чырвона-белымі сьцягамі. Як штогод у мястэчку Сьвіслач Гарадзенскай вобласьці мясцовых актывістаў прыцягваюць да адміністрацыйнай адказанасьці за тое, што яны выкарыстоўваюць нацыянальныя сьцягі падчас ушанаваньня памяці братоў Каліноўскіх — удзельнікаў народна-вызваленчага паўстаньня супраць расейскага царызму. Для гэтага заканадаўчай базы хапіла, а вось каб прыцягнуць да адказнасьці малойчыкаў са свастыкамі, юрыдычнай базы не хапае.

Як не хапае базы прыцягнуць да адказнасьці, хаця б грамадзянскай, за антысэміцкія закіды ў кнізе «Вайна па законах подласьці», што выйшла ў выдавецтве «Православная книга». Паглядзіце на афіцыйныя дэманстрацыі з нагоды т.зв. Дня незалежнасьці. Асабіста я, як і тысячы нашчадкаў рэпрэсаваных грамадзян нашай краіны, публічную дэманстрацыю партрэтаў Сталіна ўспрымаю як праяву экстрэмізму. А чаго вартая нядаўна пабудаваная «лінія Сталіна»? Імя Сталіна рэабілітуецца ўладамі, вяртаецца ў грамадзкую сьвядомасьць. Прадстаўнікам экстрэмісцкай, не зарэгістраванай у Міністэрстве юстыцыі Беларусі НБП (нацболам Лімонава) дазволілі праводзіць пікет на пл. Бангалор (як фізічным асобам). Дый чаму б не дазволіць, калі «нацболы» выступаюць з гарачай падтрымкай А.Лукашэнкі, за аднаўленьне «вялікага і магутнага» СССР — фактычна за ліквідацыю сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусь. Мала юрыдычнай базы?

Выступ намесьніка старшыні КДБ таварыша Дземянцея перад «парлямэнтарамі» паказвае, каго гэтае ведамства бачыць у ролі экстрэмістаў. Усе працаўнікі існуючай нэасавецкай палітычнай сыстэмы, прадстаўнікі дэмакратычнай апазіцыі — экстрэмісты.

Прыняцьце гэтага закону менавіта цяпер зразумелае. Наперадзе выбары. Ёсьць пільная неабходнасьць узмацніць «працу» ўсіх дзяржаўных органаў, у тым ліку і КДБ, па забесьпячэньні чарговай «элегантнай перамогі» на гэтых выбарах А.Лукашэнкі, сытуацыя для якога цяпер крытычная. Пасьля таго як летась Вэнэцыянская камісія зрабіла заключэньне аб неканстытуцыйнасьці пытаньняў, вынесеных на рэфэрэндум, вельмі магчыма, што сёлета тая ж камісія зробіць заключэньне аб незаконнасьці ўдзелу ў бліжэйшых выбарах кандыдата А.Лукашэнкі. Гэтае ж меркаваньне можа быць падтрымана і АБСЭ.

Мясцовыя «экстрэмісты», безумоўна, таксама будуць распаўсюджваць адпаведную друкаваную прадукцыю, заклікаць народ бараніць свой выбар перад фальсыфікацыямі…

Усяму гэтаму «экстрэмізму» трэба супрацьстаяць. Але як? Гэтыя дзеяньні заўсёды можна будзе падвесьці пад азначэньне «экстрэмізм»: напрыклад, «дзейнасьць, скіраваная на падрыў нацыянальнай бясьпекі дзяржавы», ці «арганізацыя хуліганскіх дзеяньняў па матывах ідэалягічнай варожасьці» — гэта фармулёўкі з прадстаўленага законапраекту.

У цэлым законапраект не прапануе нічога новага ў параўнаньні зь дзеючым заканадаўствам і таму зьяўляецца дакумэнтам хутчэй ідэалягічным, чым юрыдычным. Дзейнасьць незарэгістраваных арганізацый забаронена, і за гэта ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасьць (арт. 167.10 КаАП РБ). Штогод дзясяткі актывістаў дэмакратычных рухаў прыцягваюцца да адказнасьці па гэтым артыкуле. 150 НДА краіны ліквідаваны ў судовым парадку і без абвінавачаньняў у экстрэмісцкай дзейнасьці.

За распаўсюджваньне друкаваных матэрыялаў без выходных зьвестак (ото ж экстрэмізм!) таксама ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасьць (арт. 172 ч. 3 КаАП РБ). Штогод тысячы дэмакратычных актывістаў прыцягваюцца да адказнасьці па гэтым артыкуле за «самвыдат». Незалежныя газэты ліквідуюцца і без «экстрэмізму» — проста забараняецца іх распаўсюджваньне.

Згодна з законапраектам, прафіляктыку праяваў экстрэмізму будуць ажыццяўляць органы пракуратуры, Міністэрства юстыцыі, КДБ і іншыя дзяржаўныя органы. Яны будуць выносіць афіцыйныя папярэджаньні арганізацыям і грамадзянам аб недапушчальнасьці «экстрэмісцкай дзейнасьці». Але, наколькі я памятаю ўнівэрсытэцкі курс права, органы пракуратуры, КДБ і Міністэрства юстыцыі і так надзелены такім правам…

Краіна ўжо гэта праходзіла. Нічога новага гэты законапраект не прадугледжвае. Гэта ня што іншае, як гістэрычнае нагнятаньне страху ў грамадстве напярэдадні выбараў прэзыдэнта.

Пры ўсіх гэтым ня трэба забываць, што народ Беларусі мае поўнае права на мірны пратэст, у тым ліку — супраць дыктатарскага рэжыму А.Лукашэнкі, мае права сказаць яму «досыць».



**Валянцін Стэфановіч** — праваабаронца. Супрацоўнічаў зь ліквідаваным Праваабарончым цэнтрам «Вясна».

# Імітацыя дыпляматыі

Пасол Расеі ў Беларусі — перашкода на шляху інтэграцыі. Піша **Гары Куманецкі**.

Расея, нарэшце, вызначылася. Пашукаўшы паўгоду на бяскрайніх сваіх абсягах аднаго чалавека, які быў бы гатовы стаць расейскім пaслом у Менску. Знайшлі. Гэта Аляксандар Сурыкаў. Ён яшчэ пакрыўдзіць Лукашэнку не пасьпеў. Дый наўрад ці наагул ён будзе каго крыўдзіць на сваёй новай пасадзе. Былога губэрнатара далёкага Алтайскага краю, што ляжыць недзе ў сэрцы Азіі, ведаюць як чалавека памяркоўнага й безыніцыятыўнага.

Тым часам Дзімітры Аяцкаў, які і ў сваёй Саратаўскай вобласьці на вярблюдах гойсаў, разьбіраўся са сваёй маёмасьцю. Ягоныя губэрнатарскія харомы, зь якіх папрападала сантэхніка й дзьвярныя клямкі, дэманстравалі па расейскім тэлебачаньні не раўнуючы як пячору Алядына. Паўгоду пайшлі ў Аяцкава на разборкі з падаткаўкамі, прыставамі, міліцыяй. Пакрыўджаны Аяцкавым Лукашэнка пільна сачыў за лёсам свайго крыўдзіцеля. Патрон Беларусі асабіста пацікавіўся ягоным далейшым лёсам.

І гэты лёс склаўся як найлепей. Вынырнуўшы з усіх скандалаў (і палітычных, і з сантэхнікай у сваім губэрнатарскім маёнтку), ён усьпеў на пасадзе намесьніка прадстаўніка Пуціна ў Прыволскай фэдэральнай акрузе Сяргея Кірыенкі. Зважаючы на памеры тае фэдэральнае адзінкі й на яе эканамічны патэнцыял, Аяцкаў, безумоўна, выйграў — матэрыяльна й маральна. Даўшы Лукашэнку пстрычку па лбе, заслужыў спакойнае месьцейка.

Тым часам нават без прысутнасьці пасла «інтэграцыя» працягвалася. Больш за тое, менавіта зь яго адсутнасьцю пачалося ажыўленьне так званага «працэсу стварэньня саюзнае дзяржавы»!.. Праект «канстытуцыйнага акту» гэтай «дзяржавы» мае быць прадстаўлены на разгляд найвышэйшых яе органаў 15 лістапада. Расейскія СМІ пасьпяшаліся прызначыць на сакавік рэфэрэндум, далей — выбары ў «саюзны парлямант» і выбраньне прэзыдэнта *ўсесаюзнае дзяржавы*! Хоць сёньняшні варыянт акту гэтага не прадугледжвае, але хто сказаў, што ён апошні й непарушны? Законы, канстытуцыі й правілы гульні ў Менску мяняюцца часта. Можа, калі вы чытаеце гэтыя радкі, ужо зьмяніліся й тэрміны «рэалізацыі» ды формы «інтэграцыі».

Пра «саюз» гавораць гэтак даўно, што ўжо мала хто помніць, хто ўсё пачаў. Пагатоў, у народу ўсё менш разуменьня, нашто той «саюз» патрэбны, калі ўсё ж неяк жывём і безь яго. А паводле Лукашэнкі, жывём лепш чым хто…

Па-другое: ніхто: ні палітолягі, ні аналітыкі, ні прэзыдэнты — ня здолеў адказаць на пытаньне, што гэта будзе за ўтварэньне? Да чаго падобнае? Калі да СССР — гэта мы ўжо праходзілі ў школе. Калі да Эўразьвязу — то ці не прасьцей туды ж імкнуцца й братанам-славянам? Калі да куртатай СНД — то навошта столькі лішняга тлуму?

Ну і галоўнае: хто сказаў, што Лукашэнка ў выпадку зьяўленьня пасады прэзыдэнта «Саюзу» бачыць на гэтай пасадзе каго-небудзь, апроч сябе? Гэта выдатна разумее і Пуцін, і ўвесь расейскі бамонд. Лукашэнка выдатна ўпісваецца ў ролю прадстаўніка электарату Зюганава й Жырыноўскага, але ён куды мацнейшы за іх. Ён мацнейшы й за Пуціна, які нyздатны й на палову тае безапэляцыйнай дэмагогіі, якой Лукашэнка завальвае беларускую мэдыйную прастору. Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць…

Таму маскоўскія палітыкі зноў прытарможваюць. Пакуль будзе Лукашэнка, інтэграцыя зь Менскам будзе таіць у сабе велізарную небясьпеку для самой Расеі. А таму, пакуль зьдзейсьняцца тыя абяцанкі-цацанкі, якім радуюцца Лукашэнкавы выбарцы, Расея будзе мець паўнавартасныя дыпляматычнае адносіны зь невялікай краінай на сваіх заходніх межах. Пры тым трэба працягваць бурна імітаваць бурнае славянскае братэрства. І на гэты «шэры» пэрыяд асоба А.Сурыкава надаецца як найлепей. Будучы расейскі пасол — чалавек ураўнаважны, абачлівы й асьцярожны ў сваіх выказваньнях. Прынамсі, ён будзе такім, пакуль не пажыве ў Менску.

# Максім. Ігар Палівода




**Розныя выканаўцы.** (р) перавыд. «Ковчег», 2005.

Вы што-небудзь з гэтага чулі ў айчынным FM-этэры?

Нязначным накладам «Ковчег» перавыдаў выдатны твор выдатнага кампазытара і аранжыроўшчыка, чые творы яшчэ шмат гадоў будуць выконваць. І сёньня «Максім» — зонг-опэра на вершы Багдановіча (пры ўдзеле Леаніда Пранчака) — гучыць сучасна, сьвежа. Выдатны ўзор для тых цяперашніх стваральнікаў поп-шэдэўраў, якія з такой цяжкасьцю пралазяць у адчыненую на 75% фарматную браму. Нават ня надта якасны канцэртны запіс, часам не зусім дакладныя сьпевы выказваюць узровень таго, што было напісана. Вучыцеся, салаўі, у Паліводы — каб вашы песьні жылі, а ня кісьлі, каб іх сьпявалі, а не плявалі ім усьлед.

Дзяржаўны канцэртны аркестар Беларусі, які на пачатку 1990-х выглядаў за сапраўды дзяржаўны, яго салісты — Алена Саўленайтэ (дзе яна цяпер?), Уладзімер Кудрын (Аўстралія), Іна Афанасьева (сольная кар'ера), Мікалай Скорыкаў (тамсама, дзе й быў), Юлія Скараход (Польшча), Вадзім Касенка (адзін зь «Песьняроў»). І якія песьні! «Панад белым пухам вішняў», «Як Базыль у паходзе канаў», «Цемнавокая пані». Вы штонебудзь з гэтага чулі ў айчынным FM-этэры? Ды іх на радыёстанцыях проста ніхто ўжо ня ведае. І ня хоча ведаць! Як сёньня вы не пачуеце ў выкананьні Дзяржаўнага канцэртнага аркестру і Паліводаву «Пагоню» — фінал гэтай опэры, найлепшае, што было напісана на гэты знакаміты верш. Але як сёньня помніцца: канцэртная заля філярмоніі, на ўвесь заднік — выява «Пагоні», дырыжэр Міхаіл Фінберг і салісты, якія ўсе разам выконвалі той фінал. Заля стоячы вітала «Максіма», і толькі сам кампазытар разгублена разводзіў рукамі: маўляў, а я тут пры чым? Гэта ўсё ён, Багдановіч…

Ды… Бог зь імі, у каго памяць не даўжэйшая за нотны радок. Бо калі гаварыць пра ўзор таго, што можна называць сапраўднай беларускай папулярнай песьняй, — лепшага збору цяжка прыдумаць. Яго проста няма. І, баюся, у цяперашніх варунках яшчэ доўга ня будзе. Вось чаму варта гэты дыск мець. Каб памяць ня зьнікла.

**Удзячны Слухач**

# What's New?



**Трыё Аркадзя Эскіна.** (р) «Ковчег», 2005.

Нехта яшчэ здольны граць сапраўдны джаз!

Нарэшце! Раней мы думалі: адзінае, што ў гэтай краіне асацыюецца з джазам, — гэта наш айчынны Глен Мілер, трамбаніст Міхаіл Якаўлевіч. А тут, аказваецца, нехта яшчэ здольны граць сапраўдны джаз! Сп.Эскін дагэтуль мог пахваліцца толькі трыма выдадзенымі на Захадзе альбомамі, у запісе якіх ён браў удзел. А тут — такія навіны!

Альбом шыкоўны! Гэта канцэртны запіс трыё Аркадзя Эскіна зь Мікалаем Нэронскім на басе і Андрэем Славінскім на барабанах. Канцэртны запіс — безумоўны плюс альбому, бо дазваляе адчуць кантакт з публікай і атрымаць асалоду ад сапраўднай імправізацыі, што нараджаецца падчас ігры. Рэпэртуар звычайны для лідэра трыё: часткова мэйнстрым, клясыка жанру, часткова — аўтарскія творы піяніста плюс адзін інструмэнтал аўтарства Нэронскага. А ў цэлым — асалода! Нечаканае прачытаньне Лучанковай «Веранікі» адразу вывodзіць беларускага мэтра на адзін узровень з Гершвінам. Энэргічнае ўвасабленьне «Something Different» аргентынца Чака Манджонэ, у нечым засяроджанае «Besame mucho» Вэляскеса, гульлівае «Bei mir bist du schoen», творы Гершвіна. І плюс да гэтага — аўтарскія творы піяніста: «Мая прыгожая Клара» (прысьвячэньне жонцы), «Жужаль», «Гішпанія».

Нечаканы і шокавы ўдар. Бурыць уяўленьні пра беларускую музыку як зьяву, што ня ў сілах прыемна ўразіць і стварыць канкурэнцыю аўтарытэтам на стаптаных джазавых атавах. Ёсьць у нас такія людзі.

**Уражаны Слухач**

# Надеждзін пароль




**Аляксей Шадзько і група «Сестра».** (р) аўт. выданьне, 2004.

Шадзько піша і сьпявае, не зважаючы, любяць яго ці не.

Як і з усімі апошнімі альбомамі Шадзька, амаль немагчыма пісаць пра пачутае адразу, як раз ці два паслухаў работу. У песьні трэба ня проста «ўяжджаць», трэба літаральна ўціскацца, каб стрэсьці зь сябе адчуваньне дыскамфорту. Бо за табой неадчэпна цягнецца сьлед штодзённай гукавой рэальнасьці, поўнай заштампаванага песеннага сэкэнд-хэнду. Шадзько піша і сьпявае, не зважаючы, любяць яго ці не, ён гне ўласную лінію, чым і выклікае павагу.

Цалкам магчыма, у нечым Аляксей часткова і паўтараецца, калі браць пад увагу два-тры яго апошнія альбомы. Гэта адчуваецца ў песьнях «Сьпі», «Мая бяда», «Пра бясконцасьць». Безумоўныя ўдачы — быццам аголеная «Не памірай», паэтычная загалоўная песьня, крыху нэрвова-рытмавая «Знайсьці крыніцу». «Жалезныя браты» — гэта хіба даніна байкерам, зробленая ў знарочыстай, нават экзальтаванай гард-рок-стылістыцы. Таму й не ўспрымаецца як цалкам шчырая. Хутчэй як «зробленая». Цікавая новая вэрсія Шадзьковай даўняй, яшчэ з канца 1980-х, песьні «Белыя гарады», аранжыроўку якой зрабіў гэтым разам Уладзімер Ткачэнка.

Карацей — своеасаблівая школа выканальніцтва для маладых. І няхай крычаць, што гэта, маўляў, макулятура, вось мы — такія модныя ды разгэтакія актуальныя! Але культуру выкананьня, адчуваньне стылю, ня кажучы ўжо пра такую дробязь, як талент, у музыцы яшчэ ніхто не адмяняў. Моды мінаюць, застаецца сапраўднае. Будзеш ведаць пароль — застанесься. Ня ведаеш — праходзь міма.

Твой час яшчэ не настаў, хлопча…

**Запаролены Слухач**

# Crossing the Jordan



**Група «Spasenie».** (р) «Music Center C», 2004.

Рай, адным словам. Сумна!

Чарговы альбом групы паходжаньнем зь Берасьця. Тэматыка яе твораў засяроджваецца на ўслаўленьні каштоўнасьцяў хрысьціянства. Асноўныя інтарэсы «Spasenie» даўно сканцэнтравала там, дзе падобная музыка запатрабаваная.

Альбом запісаны Ігарам Мухам і яго калегамі з дапамогай сяброў з Амэрыкі. Якасны з тэхнічнага боку запіс, дай божа ўсім нашым калектывам такі. Але — не кранае. Стандартная, дыстыляваная прадукцыя, якой па ўсім сьвеце — тысячы ўзораў. Такая музыка яўна лішняй была б у якім праваслаўным храме, але выдатна «коціць» у храме пратэстанцкім, чые прыхаджане — такія ж вернікі лагодненькага, вылізанага попроку, як і беларускі пралетарыят — бубльгуму расейскае папсы. Я не іранізую. Проста ня трэба называць беларускім калектывам, калі ствараеш тое, што ня мае аніякіх прыкметаў таго, адкуль прыйшла твая музыка і хто яе спарадзіў. Музыка заўсёды павінна імкнуцца да адкрыцьцяў, спараджаць пачуцьці, хваляваць. У альбоме нічога такога няма. Ціха, гладзенька, цёпла, пташкі шчабечуць, вечназялёныя дрэвы… Рай, адным словам. Сумна!

**Нявыратаваны Слухач**

# Tradycyjnaja smykovaja muzyka Belarusi




**Капэля Алеся Лося.** (р) «Bredzis Records», 2005 (дэма).

І цымбалы, і басэтля.

Альбом спадабаецца тым, хто цікавіцца гісторыяй таго, што некалі гралася на беларускіх землях. Склад капэлі (Марына Калечыц — цымбалы; Ганна Харчанка — басэтля, скрыпка; Юры Рамашэўскі — басэтля; Алесь Лось — скрыпка, бубен) набліжаны да аўтэнтыкі і выконвае папулярныя танцы і мэлёдыі былых часоў. Музыка зацягвае і не дае хвіліны адпачынку. Хоць, па вялікім рахунку, яна ствaралася дзеля яго — адпачынку. Полькі, абэркі, мазуркі, вальсы — цудоўны набор мэлёдый, якія, аднак, ня надта ўпісваюцца ў цяперашнюю рэальнасьць зь яе псэўданароднымі скокамі на чарговых «Дажынках» з урaджаю ці тым больш «Славянскіх базах» па нарыхтоўцы поп-корну.

Але капэлю А.Лося не запросяць на дзяржаўныя ўрачыстасьці. Нават з полькай «Дажынкі». Бо выконвае ён — сапраўднае. А на парадку дня стаіць — папса, псэўданародная, затое абласканая ненаглядным Мінкультам.

Альбом тыражаваны мінімальна намаганьнямі саміх выканаўцаў. Таму ня дзеля рэклямы, а дзеля таго каб гэтую музыку пачулі: los@lingvo.minsk.by.

**Аўтэнтычны Слухач**

# Аранжавы досьвітак



**«Странник М».** (р) «Странник М», 2003.

Як кажуць у чатах: ІМХО.

«Странник М» — сольны праект былога лідэра вельмі стылёвай менскай групы «Thank You Jesus» Улада Благуша. Тады ён сьпяваў на ангельскай мове, цяпер па-расейску. Як кажуць у чатах: ІМХО. Што было зроблена некалі на ангельскай, падабалася мне значна больш.

Аднак… «Thank You Jesus» разьбегліся па эміграцыях і калектывах, Улад дамовіўся з найлепшымі музыкамі краіны (К.Гарачы, В.Башкоў, К.Шавандо, С.Мядзьведзеў, Ю.Глушыцкая, І.Люты, Д.Хаменка і інш.), у выніку чаго паўстаў гэты альбом. Запісаны ён быў задоўга да ўкраінскага Майдану, а таму ніякага дачыненьня да перамогі Ючшанкі ня мае.

Мае ўражаньні: калі б не было Шадзька зь ягонай «Сестрой», «Странник М» мог бы прэтэндаваць на іхняе месца. Тут і падабенства музыкаў, якія ўдзельнічалі ў запісе, і падабенства музычна-паэтычнае ідэалёгіі, стылістыкі. Сьпелая, годная праца, стылёва вытрыманая і ўраўнаважаная. Не для шырокай публікі. Для той, якая жадае зьместу, а ня формы; настрою, а не фармату. Не для вялікай залі, а для клюбу, дзе слухачы і выканаўцы — вочы ў вочы, дзе няма сумневу, фанаграма гэта ці сапраўдныя сьпевы.

Таму ў сучаснай рэальнасьці — аніякага камэрцыйнага посьпеху. Асалода для жыхароў «хрушчовак», якія своечасова абарвалі правады радыёкропак і таму ня чуюць на кухні «ўсяго гэтага» — накшталт «Скрыгатаньняў Эўропы». Хоць многія песьні з гэтага альбому ўпісваюцца ў стылістыку попроку і маглі б змагацца за ўяўныя прызы на тэлевізійным бэст-фэстывалі.

Арыгінальна і з густам зроблена. Пачакаем наступнага альбому, які ўжо на падыходзе.

Але «Thank You Jesus» было ўсё ж больш яскравае…

**ІМХО-Слухач**

# Nothing but Love




**«Svet Boogie Band».** (р) аўт. выданьне, 2005.

Па-вясельнаму, як сказаў бы Слава Корань.

Чарговая годная ўвагі праца менскага калектыву, чыя стылістыка ды мова выкананьня не дазваляюць яму трапіць нават у конкурс на чарговае «Басовішча». Сьпяваюць па-ангельску ды яшчэ ў зусім не беларускай стылістыцы, пры гэтым весела, пазытыўна (па-вясельнаму, як сказаў бы абураны Слава Корань), разьняволена і вельмі прафэсійна. Аднак са сваімі аўтарскімі бугі-вугі, ды яшчэ выдадзенымі пад такой арыгінальнай назвай, патрапілі музыкі ў фарматныя абцугі. Гэта значыць ні ў FM ім не працінуцца, ні на «Басовішча», ні ў «Тузін гітоў» не пралезьці. Гэткія чужынцы на радзіме. Вось і застаецца, гаротным, па ўсялякіх Чэхіях ды маскоўскіх клюбах бадзяцца і набіраццa там, кінуўшы пад ногі выцьвілыя капелюшы.

Альбом ня дасьць поўнага ўяўленьня пра калектыў. Бо Сьвета зь сябрамі трэба бачыць на сцэне, бо іхнія выступы — сапраўднае раскаванае шоў. Безь відэашэрагу гэтыя творы трацяць шмат. Але імкнуцца выканаць сёньня бугі ў Беларусі гэтак, як тое рабілі мурыны ў Амэрыцы, сэнсу няма. Бугі — ён стыль хоць і тупаваты, абмежаваны, але дэмакратычны, бо дапускае ў сябе вельмі многае. У тым ліку і знарокавае блазнаваньне, да чаго Сьвет энд компані зьвяртаюцца ахвотна і збольшага дакладна.

Альбом утрымлівае не адны толькі бугі («Happy with the Boogie»), блюз-бугі («Look What You Get, Girl!», «W'l Tia») ці проста чысты блюз («Do You Feel It…»). Упрыгожвае альбом выкананы дуэтам Сьвет і Вэл (вакал) блюз «Why Oh Why?»

Вось толькі шрыфт, якім надрукаваныя тэксты песень, прызначаны для людзей зь вельмі вострым зрокам. Альбо для тых, хто проста чуе блюз.

**Boogie (прабачце) Hearer**

# «З другога боку люстранога шкла»

## Вёска

Уступ: D+e A7sus4

D F G
Я зьяжджаю ў вёску,
B D B
Каб стаць бліжэй да зямлі;
D F F/e C F
Я спазнаю ўласьцівасьці красак ды траў.
Em G A D D+G#
Я кіну ў агонь духмяны чабор,
C B Am
Дым узьнімаецца ўгору — свой шлях адшукаў.

Пройгрыш: C D/f# G (D A7 D A7 G) – 2 разы

Я знайду корань дзягілю —
Зрабі весялейшым мяне;
Гольле бярозы — прэч, дэманы, прэч…
Ў час, калі стане занадта цёмна,
Скончу чытаць табе,
Я адчыняю дзьверы, і там стаіць ноч.

Пройгрыш: C D/f# G (D A7 D A7 G) – 2 разы

Dm Dm/c G
Хто гаворыць з імной;
Dm Dm/c G
Хто тут гаворыць з імной?

Пройгрыш: Am G Am, C G D – 2 разы
Даўгі пройгрыш: D G

Hm A G
Радасьці тым, хто шукае;
D C G
Мужнасьці тым, хто сьпіць.
Hm A G F D
Трынаццаць дзён у бок поўні рушылі мы.
F G D
Я думаў, што мне гэта сьніцца,
F G D
Што ж, вітаю вас, мае сны;
G F A
І я зразумеў, нашто да мяне вы прыйшлі;
D F G
Бо я зьяжджаю ў вёску,
B D B
Каб стаць бліжэй да зямлі.

## Дваццаць пяць да дзесяці

Уступ
C Em
e–8—–7–5–12–10
F G
e–8—–7–5–17–15

C Em
Я інжынэр за сотню рублёў,
F G C
І больш мне не атрымаць.
C Em
Мне дваццаць пяць, і да гэтай пары
F G C
Я ня знаю, чаго жадаць.
Am G
І, здаецца, няма ніякіх прычынаў
Am D/F#
Ганарыцца лёсам сваім,
C G
Але, каб я мог выбіраць сябе,
F G C
Я б зноў стаў сабой самім.

Мне дваццаць пяць, і дзесяць зь іх
Немавед, пра што я пяю.
І пакуль так складана баяцца той,
Што ўжо сочыць душу маю.
І няхай ня простыя словы мае,
У гэтым мала віны маёй;
Што ж да той, што сочыць душу маю, —
Ўсе мы роўныя перад ёй.

Можа стацца, гадзіньнікі ўсе, як адзін,
Пачнуць адваротны адлік,
І таму, каго з плачам здымалі з крыжа,
У далонь зноў загоняць цьвік.
І пяшчотныя вусны, як і раней,
Будуць прагнуць свайго Хрыста;
Я сьпяваў, што хацеў: хоць у гэтым адным
Для папрокаў няма падстаў.

Я шчасьлівы тым, як склалася ўсё,
Нават тым, што было ня так.
Нават тым, што ў маёй галаве скавышы,
І ў храме маім бардак.
Я адно намагаўся расьціць свой сад,
Не псаваць краявіду ніяк.
Зразумее начальнік заставы мяне,
І даруе мне сьціплы рыбак.

## З другога боку люстранога шкла

Уступ: Fmaj7/d Em
Fmaj7/d C
Апошні дождж ужо амаль ня дождж;
Am
Глядзі, як проста ў ім знайсьці спакой.
Fmaj7/d C C/h Am
І калі верыць, што назаўтра будзе новы дзень,
Fmaj7/d Em
Тады нашмат лягчэй.

Пройгрыш: F Fmaj7 F Fmaj7 F Em

Ах, толькі б не мінала гэта ноч;
Здаецца мне, мой дом ужо ня дом.
Глядзі, як сьветла ім — яны гуляюць у жыцьцё
На той сьцяне за шклом.

Здаецца мне, я быў зусім такі,
Як хлопчык той, што вершы разгарнуў.
Ён стрэлкі сьцяў рукой, каб гэты момант не мінуў,
І кроў цячэ з рукі.

Dm7(V) E7(VII) Am
А можа, гэта ўсё гульня была
Dm7(V) E7(VII) Am
З другога боку люстранога шкла;
Dm7(V) E7(VII) Am
І золак тут, ды мы ўсе засталіся пры
C C/h
сваім,
Dm C G Am
І зноў учора, што паробіш зь ім?

**Пераклаў з расейскай Antihomer**

## Каменны вугаль

D A
Каб каменны вугаль мог гаварыць,
G D
ён ня стаў бы весьці размоваў з табой,
D A
і карарскі мармур ня стаў бы сачыць твой
G D
сыход,
D A
але ты на вайне, ты страляеш
G D
на тысячу міляў і тысячу год,
D A G
і я прамаўчу ў адказ на пытаньне,
C G D
хто выйграе гэты бой.

Мадэрнісцкія сны маладых сьмецяроў —
ў іх ты будзеш спайманы ў трубе,
і пыхлівыя панны прывяжуць цябе да станка.
Яны спаваюць твой голаў вянком
і, сьпяваючы, кінуцца ў ноч,
іх таропкія вусны зракуцца імя твайго,
і ніколі ніхто не згадае тут пра цябе.

І калі Дзень Срэбра агорне сьвет,
і зазьзяе ў руцэ амэтыст,
і хто бег, той нарэшце знойдзе спакой на вякі,
ты паўстанеш зь нетраў зямных, акрыялы,
ў няведаньні, хто ты такі.
Я хацеў бы быць побач, калі
Вершнік працягне табе
яшчэ некрануты ліст.

## Б.Г.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Б.Г. (Барыс Грабеншчыкоў)** — расейскі сьпявак, паэт, кампазытар, лідэр рок-гурту «Акварыюм». Нарадзіўся 27 лістапада 1953 г. у Ленінградзе. Паводле адукацыі — матэматык.

## Грукацца ў дзьверы травы

Кападастар на 2м ладзе
C
Я бачыў, як рэкі сплываюць уніз
Am
І багі сузіраюць усход.
C
Я бачыў павевы сталёвых вятроў,
Am
Я вярнуў свае стрэлы на ўзьлёт.
F Fm
І я быў бы рады застацца тут,
C C/h Am
Ды паўсюль твае хатнія львы.
C C/h Am
Дык ня плач пра мяне, калі я пайду
F G
Грукацца ў дзьверы травы.

Твая маці, прынесшы свой English tea,
Апавядзе пра свае дываны.
Твой бацька ня ўстане падаць мне рукі
У стане халоднай вайны.
І ў доме тваім надта мала дзьвярэй,
І наўкола яго — равы.
Дык ня плач пра мяне, калі я пайду
Грукацца ў дзьверы травы.

Я бачыў у небе птушыны шлях,
Ды зьніклі ўсе птушкі даўно.
Я бачыў, як тысяча пільных вачэй
Глядзіць у маё акно.
І ты царыца красы, але мне абрыдла
Казаць тваёй мосьці «вы».
Дык ня плач пра мяне, калі я пайду
Грукацца ў дзьверы травы.

## Дзесяць стрэл

G C Hm
Дзесяць стрэл на дзесяці вятрох,
G C Hm
Лук — лаза і цеціва — мурог.
Am C G
Ён прыйсьціме з далячынь,
Am C G
Меч дажджу ў яго рукох.

Белы воўк вязе яго, бы пёс,
Белы грыф глядзіць за ім зь нябёс,
Зь ім прыйсьціме аднарог,
Цудны цуд ён доўга нёс.

Дзесяць стрэл на дзесяці вятрох,
Лук — лаза і цеціва — мурог,
Ён прыйсьціме з далячынь,
Am C Em
Цудны цуд ён доўга нёс;

Ўзыдзе ён на твой парог.
Меч дажджу ў яго рукох.

## Гаспадар

Уступ (=пройгрыш):

```
        E————|
        H————|
        G————|
AG      D————|
        A—0–2—|
        E–3——3–|
```

A G#(IV)
Гаспадару, даруй, што турбую цябе —
G(III) F#(II)
Досыць дзіўны начны візытэр.
A G#(IV)
На тваім паверсе гарэла сьвятло,
G(III) D
Дзьверы насьцеж, і ўжо сьпіць вахтэр.
E
Кватаранты сьвяткуюць улазіны,
F D
П'юць і кажуць: цябе няма;
A A/g# D
Ды я помню дзень першы ў гэтых
A
мурох:
D D/c G/h G A
Гаспадару, ты — існасьць сама.

Гаспадару, я проста йшоў ад сяброў
І думаў пра ўсё, што было.
Яны жывуць у гэтых новых дамох
І па-дзіцячаму хваляць жытло.
Ды я згадваю мой дымны кут, акно,
Ліхтар у ім, вежы й крыжы,
Гаспадару, й мне сьветла бы ў сьнежную ноч,
І мне сьмешныя іх мэтражы.

Гаспадару, я досыць дзіўны жыхар,
І ня любіць мяне аканом.
Твае слугі, магчыма, мілыя людзі,
Ды таксама ня пояць вінам.
І я іду паўзь іх, як шаноўны госьць,
Хаця я проста быў зьняў гэты кут,
Гаспадару, даруй мне дзёрзкасьць: твой дом —
Гэта мой дом, ня лішні я тут.

Гаспадару, плачу я табе ня так,
Але я плачу тым, што ёсьць.
Гаспадару, я зьняверааны ўшчэнт,
Але мне зьвеставаў вышні госьць.
Гаспадару, я — ненадзейны падмурак
І, напэўна, благое стырно.
Ды маё рамяство, Гаспадару!
Засьмягшы,
Згадаеш, якое яно.

**Пераклад з расейскай Maryjka**

**Праект паўстаў у рамках працы «Перакладніцкай майстэрні» пры «Беларускім калегіюме».**



АРХІЎ ВАЛЯНЦІНЫ ТАРАСА

**«Бацька паэта ў 1920-я гады трымаў у Менску ўласную сталоўку, куды нярэдка заходзілі Янка Купала, Якуб Колас, Язэп Лёсік. Можна толькі здагадвацца, якіх цікавых навінаў льга было там наслухацца ад наведнікаў, што бавілі час за шклянкай гарбаты ці, з дазволу гаспадара, за чаркай чаго мацнейшага. Сяргей закончыў агульнаадукацыйныя курсы — на гэтым з прычыны слабога здароўя вучобу давялося спыніць. Займаўся самаадукацыяй. У 1935-м ён быў арыштаваны, зь няволі вярнуўся схварэлы. У 1939-м — новы арышт і высылка ў Казахстан. Праз два гады вярнуўся. У вайну настаўнічаў, падпольна супрацоўнічаў з партызанамі. Чатырнаццаць гадоў адпрацаваў у «Вожыку». У апошнія гады жыцьця хвароба не адпускала, з хаты амаль не выходзіў. Многа пісаў, не паддаваўся немачы, сам сябе бадзёрыў: «Праехаць вельмі лёгка ці прайсьці шашой асфальтавай за плыньню руху. Але як цяжка часам нам брысьці па вогненнай сьцяжыне духу». Аўтар чатырох паэтычных кніг».**

**Міхась Скобла,**
**анталёгія «Краса і сіла»**

# Паэт, які хацеў забіць Будзённага

Памяці **Сяргея Дзяргая**.
Піша **Валянцін Тарас**.

У 1960-я мы жылі зь ім у адным доме па вуліцы Якуба Коласа, толькі ў розных пад'ездах, і цягам дзесяці гадоў я бываў у яго амаль штодзённа.

Якуба Коласа — ня лепшая вуліца для тых, хто на ёй жыве, асабліва калі ўсе вокны тваёй кватэры выходзяць на праезную частку: днём і ноччу равуць грузавікі, аўтобусы, скрыгочуць трамваі.

Але мала таго, што вокны Сяргея Сьцяпанавіча выходзілі проста на вуліцу (першы паверх), дык яшчэ і скрыжаваньне было пад самымі вокнамі. І ўвечары акрамя грукату раздражняў сьвятлафор, несупынна міргаючы то зялёным кацінам, то жоўтым воўчым, то бычыным чырвоным вокам.

І вось прыгадваецца: званю ў дзьверы, чакаю, пакуль Сяргей Сьцяпанавіч дакульгае да іх. Чакаць даводзіцца доўга. Хвіліны тры, а то і пяць, калі мой званок засьпеў яго ў ложку, калі ён сядзеў у ім — тычаў альбо пісаў у таўстым канторскім сшытку. Устаць з ложка было праблемай, і да дзьвярэй дабрацца таксама: у Дзяргая былі амаль атрафіраваныя ногі, і ён змушаны быў рукамі апускаць іх на падлогу. Ногі ня гнуліся ў каленях, ня слухаліся яго, як пратэзы. Хвароба ног была зьвязана з тубэркулёзам пазваночніка, атрафіраваліся нейкія нэрвовыя цэнтры, якія кіруюць нагамі, — здарылася гэта яшчэ ў юнацтве. Не заўсёды было так, не ён ня мог хадзіць, але пасьля выхаду на пэнсію (з пасады адказнага сакратара часопісу «Вожык») з нагамі зрабілася зусім кепска, і ён сядзеў у чатырох сьценах.

Нарэшце ён адчыняе мне, і я з парогу ўзрадавана яму кажу: «Сяргей Сьцяпанавіч! Сёньня ў Саюзе пісьменьнікаў была размова пра вас, каб вам кватэру памяняць, каб вы пераехалі куды-небудзь у Зялёны Луг, у цішыню. Каб вокны можна было насьцеж адчыніць! Начальства вырашыла: знайсьці Дзяргаю іншую кватэру. Вам трэба толькі заяву напісаць. Так што сядайце і пішыце, а я заўтра ж занясу яе ў Саюз!»

Ён ціхім голасам, але цьвёрда ахалоджвае мяне: «А хіба я прасіў, каб ты за мяне хадайнічаў? Скардзіўся каму-небудзь? Чаму ты вырашыў, што мне тут кепска?» — «Дык жа шумна, Сяргей Сьцяпанавіч! Грукат, сажа, пыл». «Ціха толькі на тым сьвеце, братачка! І хопіць на гэту тэму, — ён усьміхаецца сваёй заўсёды сарамлівай, дзіцячай усьмешкай. — І слухаць больш не хачу пра кватэру! Давай лепш гарбаты пап'ём».

За гарбатай я ўсё-такі спрабую яго пераканаць, што трэба яму перабрацца ў іншы раён, у ціхае месца, але ён пачынае злавацца: «Маладыя хлопцы да мяне прыходзяць, здольныя паэты, з будучыняй, вось ім хай і даюць жытло. А я тут у двух пакоях шыкую, як буржуй!.. Сорамна мне прасіць кватэру».

Так ён і пражыў да самай сьмерці ў сваёй «хрушчобе-палутарцы», у грукаце і бэнзінавым смуродзе за вокнамі, якіх ніколі не адчыняў, адно фортку ўначы на паўгадзіны: грукат усё ж даймаў яго. Але ён сапраўды ніколі ні на што ня скардзіўся: ні на сваю кватэру, ні на хваробу, ні наагул на жыцьцё. Пра тое, якім яно ў яго было, расказваў толькі ў вершах. І то мэтафарычна, намёкам. Нічога канкрэтнага:

> Ох, жыцьцё, жыцьцё!
> Як ты мяне вярэдзіла,
> Шкуматала,
> Трапала,
> Кідала,
> Якія пасткі на маім шляху ставіла!..

А што за пасткі — ні слова.

Яму было што хаваць, утойваць, ён баяўся многага ў сваёй біяграфіі. Нават і тады, калі можна ўжо было не баяцца. Вось яшчэ адна згадка. Пасьля сьвяткаваньня дваццатых угодкаў Перамогі зайшоў да Дзяргая, бачу — на пісьмовым стале ляжаць два чырвоныя пудэлкі. Я без папытаньня раскрыў адзін — у ім мэдаль «За адвагу», раскрыў другі — там юбілейны мэдаль. Пытаюся: «Сяргей Сьцяпанавіч, гэта што, вашы мэдалі?» «Мае, — усьміхаецца сарамліва. — Вось, прыехалі ўчора нейкія хлопцы зь Вярхоўнага савету, уручылі…» Мы на той час былі знаёмыя ўжо гадоў дванаццаць, але ніколі ён не казаў мне, што ўдзельнічаў у вайне. Гэта я яму вушы прадудзеў пра сваё партызанства, а ён толькі слухаў і ўсьміхаўся. «А што вы рабілі на вайне?» — задаў дурное пытаньне. — Дзе ваявалі?» «А я не ваяваў, — кажа, — дома сядзеў». «Як дома?» «Ну, я быў гаспадаром явачнай канспіратыўнай кватэры», — адказвае ён неахвотна. «Дык вы падпольшчык? Вы былі ў менскім падпольлі?» — «Не, у гомельскім». — «У гомельскім? Вы ж мянчук, вы ніколі не казалі, што жылі ў Гомелі!» Ён адказвае з ранейшай неахвотай: «Ну, я перад самай вайною пасяліўся ў Гомелі. У Менску мне забаронена было жыць, у мяне быў «мінус»…» «Мінус? Нічога не разумею!..» — «Мінус таму, што я сядзеў у лягеры. Выпусьцілі перад самай вайною, але ў Менск вярнуцца не дазволілі, на Менск у мяне быў «мінус», бо сталіца…» Мне ня трэба было тлумачыць, што такое «мінус», ня «мінусам» я быў агаломшаны, а тым, што Дзяргай сядзеў у лягеры!

«За што вас пасадзілі?» «За падрыхтоўку замаху на маршала Будзённага, — сказаў ён. — І хопіць пра гэта!..» Але я ўчапіўся ў яго. Выцягваў фразу за фразай, покуль ён не разззлаваўся: «Што ты мяне дапытваеш, як энкавэдыст?!» Ды ўсё ж расказаў, што пасадзілі яго ў 1937 г., данос на яго быў, быццам ён зьбіраецца застрэліць Будзённага, які меўся прыехаць у Менск. Судзіла яго праславутая «тройка», далі пяць год зьняволеньня. Якраз увесну 1941 г. тэрмін зьняволеньня скончыўся. Расказаў і тут жа спахапіўся: «Нікому пра гэта ні слова, што я сядзеў!..» «Але чаму? — зьдзівіўся я. — Цяпер пра тыя часы нават «Праўда» піша, чаму вы павінны ўтойваць, што былі сталінскім зэкам?» «Рэч у тым, — сказаў ён апасьліва, — што ў мяне няма афіцыйнай рэабілітацыі. У 1944-м, як толькі Менск вызвалілі, я прыехаў сюды з Гомелю. Ніякай даведкі ў гомельскіх падпольшчыкаў ня ўзяў, думаў, потым вазьму, калі спатрэбіцца. А як толькі прыехаў у Менск — захварэў, пазваночнік зноў схапіла страшэнна, трапіў у шпіталь. А калі выйшаў, атрымаў па шпітальнай даведцы пашпарт. Чысты, нармальны сэры, ня той, якая была ў былых зэкаў. Нешта «органы» не дагледзелі, прашляпілі. Ну і стаў я жыць ціхенечка, уладкаваўся на працу. Пісаць стаў, друкавацца. Прынялі ў Саюз пісьменьнікаў. Маўчаў і пра лягер, і пра вайну. Ніхто мяне не чапаў, ніхто ні пра што не пытаўся. Пра што пытацца ў калекі ўбогага? Так што афіцыйнай рэабілітацыі ў мяне няма. А мэдалі гэтыя… Гомельскія хлопцы пра мяне ўспомнілі, напісалі некуды, вось і атрымаў дзьве бляшкі…» «Трэба атрымаць рэабілітацыю! — загарачыўся я. — Я сам напішу за вас, куды трэба!» І тут ён па-сапраўднаму спалохаўся: «Нікуды ня трэба пісаць! Пачнуць разьбірацца, даведаюцца, як я пашпарт атрымаў тады, у 1944-м. Я ж падмануў уладу, чысты пашпарт атрымаў, хоць ня меў на тое права. Той мой «мінус» ніхто не адмяняў. Разумееш? Так што маўчы, я табе загадваю!» Я даў яму слова, што нікому нічога не скажу пра ягоную гісторыю, і слова тое стрымаў.

Прайшло дванаццаць год, настаў год 1977-мы, юбілейны для Дзяргая — 17 верасьня яму споўнілася семдзесят. Газэта «Літаратура і мастацтва» заказала мне з гэтай нагоды артыкул аб жыцьці і творчасьці паэта, які я напісаў зь вялікай ахвотай і радасьцю. Напісаў пра ўсё — і пра 1937-мы, і пра падпольле ў Гомелі. Але перад тым, як занесьці артыкул у рэдакцыю, прыйшоў з рукапісам да Дзяргая — хай прачытае, можа, знойдзе нейкія недакладнасьці. Чытаючы, ён хмыкаў, нездаволена паводзіў плячыма, нешта бурчэў сабе пад нос і раптам рэзка ўскінуў галаву: «Што ты тут пляцеш пра лягер? Ты ж мне слова даў маўчаць!» І рашуча закрэсьліў усё, што тычылася лягеру, «мінусу» і чыстага пашпарта. Я разззлаваўся: «Усё яшчэ баіцёся? Нават ня ў тым справа, што вы ляўрэат Купалаўскай прэміі, заслужаны работнік культуры, — вам семдзесят год! Хто вас кране, каму вы патрэбны?» «А і баюся, — сказаў ён з выклікам. — І ты б на маім месцы баяўся, ня школілі яшчэ цябе, ня гнулі ў дугу! Гэта цяпер *яны* такія добранькія, а заўтра хто ведае, якія будуць? «Органы» — што ваўкі. Прыроды сваёй не мяняюць!» Памаўчаў, яшчэ раз старанна замазаў шарыкавай ручкай «лягерную тэму», стаў бурчэць, што і ва ўсім астатнім я хапіў лішку, перабраў: «Знайшоў клясыка! Дзякуй, вядома, за добрыя словы, але мог бы і больш стрымана. А то — зорка паэзіі! Напышліва, братачка!» Ня ведаю, напышліва гучала тое, што я напісаў пра яго як паэта, ці ён адрынуў тое таму, што не любіў, не выносіў кідкіх параўнаньняў, у яго «сьляза — заўсёды горкая, а пот — салёны, а кроў — чырвоная, а гора — чорнае». А чалавек, дабаўлю за яго, — усяго толькі чалавек, а ня зорка, але ўсё роўна мне хочацца паўтарыць тыя словы, якія былі ў тым маім артыкуле пра Дзяргая: «Ён як зорка, якую не адразу заўважыш на зорным небе. У вочы кідаюцца перадусім некалькі самых яркіх зорак, але яны, зоркі першай велічыні, толькі разам зь іншымі, больш сьціплымі, утвараюць усю веліч, усю прыгажосьць і гармонію зорнага купалу. Да таго ж мы ведаем, што ў іншых на першы погляд сьціплых зорках зорнае рэчыва ў тысячы разоў больш важ-

**Працяг на старонцы 20.**

## СЯРГЕЙ ДЗЯРГАЙ

### З народнага

— Куды едзеш?
— Да Менску.
— Што вязеш?
— Гэнску.
— Што за гэнску?
— Ну, гуску.
— Так бы й казаў па-людзку.
— Дык жа гусей… Толькі панства купуе!
— Дурань!
Па-панску размаўляць спрабуе!

— Куды едзеш?
— Да Навагрудку.
— Што вязеш?
— Вутку.
— Што за вудка? Гарэлка?
— Не, качка.
— Так бы й казала, дзівачка.
— Качку вуткай завуць гаспада.
— А нам якая бяда!

# Паэт, які хацеў забіць Будзённага

Працяг са старонкі 19.

кае, чым у разьдзьмутых гігантаў, мы ведаем, што асьляпляльнае зьзяньне камэты — гэта зьзяньне абалонкі пустаты. Вершы Сяргея Дзяргая ніколі не бываюць асьляпляльнымі, але яны ніколі не бываюць пустымі».

Ён ня быў знакаміты, хоць і атрымаў Літаратурную прэмію імя Янкі Купалы, яго рэдка друкавалі ў Маскве — у выдавецтве «Советский писатель» выйшла адна-адзіная агульная кніжачка вершаў, «Рациональное зерно». Кніжачку тую пераклалі Навум Кіслік, Хвёдар Яфімаў і я. І яшчэ ў часопісе «Дружба народов», недзе ў 1972 г., паявілася ў маім перакладзе падборка вершаў Сяргея Сцяпанавіча, прызнаная найлепшай паэтычнай публікацыяй году і адзначаная прэміяй часопісу. Вось і ўвесь тагачасныя ягоны ўсесаюзны посьпех. І на гэта ніколі ён не наракаў, лічыў славалюбства ганебнай заганай.

Як ні дзіўна, але найлепшую характарыстыку Сяргею Дзяргаю як чалавеку даў той, хто зьнявечыў ягонае жыцьцё, — ягоны стрыечны брат (імя ня памятаю). Гэта брат пасадзіў яго ў 1937-м, напісаў на яго паклёпніцкі данос, зыходзячы зь меркаваньняў абсалютна трывіяльных. Той брат, як і ўсе савецкія людзі, быў, гаворачы словамі Воланда з раману Міхаіла Булгакава «Майстар і Маргарыта», «сапсаваны кватэрным пытаньнем» і вырашыў завалодаць пакойчыкам Сяргея Сцяпанавіча. Для гэтага трэба было «ліквідаваць» гаспадара пакойчыку — у 1937-м энкавэдысты заахвочвалі даносчыкаў вельмі проста: аддавалі ім жытло ахвяр. І вось праз дзесяцігодзьдзі, калі Дзяргай жыў ужо ў «шыкоўнай» кватэры на Якуба Коласа, прыйшоў да яго той ягоны брат. І папрасіў, каб Сяргей Сцяпанавіч пасяліў у сябе і прапісаў пляменьніка, сына таго стрыечнага Дзяргаевага брата. Сяргей Сцяпанавіч быў абурыўся: «Як ты можаш аб гэтым мяне прасіць? Пасьля таго, што ты са мной некалі зрабіў! Ты што, у сабакі вочы пазычыў?» Брат спакойна выслухаў і сказаў: «Правільна, Сярожа! Кепскі я чалавек, а ты — харошы. Дык чаму ты праз мяне павінен таксама зрабіцца кепскім? Ты павінен заставацца самім сабою, інакш гэта будзеш ужо ня ты!»

Што ж, меў рацыю, нягоднік!..

…Над магілай Дзяргая на Паўночных могілках стаіць сьціплы гранітны помнік. Вакол магілы разросься бэз. Шумяць яліны і сосны. Я бываю на ягонай магіле кожнага разу, калі наведваю магілу свайго бацькі: ад Сяргея Сцяпанавіча да майго таты крокаў дваццаць…

На помніку Сяргея Сцяпанавіча толькі імя й прозьвішча, даты нараджэньня й сьмерці: 17.09.1907 — 25.12.1980. (Мяне заўсёды ўражвае, што дзень нараджэньня й дзень сьмерці Дзяргая стаяць зусім блізка ад датаў Навума Кісліка — ці не адзін нейкі код кіраваў жыцьцём абодвух гэтых сяброў?..) Чамусьці ня выбілі на Дзяргаевым помніку хоць бы адзін радок зь ягоных вершаў, і мяне гэта засмучае. Хоць многія яго вершы гучаць у маёй душы самі…

Бывае, сум агорне, змога,
А дзень за днём — паўзе з начы…
Куды мне бегчы ад сябе самога?
Не, ад сябе самога не ўцячы!
Ты кажаш мне: «Пакінь дзівачыць
І лепей сьмейся, а ня плач!
Ня можаш сьвет пераіначыць,
Дык сам сябе пераінач!»
А як сябе пераіначыць,
Калі ў табе таксама сьвет?
І для цябе ён столькі ж значыць,
Як і бязьмежнасьць, як сусьвет!
І можа, ісьціна у гэтым,
І мэта — ў вечнай барацьбе
Твайго маленечкага сьвету
З тым, што ня зьмесьцім у сабе?

Не, паэты не паміраюць!..

АДАМ ГЛЁБУС



# Невялікае пра вялікіх

### Гарэцкі і 2, або Як беларусы любяць лічбу два

Калі Максім Гарэцкі пісаў аповесьць «Дзьве душы», пэўна ж, ён і думаць ня думаў, што ў беларуса будзе ажно два дні незалежнасьці: 25 сакавіка і 3 ліпеня. Двудушнасьць беларуса распаўсюдзілася на ўсё чыста. У беларуса дзьве сталіцы — Мінск і Менск, ці Менск і Вільня, ці Мінск і Масква. Усё залежыць ад перакананьняў, але ж і дзяржавы ў яго дзьве — БНР і РБ, РБ і Саюзная дзяржава. Круці ўлева ці ўправа, а дзяржавы будзе дзьве. І мовы дзьве. І граматыкі дзьве. Гербоў два — конь і капуста. Сьцягоў два. Веры дзьве, таму і Хрыстос уваскрасае ў беларускай сьвядомасьці двойчы. Новы год гэтаксама двойчы надыходзіць. Калі беларусу сказаць: «Адзін цар, адна вера, адзін народ!» Ён адкажа: «Адна-адна, адзін-адзін, ага-ага…»

Беларус — паэт, на тэзу ён знойдзе антытэзу ў простых паўторах. Таму і вялікіх паэтаў у беларуса два — Колас і Купала, Пушкін і Міцкевіч, Шэксьпір і Быкаў… Дзьве нагі ў беларуса, дзьве рукі і два вокі. Дзьве жонкі, дзьве каханкі, два сыны — разумны і дурань, дзьве дачкі — бабіна дачка і дзедава дачка, два браты — багаты і бедны. У беларуса адзін нос, і ён страшэнна праз гэта перажывае, але супакойвае сябе тым, што ў носе дзьве дзіркі.

*напісаў 05.07.2003, 21:44*

### Такубоку і нікчэмнасьць

Подыхі Азіі жахлівыя. Хто ніколі ня быў у азіяцкіх краінах, таму цяжка зразумець і паверыць у тое бязьмежна-безнадзейнае, што пануе на жоўта-залатым кантынэнце. «Няўжо можа быць нешта, створанае чалавекам, — вялікае? Сам чалавек не вялікі, не каштоўны», — кажа Ісікава Такубоку ў «Дзёньніку, напісаным лацінкай». Ён нібыта засьцерагае заходнюю, лацінскую, хрысьціянскую культуру ад празьмернага захапленьня Ўсходам.

*напісаў 05.10.2003, 17:30*

### Багушэвіч і абвесткі ў мэтро

Калі слухаў бясконцыя папярэджаньні пра зладзеяў у мэтро, прыйшла думка: трэба заклік Багушэвіча «Не пакідайце мовы сваёй, каб ня ўмёрлі!» перарабіць на «Не пакідайце рэчаў сваіх, каб ня сьпёрлі!»

*напісаў 07.07.2005, 13:22*

# Хайку ад Андрэя Хадановіча

Фэстываль хайку.
Сардэчна запрашаю
на Басёвішча!

*

Хуткія рухі —
і не халодна зусім.
Двое на сьнезе.

*

Бусел на даху.
Хтось адлятае ў вырай,
хтось — залятае…

*

Інвэрсійны сьлед
ад твайго пацалунку
паветранага.

*

Перакладаю
раман у лістох — далей
ад тваіх вачэй.

…Трэцім жаданьнем
было: вечна займацца
падлёдным ловам!

*

Вечар. Цішыня.
Толькі чуваць, як ляцяць
паўз акно пляшка.

*

Мясцовы кактэйль
«Крыжовая адкрутка»:
водка й «крыжачок».

*

Бог зь ім, з талёнам,
з рэштай! Пільнуй дарогу,
п'яны кіроўца!

*

«Вось сымбаль твой за…»
За крыху больш чым эўра —
Зерне канапель.

Няўжо выбары?!
З паштовай скрынкі тырчыць
«Савецкая Б.».

*

Плацяць за радкі
альбо тысячы знакаў…
А лічыш склады.

*

Птушкі: пяць зьверху,
сем пад імі і пяць на
ніжняй галінцы.

*

Лічыш лужыны.
Хапае пальцаў нагі
ў мокрай шкарпэтцы.

*

Кніга з друкарні
спадара Логвінава…
Я не самотны!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

Нашы «архэўцы» (ледзь не напісаў «архараўцы») — тыя, хто групуецца пры часопісе «ARCHE»), ня надта ладзяць паміж сабою, яшчэ больш ня ладзяць зь «дзеяслоўцамі», у якіх да «архэўцаў» гэткія ж моцныя зваротныя пачуцьці. Калі размаўляеш з тым ці іншым літаратарам (зь любой групоўкі) паасобку, кожны крыўдуе на кожнага, кожны кожнага вінаваціць у разьяднаньні і кожны нібыта шчыра не разумее, як у часы, калі ўсяму беларускаму, колькі яго ёсьць, трэба было б яднацца, адносіны ў нашых літаратурных групоўках дайшлі амаль да варожых — і як такое між намі, беларусамі, сёньня можа быць?..

А так яно між намі сёньня можа быць, як было яно заўсёды і між усімі.

У 1830 годзе беларус Тадэвуш Булгарын піша ў «Северной пчеле» (выданьні, зь якога карміўся) фэльетон пра двух літаратараў-французаў, адзін зь якіх «прыроднай француз, што служыць шчырэй Бахусу і Плютусу, чым музам, які ў сваіх творах ня выявіў ніводнай высокай думкі, ніводнага ўзьнёслага слова, ніводнай карыснай ісьціны, у якога сэрца халоднае і нямое, істота, як вустрыца, а галава — род бразготкі, напоўненай грымучымі рыфмамі, дзе не зарадзілася ніводная ідэя, які, падобна да шалёных у Пільпаевай байцы, што кідаюць камяні ў нябёсы, кідае рыфмамі ва ўсё сьвяшчэннае, фанабэрыцца перад чэрню вальнадумствам, а цішком поўзае перад нагамі моцных, каб дазволілі яму ўбрацца ў шыты каптан»…

Насамрэч напісана гэта не пра нейкага француза, а пра Пушкіна — і не таму, што ён, прыніжаючыся, дамагаўся званьня камэр-юнкера. Напісана гэта толькі з той прычыны, што Пушкін стаў спрыяць Дэльвігу ў выданьні «Литературнай газеты», якая, безумоўна, бачылася канкурэнткай «Северной пчелы». За што іншае — не, а за рубель Тадэвуш Бенядзіктавіч быў гатовы парваць каго хочаш. У тым ліку і Аляксандра Сяргеевіча, якому пяць год таму (у красавіку 1825) пісаў: «Бог бачыць душу маю, ведае, як я цаню ваш талент… Ня верце, што вам будуць пісаць ворагі мае… Жукоўскага заўсёды буду шанаваць як чалавека, а паэтам лічыць дрэнным… Вяземскага добрым, разумным, высакародным — не паэтам. А вас — *паэтам*».

Пазьнейшыя зьмены ў адносінах і ацэнках адбыліся не праз тое, што Булгарын быў беларусам, і нават не таму, што быў ён літаратарам. Зусім, трэба сказаць, някепскім: «Айцец езуіт, як езуіт, быў для ўсіх загадкай…»

# Джэніфэр Лопэз на вокладцы «Pirelli»



JENNYLOPES.IESPANA.ES

**На вокладцы календара Pirelli на наступны год будзе зьмешчана фота 36-гадовай актрысы і сьпявачкі Джэніфэр Лопэз. Унутры будзе таксама фатаграфія Кейт Мос. Pirelli наважыўся апублікаваць яе здымак, нягледзячы на тое, што шмат фірмаў спынілі супрацоўніцтва з мадэльлю, пасьля таго як у прэсе зьявіліся фота, на якіх яна ўжывае какаін. Прэзэнтацыя календара адбудзецца 18 лістапада ў Парыжы. Фота, што будзе на вокладцы, пакуль трымаецца ў таямніцы. Каляндар Pirelli нельга нідзе купіць, але ўсё адно яго прэзэнтацыя штогод робіцца вялікай падзеяй. Ён складаецца са здымкаў прыгожых жанчын, зробленых найлепшымі фатографамі. Упершыню каляндар быў выдадзены ў 1964 г. Сёньня ва ўсім сьвеце раздаецца пад 40 тысяч яго пранумараваных асобнікаў. Асобнік пад нумарам адзін дастаецца ангельскай каралеве, а ў іншых краінах, у якіх зьяўляецца вэрсія календара, — першай лэдзі. Астатнія атрымліваюць партнэры фірмы Pirelli, а таксама выбраныя асобы, пераважна вядомыя зь першых старонак газэт.**

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Прагаласуй за нашых

Беларускія спартсмэны Іван Ціхан і Вадзім Дзевятоўскі (кіданьне молата), Надзея Астапчук (штурханьне ядра) і Рыта Турава (спартовая хадзьба) прэтэндуюць на званьне найлепшых лёгкаатлетаў Эўропы—2005. Іх імёны значацца ў сьпісе з 44 прэтэндэнтаў (22 мужчыны і 22 жанчыны). У галасаваньні, што ідзе на сайце Эўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі да 31 сьнежня, бяруць удзел як наведвальнікі рэсурсу, так асобна журналісты ды спартовыя спэцыялісты. Летась перамаглі алімпійскі чэмпіён у трайным скачку швэд Крыстыян Олсан і алімпійская чэмпіёнка ў бегу на 800 і 1500 мэтраў Кэлі Голмз (Вялікабрытанія). Прагаласаваць за нашых можна па адрасе www.european-athletics.org/index.php?inhalt=poll/eaapoll2. Адзінае — давядзецца зарэгістравацца падчас галасаваньня.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Гарадзенскі асілак Іван Ціхан

### Баскетбол: камандаў усё меншае

На мінулым тыдні стартаваў чэмпіянат Беларусі па баскетболе сярод мужчын. На старт выйшла шэсьць клюбаў — на два менш, чым летась. Чэмпіён Беларусі менскі «Віталюр» і сярэбраны прызэр «Гароднят-93» атрымалі па дзьве ўпэўненыя перамогі. Той, каго не цікавяць рэаліі айчыннага баскетболу, хай зьверне ўвагу на чэмпіянат Нацыянальнай баскетбольнай лігі, што стартаваў 1 лістапада. Хоць беларускіх гульцоў, у адрозьненьне ад Нацыянальнай хакейнай лігі, там не назіраецца, паглядзець ёсьць на што. Пагатоў што тэлеканал «Лад» будзе паказваць найлепшыя паядынкі рэгулярнага чэмпіянату.

### Беларускія дзюдаісты — чэмпіёны Швэцыі

Беларускія дзюдаісты працягваюць трымаць сваю высокую марку. Так, на Адкрытым першынстве Швэцыі нашы спартоўцы заваявалі чатыры мэдалі. Посьпеху дабіліся Кацярына Разумава, якая заваявала «золата» ў вагавой катэгорыі 48 кг, а таксама алімпійскі чэмпіён Ігар Макараў (звыш 100 кг), Сьвятлана Цімашэнка (78 кг) і Мікалай Баркоўскі (81 кг), на рахунку якіх бронза.

### Беларусь—Латвія ў Віцебску

Нацыянальная футбольная зборная Беларусі завершыць сэзон 12 лістапада. У гэты дзень, калі ў футбольнай Эўропе пройдуць стыкавыя паядынкі за права трапіць на чэмпіянат сьвету—2006, беларусы правядуць таварыскі матч са зборнай Латвіі. Гульня пройдзе ў Віцебску. 13 лістапада ў Берасьці моладзевая зборная згуляе таварыскую гульню супраць пагодкаў з Польшчы. 16 лістапада матч у адказ за Бугам.

**АР, belta.by**

## НАД ШУМАМ ДЗЁН

### Кітаец з усімі выгодамі

Маю забаву — назіраць, як дзьве мае кузынкі, якім па шаснаццаць гадкоў, шукаюць жаніхоў.

Адзін мой прыяцель акурат у шаснаццаць і жаніўся. Дзіця з маткаю праз год ужо сядзела на каленях у другога бацькі, а сябрук забаўляўся з чарговай… жонкай. Таму, назіраючы за сястрычкамі, шторазу пракручваю варыянты разьвіцьця падзей.
Калі на гадзіньніку поўнач, а твае непаўналетняе няма дома, што можна падумаць? Праўда, пакуль усё абмяжоўваецца шпацырамі па раёне.
Ды пошукамі «мужа» праз Інтэрнэт.
Беларусачкі нездарма лічацца ходавым таварам на рынку каханьня. Яны едуць за мяжу прадаваць ня цела, але душу. З усімі прычындаламі, але зусім ня ў рабства, а ў абмен на абсалютна адчувальныя даброты: кватэру, статус хатняе гаспадыні бяз клопату на кухні — на тое ёсьць спэцыяльна нанятая работніца. У яе рабочы час якраз можна схадзіць у салён прыгажосьці.
Таму, калі іншая мая кузынка прарвалася ў Парыж і ледзь ня выйшла замуж, я быў за яе рады. І што з таго, што яе дзеткі загавораць па-француску? А што, лепш, каб яны «як усе» гергеталі на тутэйшай «мінскай»?
Ды і хто сказаў, што там яны будуць меншымі беларусамі, чым тут?
Скажаце, найлепшыя людзі зьяжджаюць? Ды ці зьяжджалі б яны з моцнае і квітнеючае, са сваіх гарадоў-садоў, калі б *там* не было лепш?
Тая першая спроба зьехаць на гнілы Захад праваліласся. Хлопчык аказаўся курвелем. Але гэта было пасьля. А тады, ля Гранд-Апэра, было прыгожа. І мянчанка ў Парыжы сьвяткавала трыюмф.
Тым часам па маю другую малую прыяжджаў джып. Але 19-гадовыя беларусікі з нашыўкамі «Ўзброеныя сілы» яе натхняюць мала. Кажа: лепш быць кінутай у Парыжы французскім раскідонам, чым тутэйшым… (не стае цэнзурных слоў).
— Тадзік, няўжо ты не разумееш — усе паўсюль аднолькавыя!
— Але ж ёсьць іншыя асяродкі, з больш годнымі «кандыдатамі».
— І што, мне езьдзіць у іншы канец гораду?
Дайсьці да кампутара сапраўды прасьцей, чым даехаць на другі канец гораду. Дашачка пры кампе страляе хлапчукоў. Зноў прыцэл — Парыж. Адказвае нейкі 25-гадовы парыжанін. Ён — кіраўнік нейкага банку ці аддзяленьня банку, што для нас амаль адно і тое ж. І вось — нарэшце: ён абяцае сваю фатаграфію. Даша зь сяброўкай Наташай жартуюць: «Ну-у, зараз акажацца, што гэта нэгр з пузам!» — дзяўчаты ня страчваюць пачуцьця гумару і самаіроніі. Пакуль фатаграфія загружаецца, яны сьмяюцца. Калі адкрылася — сьмяюцца яшчэ мацней. Наш герой — двухмэтровы… кітаец! Асоба кітайскай нацыянальнасьці дужа пакутуе ў сваім Парыжы бяз жонкі.
— Мая дарагая беларуская сяброўка, памажы знайсьці спадарожніцу жыцьця, — упрошвае карцінка на экране. — Пяцьсот эўра табе, калі паспрыяеш…
Даша залілася сьлязьмі ад сьмеху, ну а мая другая сястрычка тым часам пайшла на чарговы шпацыр па вуліцы пабітых ліхтароў. Што ёй трэба? Краса і сіла.
А сіла сёньня — гэта грошы. І ня будзем маралізаваць наконт мэркантыльнасьці сучаснае моладзі. Жыцьцё адно, і хочацца іменна жыць, а не існаваць.
«Ён не красун, але ж гэта не галоўнае. Галоўнае, каб з чалавекам можна было паразумецца». Калі такое гавораць 16-гадовыя дзяўчаткі, ёсьць пра што задумацца: і бацьку сямейства, і бацьку нацыі.

**Тадэвуш Новак**

ІНФАРМАТАР

# Рэстараны са стравамі зь беларускай кухні

**«Алусема»**
вул.Русіянава, 1
285–99–50
12.00—5.00

**«Арта»**
вул.Мірашнічэнкі, 55
261–23–31/31–47

**«Батлейка»**
пр.Ф.Скарыны, 75
232–10–94
11.30—23.00

**«Беларускае бістро»**
вул.Фрунзэ, 5
236–42–13

**«Беларускае бістро»**
пр.Машэрава, 23
206–45–20, 226–65–77
12.00—23.00

**«Беларускі экспрэс»**
пр.Машэрава, 11
223–85–25

**«Бістро»**
вул.Казлова, 25
236–36–59
11.00—19.00

**«Бульбяная»**
пр.Ф.Скарыны, 53
232–44–52
11.00—23.00

**«Бярозка»**
пр.Ф.Скарыны, 40
284–75–89, 288–18–47

**«Вавёрачка»**
пр.Партызанскі, 7
227–72–10

**«Вярба»**
вул.Крапоткіна, 51
234–69–95
11.00—23.00

**Гатэль «Беларусь»**
вул.Старажоўская, 15 (1–шы паверх)
209–75–95, 209–75–78
Жывая музыка.
12.00—24.00

**«Дзякуй»**
вул.Я.Коласа, 55
262–28–13
11.00—21.00



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**«Доўгі Брод»**
вул.Мар'еўская, 3
236–50–29, 284–87–12

**«Дуплет»**
вул.Алібегава, 13/1
270–21–97
12.00—24.00

**«Капрыз»**
праезд Галадзеда, 11
241–78–61, 658–34–88

**«Карчма на Маркса»**
вул.К.Маркса, 21
226–03–41
10.00—23.00

**«Крыніца»**
вул.Леніна, 2
227–08–04, 227–59–13
Жывая музыка.
12.00—24.00

**«Легіён»**
вул.Чырвоная, 23
284–51–86

**«Лябірынт»**
пр.Партызанскі, 130
242–10–61

**«Менскі бровар»**
вул.Кісялёва, 30
286–07–52
«Жывое» піва.
12.00—23.00

**«Мірскі замак»**
вул.Гарадзкі Вал, 9
206–69–38

**«Мядзьведжы кут»**
зав.Уральскі, 15
12.00—23.00

**«Налібокі»**
вул.Кульман, 4
232–38–73
10.00—23.00

**«Няміга»**
вул.Раманаўская Слабада, 26
223–14–05

**«Палесьсе»**
вул.Нікіфарава, 2
285–94–35, 260–80–70
Жывая музыка.
12.00—3.00

**«Печкі-лавачкі»**
пр. Ф.Скарыны, 22
227–78–79, 227–61–02
8.00—24.00

**«Ракаўскі бровар»**
вул.Уральская, 13
235–17–01
Караоке.
11.00—23.00

**«Русалачка»**
САК «Юнацтва», п.Ратамка
503–91–29

**«Сасновы бор»**
вул.Несьцерава, 51
242–67–79, 243–49–11
9.00—21.00

**«Сосны»**
пр.Партызанскі, 70а
295–02–21/04–31
16.00—23.00

**«Стары млын»**
пр.Ф.Скарыны, 76
«Жывое» піва.

**«Сьвітанак»**
пр.Ф.Скарыны, 23
222–27–83, 227–31–06
Піўны бар, жывая музыка, летняя кавярня.
12.00—2.00

**«Сьвіцязь»**
пр.Ф.Скарыны, 84а
264–80–81
12.00—24.00

**«Сьвіцязянка»**
вул.Сурганава, 20/1
232–15–13
11.00—22.00

**«Сям'я»**
бульвар Трактарабудаўнікоў, 5/8
230–44–10
Жывая музыка, шоў, стрыптыз.
10.00—23.00

**«Талака»**
вул.Ракаўская, 18
203–27–94

**«Турыст»**
пр.Партызанскі, 81
245–41–22/40–43
Жывая музыка, шоў.
8.00 — 23.00

**«У Французка»**
пр.Ф.Скарыны, 19
222–48–02, 227–73–39

**«У хана»**
пр.Партызанскі, 87
295–42–93
12.00—24.00

**«У сяброў»**
вул.Філімонава, 61
263–40–55
12.00—23.00

**«Часінка»**
пр.Партызанскі, 67
295–05–22
10.00—5.00

**«Чорны бусел»**
вул.Б.Хмяльніцкага, 10а
287–18–30

**«Што рабіць?»**
вул.Чарнышэўскага, 10а 266–18–13, 623–87–86,
11.00—3.00

КАІСА

# Фізыкі перамагаюць лірыкаў

На фізфаку БДУ 10—21 кастрычніка ладзілася першынство ўнівэрсытэту сярод студэнтаў і асьпірантаў. Выступілі каля 25 чалавек. Чаму «каля»? Студэнты — народ няпросты: некаторыя, убачыўшы, што нічога ня сьвеціць, сышлі. Так, кандыдат у майстры Шабанаў пасярод спаборніцтва зьехаў ва Украіну, дзе гарантаваліся большыя прызы за перамогу.

Але ўсё роўна барацьба выйшла напружаная. Турнір выявіў, што імпэтных гульцоў у БДУ хапае. Тры першыя месцы захапілі прадстаўнікі факультэту прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — кандыдаты ў майстры Павал Макевіч, Аляксандар Хаймінаў, Ільля Ракіцін. Прызэрам чэмпіянату былі раздадзены нататнікі, мэдалі і граматы, раздрукаваныя на каляровым прынтэры. Акрамя таго, яны атрымалі права на… харчовыя талёны і пропуск у басэйн.

Чэмпіянат сярод студэнтаў — не адзінае шахматнае спаборніцтва ў БДУ. Асобна ладзяцца камандныя міжфакультэцкія спартакіяды сярод супрацоўнікаў, дзе выступае, напрыклад, супрацоўнік фізычнага факультэту Алег Раманаў, чый рэйтынг зашкальвае за 2430. У паветры носіцца ідэя аб'яднаўчага чэмпіянату, каб у адных часавых рамках сустрэліся навучэнцы і пэдагогі, аднак пакуль яна — са сфэры фантастыкі. І насамрэч, як жа дапусьціць, каб студэнт перайграў выкладчыка?

Крыху пра пераможцаў. Павал Макевіч з Гарадні — негаваркі асьпірант. Паралельна больш як два гады цягне сайт «Шахматы ў Беларусі» (bychess.narod.ru), куды зайшло больш як 24 тыс. наведнікаў, — паводле слоў аўтара, «шахматны твар краіны». Аляксандар Хаймінаў — студэнт-першакурсьнік з Жодзіна. Выступаў у першай лізе, сёлета езьдзіў на чэмпіянат Эўропы сярод юнакоў да 18 гадоў. Гуляе амбітна, упарта, стабільна. У Чарнагорыі ўзяў толькі 4 балы з 9, аднак свой рэйтынг падняў. Прапануем твор віцэ-чэмпіёна БДУ, дзе пазыцыйны ціск белых доўжыўся ўсю партыю.

**А.Хаймінаў — С.Паўлаў. Герцаг-Нові, 2005.**

1. e4 c5 2. Kf3 Kc6 3. Cb5 Kf6 4. Фе2 Фb6?! (не стасуецца з 3… Kf6) 5. Cc6 Фc6 6. Kc3 g6 (пасьля 6…e6 чорныя не ўраўноўваюць гульню: 7. 0-0 d6 8.d4) 7. d4 cd 8. Kd4 Фb6 9. e5 (цікава 9. Фc4! Cg7 10. Ce3 зь перавагай) 9…Фd4 10. Kb5 (мацней выглядае 10. ef Фf6 11. Kb5 Kpd8 12. Ce3!) 10…Фc5 11. ef a6 12. Kc3 e6 13. 0-0 b5 14. Ce3 Фc6 15. Tfd1 (белым не дае спакою ідэя сыцыліянскага каня на d5) 15…b4? (чорныя гуляюць «у адны вароты», лепш 15… Bb7) 16. Kd5! Cb7 (кепска і 16…ed 17. Cb6+ Фe6 18. Te1) 17. f3 Cd6 18. Kb6 Td8 19. Фc4 Ce5? (лепш 19…Фc7) 20. Фb4 Cf6 21. Kc4 Ce7 22. Kd6+ Cd6 23. Td6 Фb5 24. Фb5 (можна было і 24. Фc3 Tg8 25.a4 — пазыцыя чорных безнадзейная) 24…ab 25. Cg5 Ta8 26. Cf6 Tg8 27. Tad1 Cc6 28. h4 h6 (28…Ta2 29. Tc6!) 29. f4 Cd5 30. a3 Tc8 31. Td2 Tc6 32. Tc6 dc 33. b3 Kpd7 34. c4 bc 35. bc Ta8 36. Cb2 Kpd6 37. cd ed 38. Ce5+ 1-0.

*Заўвагі міжнароднага майстра Вячаслава Чакурава.*

***

### Фізыкі жартуюць

**Тэарэма 404**. Калі ў момант нараджэньня на сайце ёсьць спасылкі, якія не працуюць (напрыклад, у мэню), то яны не запрацуюць ніколі.

**Доказ** грунтуецца на наступнай важнай уласьцівасьці.

**Уласьцівасьць энтузіязта**. Энтузіязм стваральніка некамэрцыйнага сайту зьяўляецца функцыяй неўзрастальнай у шырокім сэнсе.

**(bychess.narod.ru)**



### Як бы вы згулялі?

А.Савурка — П.Макевіч. Менск, 2005. Ход чорных. Белыя толькі што напалі на каня е7 і пешку а7…

**Адказ:** у чорных знайшоўся ход 1…Kpd7! Разгубіўшыся, студэнтка пайшла 2. e4 і прайграла (2…hg 3. ed Th1+!)

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 4 лістапада

**БТ, 12.10**

«Крушэньне імпэрыі».

Беларусь, 1970, рэж. Уладзімер Корш–Саблін.

Гісторыка–рэвалюцыйны фільм.

Бальшавік Ваўлін вяртаецца ў Петраград з высылкі і ўключаецца ў рэвалюцыйную барацьбу…

Жанр гісторыка-рэвалюцыйнага фільму быў кананізаваны: бальшавікі, народ, памешчыкі й капіталісты, якія разлагаюцца. У карціне Корш-Сабліна разлагаюцца вярхі імпэрыі напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі. У сёньняшняй сытуацыі фільм выглядае нясьціплым намёкам.

**БТ, 22.00**

«Бішунма — ваяр, які лётае».

Паўднёвая Карэя, 2000, рэж. Янг–Джан Кім.

Гістарычны ўсходні баявік.

Кітай XIV ст. Паднябесная кіруе Манголія. Міжусобныя бойкі і ваяры, якія ўмеюць лётаць. Дэкарацыі сярэднявечча. Фэхтаваньне. Любоўная гісторыя.

«Бішунма» — другі па касавых зборах карэйскі фільм.

### Субота, 5 лістапада

**СТВ, 0.30**

«На 10 хвілін старэй: труба».

Кітай—Гішпанія—Нямеччына—ЗША—Вялікабрытанія—Фінляндыя—Нідэрлянды, 2002, рэж. Джым Джармуш, Акі Каўрысьмякі, Спайк Лі, Чэн Кайге, Вэрнэр Гэрцаг, Вім Вэндэрз, Віктар Эрысе.

Драма, эксьпэрымэнт.

Першая частка эксьпэрымэнтальнага альманаху. Навэлі рэжысэраў аб'яднаныя джазавымі імправізацыямі на трубе, і кожны паказвае сваю


WWW.TENMINUTESOLDER.CO.UK

гісторыю. Энцыкляпэдыя стылістычных прыёмаў ад Акі Каўрысьмякі да Віма Вэндэрса. Гісторыі пра «Далёка схаваныя 100 кветак», «Лінію жыцьця», «На 10 тысяч гадоў старэй», «Ноч у трэйлеры», пра «Сабак, якія не адпраўляюцца ў пекла», пра «Нас абрабавалі» і «12 міляў да Стальца».

### Нядзеля, 6 лістапада

**СТВ, 7.55**

«Каменная кветка».

Расея, 1946, рэж. Аляксандар Птушко.

Казка паводле казак Паўла Бажова.

А.Птушко — няўрымсьлівы кінаказачнік, творца адмысловых эфэктаў і складаных здымак («Ільля Мурамец», «Новы Гулівэр», «Садко», «Руслан і Людміла»), мастацкі кіраўнік «Вія».

У фільме «Каменная кветка» Птушко эксьпэрымэнтуе з колерам — і «гаспадыня меднай гары» мае незвычайны палац.

Прэмія ў Канах за найлепшае колеравае рашэньне.

**БТ, 15.15**

«Маем рэчы» (аўтар — Алесь Матафонаў).

Гэтым разам — пра сыр.

**БТ, 22.30**

«Бег»

Расея, 1970, рэж. Аляксандар Алаў, Уладзімер Навумаў

Гістарычная драма паводле твораў М.Булгакава.

Грамадзянская вайна завяршаецца. Пасьля ўварваньня Чырвонай арміі ў Крым адтуль пачынаецца сыход…

Магутная эпічная карціна (апэратар Леван Паатащвілі), яскравыя вобразы — інтэлігента (Аляксей Баталаў), генэрала Чароты (Міхаіл Ульянаў), карцёжніка (Яўген Еўсьцігнееў), прусаказаводчыка (Уладзімер Басаў).

І генэрал Хлудаў (дэбют Уладзімера Дваржэцкага) — кат, які пакутуе ад болю братазабойства.

**«Лад», 23.55**

«Праклён Нэфрытавага скарпіёна».

ЗША—Нямеччына, 2001, рэж. Вудзі Ален.

Інтэлектуальна–дэтэктыўная камэдыя.

Страхавы агент (Вудзі Ален) цярпець ня можа эксьпэртку Бэці (Хэлен Хант). Але яны ўсё-такі закахаліся. Пад гіпнозам…

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**Мы пратэстуем**
У краме «Падземка» (пр.Скарыны, 43) **да 8 лістапада** працуе выстава твораў Міці Пісьляка і Аляксея Губарава «Мы пратэстуем». Уваход вольны.

**Краявіды беларускай Палестыны**
**4 лістапада** а 15 гадзіне ў краязнаўчым музэі Турава адкрываецца фотавыстава Юрася Кур'яновіча «Краявіды беларускай Палестыны».

## ІМПРЭЗЫ

**Фэнтэзі па-беларуску**
**4 лістапада** ў 44-й аўдыторыі гістарычнага факультэту БДУ (вул.Чырвонаармейская, 6) адбудзецца творчая сустрэча зь пісьменьніцай з Гомелю Людмілай Багданавай на тэму «Дзе творы жанру фэнтэзі на беларускай гістарычнай і міталягічнай глебе?». Пачатак а 19-й. Уваход вольны.

## СПОРТ

**Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Апошні тур**
**5 лістапада** (субота)
**Матчы за мэдалі першынства**
МТЗ-РІПА (Менск) — «Тарпэда» (Жодзіна). Стадыён «Трактар».
«Дняпро-Трансмаш» (Магілёў) — «Дынама» (Менск).

**Хакей. Чэмпіянат Беларусі**
**6 лістапада** (нядзеля)
«Дынама» (Менск) — «Керамін» (Менск). Палац спорту.
«Юнацтва» (Менск) — «Хімвалакно» (Магілёў). Парк імя Горкага.
«Гомель» — «Сокал» (Кіеў).
«Берасьце» — «Нёман» (Горадня).
«Хімік-СКА» (Наваполацак) — «Віцебск».
Пачатак матчаў а 13-й.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
*На сцэне Дому афіцэраў*
**3** (чц) — «Рыгалета».
**4** (пт) — «Царская нявеста».
**5** (сб) — вечар старадаўняй музыкі.
**8** (аўт) — «Кармэн».
**9** (ср) — «Вясельле Фігара».
*На сцэне Філярмоніі*
**6** (ндз) — творчы вечар заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь Тамары Глаголевай і Уладзімера Пятрова.

**Балет**
**3** (чц) — «Жызэль».
**5** (сб) — «Сьпячая прыгажуня».
**9** (ср) — «Лебядзінае возера».

**Купалаўскі тэатар**
**3** (чц) — «Таполевая завея».
**4** (пт) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**5** (сб) — «Дзіўная міс Сэвідж».
**6** (ндз) — «Смак яблыка».
**9** (ср) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**10** (чц) — «Чычыкаў».
**11** (пт) — «Згублены рай».
**12** (сб) — «Памінальная малітва».
**13** (ндз) — «С.В.».

**Ранішнія спэктаклі**
**6** (ндз) — «Паўлінка».

**Малая сцэна**
**3** (чц) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**6** (ндз) — «Варшаўская мэлёдыя».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**3** (чц) — «Адна цалкам шчасьлівая вёска».
**4** (пт) — «Здані на пагорку».
**5** (сб) — «Чорны квадрат».
**6** (ндз) — «Палёты з анёлам».
**8** (аўт) — «Валянціна».
**9** (ср) — «Містэр Розыгрыш».
**11** (пт) — «Трыбунал».
**12** (сб) — «Нязваны госьць».
**13** (ндз) — «Адвечная песьня».

**Тэатар Горкага**
**3** (чц) — «Адзіны спадчыньнік».
**6** (ндз) — «Дзядзькаў сон».
**8** (аўт) — «Суцяшальнік удоў».
**9** (ср) — «Амфітрыён».
**10** (чц) — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасьці».
**11** (пт) — «Дэтэктар хлусьні».
**12** (сб) — «Нінечка».
**13** (ндз) — «На Залатым возеры».

**Тэатар юнага гледача**
**3** (чц) — «Позьняе каханьне».
**4** (пт) 19.30 — «На ўсю Іванаўскую».
**4** (пт) 16.00 — «Фрол Скабееў».

**«Зьніч»**
**10** (чц) — «Мой маленькі прынц».

## КІНО Ў МЕНСКУ

Да **7 лістапада** ў сталічным Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3) працягваецца **Тыдзень цэнтральнаэўрапейскага кіно**, што праводзіцца ў рамках Дзён культуры Славаччыны ў Беларусі.
Паказы штодзённа з 15-й па 19-ю. У праграме заяўлены стужкі «118 дзён у палоне лёду», «66 сэзонаў» (ляўрэат шматлікіх прэмій), «Прапэлер», «Гэй вы, славакі!», «Я — зьніадкуль». Фільмы ідуць на славацкай з ангельскімі субтытрамі.

**«Аўрора»** (253-33-60)
«9-я рота»***: **4** (пт) 16.00 (іл), 18.30, 21.00; **5—7** (сб—пн) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.
«Місія «Сэрэніці» (прэм'ера): **4—7** (пт—пн) 14.20 (іл), 16.40, 19.00, 21.10.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)
«9-я рота»***: **4, 5** (пт, сб) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **6, 7** (ндз, пн) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Дом кіно»** (266-35-26)
«9-я рота»***: **4** (пт) 16.30 (іл) 19.00, 21.30; **5, 6** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 19.00, 21.30; **7** (пн) 16.30, 19.00, 21.30.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Саракагадовы нявіньнік»***: **4** (пт) 16.30 (іл), 19.00, 21.00; **5, 6** (сб, ндз) 16.30 (іл), 19.00; **7** (пн) 19.00, 21.00.
«Браты Грым»***: **5, 6** (сб, ндз) 21.00; **7** (пн) 16.30 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Місія «Сэрэніці» (прэм'ера): **4, 7** (пт, пн) 14.20, 16.40, 19.00, 21.20; **5, 6** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.40, 19.00, 21.20.

**«Масква»** (203-14-48)
«Місія «Сэрэніці» (прэм'ера): **4** (пт) 16.30, 18.50, 21.10; **5—7** (сб—пн) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.10.

**«Мір»** (288-22-33)
«Перавозчык-2»: **4** (пт) 16.30 (іл), 18.30, 20.30; **5, 6** (сб, ндз) 16.30, 20.30; **7** (пн) 16.30.
«Правілы сэксу-2: хэпі-энд»***: **4—7** (пт—пн) 17.00, 19.10, 21.30.
«Трымайся да канца» (прэм'ера): **5, 6** (сб, ндз) 18.30, 22.20; **7** (пн) 18.30, 20.30.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Правілы сэксу-2: хэпі-энд»***: **4—6** (пт—ндз) 18.50, 21.10; **7** (пн) 16.30 (іл).
«Знаёмства з Цукерамі» (тыдзень нямецкага кіно): **7** (пн) 19.00, 21.00.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Перавозчык-2»****: **4—7** (пт—пн) 16.00, 18.30, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Саракагадовы нявіньнік»***: **4, 5** (пт, сб) 16.30, 18.50, 21.10; **6, 7** (ндз, пн) 16.30 (іл), 18.50, 21.10.
«Жах Амітывілю»****: **4—7** (пт—пн) 13.00, 14.40.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.



**Гандбол. 6 лістапада (нядзеля). Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Берасьце) — «Кіль» (Нямеччына). Менск. Палац спорту. Пачатак у 17.20.**

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**

**Тэатар юнага гледача**
**3** (чц) — «Хатні тэатар нянечкі Арыны».
**4** (пт) — «Залатое сэрцайка».
**5** (сб) — «Сястра мая Русалачка».
**6** (ндз) — «Неймаверныя прыгоды Місіка і яго сяброў у краіне казак».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**5** (сб) — «Воўк-мараплавец».
**6** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

**Купалаўскі тэатар**
**13** (ндз) — «Афрыка».

**Кіно**
**«Аўрора»**
«Мадагаскар»: **4** (пт) 11.00; **5—7** (сб—пн) 12.40.
«Мой братка — сабачка»: **5—7** (сб—пн) 10.50.

**«Бярэсьце»**
«Два браты»: **4, 5** (пт, сб) 11.00.
«Легенда пра рыцара»: **6, 7** (ндз, пн) 11.00.

**«Дом кіно»**
«Карлсан, які жыве на даху»: **4** (пт) 10.30.
«Прадвесьнікі буры»: **4** (пт) 14.00.
«Бальная сукенка»: **5, 6** (сб, ндз) 12.00; **7** (пн) 10.30.
«Чароўная краіна»: **7** (пн) 14.00.

**«Дружба»**
«Джынсы-талісман»: **4** (пт) 14.00; **6** (ндз) 13.00.
«Прынц і я»: **5, 7** (сб, пн) 13.00.
Мультзборнік: **5—7** (сб—пн) 11.00.

**«Масква»**
«Прыгоды піратаў у краіне агародніны»: **6** (ндз) 12.20.
«Пра тое, як Колька і Пецька ляталі ў Бразылію»: **7** (пн) 12.30.

**«Мір»**
«Бэтмэн: пачатак»: **4** (пт) 14.00.
«Дзеці шпіёнаў 3D: гульня скончана»: **4—7** (пт—пн) 13.00.
«Мадагаскар»: **4** (пт) 10.30, 15.00; **5—7** (сб—пн) 15.00.
«Прышэлец з космасу»: **5—7** (сб—пн) 14.00.

**«Перамога»**
«Чуча» (прэм'ера): **4** (пт) 15.00, 17.00; **5, 6** (сб, ндз) 14.00, 16.30; **7** (пн) 12.30, 14.30.
«Вэліянт: птушыны спэцназ»: **4** (пт) 11.00, 13.00; **5, 6** (сб, ндз) 12.30.

**«Піянэр»**
«Мой браток — сабачка»: **4** (пт) 12.20, 14.00.
«Птушкі-2: падарожжа на край сьвету»: **4** (пт) 10.20; **5—7** (сб—пн) 14.00.
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **5—7** (сб—пн) 10.20.
«Гарфілд»: **5—7** (сб—пн) 12.00.

**«Цэнтральны»**
«Шалёныя скачкі»: **4—7** (пт—пн) 11.00

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**«Каралева шабанскіх пэрлаў»**
Драма, Швэцыя—Вялікабрытанія, 2004, рэж. **Колін Натлі.**
У ролях: **Хэлена Бёргстрам, Лоркан Краніч, Ліндсэй Дункан.**
Калі Джэку спаўняецца 16 год, у ягоным доме зьяўляецца жанчына, як дзьве кроплі падобная на памерлую маці... Намінацыя за кінарэжысуру на МКФ у Карлавых Варах, прызы «Гулдбэйдж» за гук і апэратарскую работу.
**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**«Bronx»** (288-10-61, 103 і 105 (Velcom)
**3** (чц) 22.00 — жывая музыка: квартэт «Port Monet» / dj-bar.
**4** (пт) 22.00 — жывая музыка / dj-bar.
**5** (сб) 22.00 — dj-bar.
**6** (ндз) 17.00 — нядзельны кінасэанс.

**«Madison»** (219-00-10)
**3** (чц) 22.00 — «Lady's Thursday».
**4** (пт) 23.00 — dj Nice.
**5** (сб) 23.00 — dj Nice.
**6** (ндз) 23.00 — «Staff party».

**«Izюм»** (206-66-18, 605-25-25)
**3** (чц) 23.00 — «RNB Royalty Party».
**4** (пт) 21.00 — dj-bar.
**5** (сб) 22.00 — dj-bar.
**6** (ндз) — жывая музыка / дыска-праграма.

**«Белая вежа»** (336-70-75)
**3** (чц) 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Bergamo.
**4** (пт) 23.00 — «Рэканструкцыя Party»: dj Michel Traxx (BE), dj Alex.
**5** (сб) 1.00 — dj Alex.
**6** (ндз) 23.00 — жывая музыка: «Acoustic band» / dj Alex, dj Verde, dj Matiz Lemark, dj Tea.

**«X-Ray»** (203-93-55)
**4** (пт) 23.00 — dj Grizzly.
**5** (сб) 22.00 — dj Top.

**«WestWorldclub»** (239-17-98)
**4** (пт) 23.00 — dj-bar.
**5** (сб) 23.00 — dj-bar.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Тыдзень прымульценьня

**«Вэліянт: птушыны спэцназ»** («Valiant»)
**Вялікабрытанія, 2005, каляровы, 109 хв.**
**Жанр:** анімацыйная камэдыя.
**Адзнака:** 4 (з 10).



WWW.MOVIEWEB.COM

На франтах Другой сусьветнай геачна змагаюцца брытанскія галубы. Юны голуб Вэліянт праходзіць адмысловую падрыхтоўку — і ў кампаніі галубінага спэцназу закідваецца ў акупаваную Францыю. Ад подзьвігаў птушынай брыгады залежыць сыход вайны...

Брытанская карціна рэклямавалася як падарунак ад стваральніка «Шрэка».

Юны голуб — брытанскі піянэр-герой. Нямецкі бок прадстаўлены ястрабамі, якія точаць кіпцюры й сьпяваюць пад Вагнэра. Асобная разынка — гераіня францускага супраціву, мышка Шарль дэ Гёрл.

Карціна, разьлічаная на патрыятычнае выхаваньне дзесяцігадовых брытанскіх дзетак, спадабаецца і беларускім. Але рэжысэру Гары Чэпмэну да «Шрэка» далёка: грубыя жартачкі, намёкі на ваенныя фільмы.

**«Чуча»** (часткі 1, 2, 3)
**Расея, 1997—2004, каляровы, 25, 26 і 29 хв.**
**Жанр:** анімацыйная казка.

Хлопчык зрабіў са старых непатрэбных рэчаў вельмі патрэбную няню — Чучу. І яна ажыла...

Рэжысэр Гары Бардзін — жывы клясык мультыплікацыйнага кіно, бліскучы выдумнік і вынаходнік. Пад ягонымі рукамі ажывалі запалкі, вяроўкі, арыгамі. Бардзінаўскі «Чырвоны Каптурок энд Шэры воўк» стаўся культавым мультфільмам.

«Чуча» — сапраўдны падарунак і для дзяцей, і для дарослых. Фільм ужо адзначаны прэміямі Чэхіі, Італіі, Расеі.

**Андрэй Расінскі**

# Стаўце заслоны!

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Нягледзячы на сваю калясальную загружанасьць, прэзыдэнт палічыў за неабходнае асабіста паставіць заслон безадказнаму стаўленьню вадзіцеляў, пешаходаў і пасажыраў да бясьпекі на транспарце. Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Слухаючы сьпіч прэзыдэнта, у думках цешыўся за Севярынца. Калі б Пашу судзілі за арганізацыю маршу супраць вынікаў рэфэрэндуму-2004 пасьля ўводу новых правілаў дарожнага руху, прышылі б ня толькі стварэньне перашкодаў руху транспарту, а яшчэ і «рух у цёмны час сутак па краі праезнай часткі безь сьвятлаадбівальных элемэнтаў».

Тут раптам вуха разануў выраз: «Неабходна паставіць жорсткі заслон безадказнаму стаўленьню вадзіцеляў, пешаходаў, пасажыраў да бясьпекі на транспарце».

«Паставіць заслон». Недзе я ўжо гэта чуў.

Апошнім часам гарант майго права пераходзіць вуліцу на зялёнае сьвятло толькі тым займаўся, што тыкаў там і сям жорсткія, надзейныя і эфэктыўныя заслоны. Падчас візыту ў Белавежу запатрабаваў «паставіць заслон браканьерству». Пры сустрэчы з дробнымі камэрсантамі — узьвесьці «эфэктыўны заслон шэрым схемам бізнэсу, крыміналу». У звароце да чыноўнікаў — «заслон усім, хто намерана дэзынфармуе грамадзян па прынцыповых пытаньнях грамадзка-палітычнага жыцьця». У час сустрэчы з рэктарамі — «заслон такім брыдкім зьявам, як хабарніцтва з боку ўнівэрсытэцкіх супрацоўнікаў і спробы падманным чынам пралезьці ў ВНУ». Палічыў ён таксама неабходным паставіць «надзейны заслон на шляху гэткіх злоўжываньняў», як «увоз аўтамабіляў з афармленьнем іх на падстаўных асоб». Падскочыўшы на студыю БТ — цытую «Саўбелку», — «прэзыдэнт жорстка запатрабаваў паставіць заслон» такім зьявам у мастацкай прадукцыі, як «гвалт, кроў амэрыканскіх баявікоў, разбэшчанасьць, амаральнасьць».

Перад намі яўна словазлучэньне-паразыт — прафэсійная хвароба публічных палітыкаў. Прыгадайце крылаты гарбачоўскі выраз «Працэс пайшоў» або ленінскае «баценька».

Найбольш прыкольнае — далейшыя прыгоды афарызму, які нараджаецца на нашых вачах і, відавочна, зьяўляецца піярнай зброяй. Тым больш што бацькавы заслоны, здаецца, дзіравыя. Падчас выбарчай кампаніі фразу можа выкарыстаць апазыцыя: запусьціць у Інтэрнэт анэкдоты пра Шурыка Заслонава. Нейк прыходзіць Заслонаў да Кубэ і кажа: «Абяцаю і бяру абавязак паставіць заслон дывэрсіям на чыгунцы». Але ўлады здольныя перахапіць ініцыятыву. Было б прыкольна, калі б наступны Ўсебеларускі народны сход прайшоў пад шчырым лёзунгам «Паставім заслон так званай свабодзе!».



Дзядоўскі хросны ход на могілках у Шэметаве, Вялейскі раён. 2 лістапада. Рэпартаж зь Дзядоў у Менску — старонка 4.

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб. За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 см² — 650 руб.

**Даведкі праз т. (017) 284-73-29**

**ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА**

**13 лістапада** (нядзеля) па маршруце: Менск—Лукавец—Альковічы—Камена—Даўгінава—Будслаў—Крывічы—Княгінін—Касьцяневічы—Менск.

**26—27 лістапада**: Вільня—Трокі—Меднікі.

**14—20 сьнежня**: Прага—Чэскі Крумлаў—Карлавы Вары.

**т.: 232-54-58, 622-57-20** (Зьміцер), **264-12-38, 776-24-35** (Павал)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Вітаю** самага крытыкалюбівага пісьменьніка А.Глёбуса з расейскамоўнымі «пірагамі» на БТ. Віват!

### КАНТАКТЫ

**Хлопец пазнаёміцца** зь дзяўчынай-беларускай для сур'ёзных адносінаў. Т.: 373-23-74, 238-87-93. Сяржук

**Прыстойны мужчына** 56 гадоў, рост 172, пазнаёміцца з адзінокай жанчынай, якой надакучыла быць адзінокай. Горадня-23, а/с 11

**Мянчук**, 44 гады (выглядаю маладзей), рост 170, в/а, пазнаёміцца зь беларускай (узрост да 40 гадоў)! Магчыма стварэньне сям'і. А/с 6, 220012. Менск

**Прадамо** эўрапейскія сьцягі розных краін і ня толькі. Беларуская гістарычная сымболіка. Нядорага. Т.: 383-48-14

**Пачаў дзейнасьць** магілёўскі клюб аматараў беларускамоўнай музыкі. Хто жадае спрычыніцца да сумеснае дзейнасьці, тэлефануйце: 241-62-14 (Сяржук), 749-83-72 (Воля)

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Выйшлі новыя дыскі «БМА Group»**: Данчык — «Я ад Вас далёка», «Палац» — «Folk Modern», «Kriwi» — «Гэй Лёлі», Кася Камоцкая — «Акустыка» і інш. Прапануем заробак распаўсюджвальнікам зь Менску і рэгіёнаў. Па пытаньнях набыцьця дыскаў зьвяртайцеся: т. 649-08-88, e-mail: w1979@tut.by, а/с 5, 220085, Менск

**«Нацыяналізм** у ХХ ст.» Э.Сьміта, «Курапаты» З.Пазьняка, «Русіфікацыю беларускай мовы ў БССР» (са слоўнікам) С.Станкевіча, «Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі», «Уводзіны ў псыхалінгвістыку», іншыя кнігі можна атрымаць дарма на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак — пятніца (15.00—19.00). Т.: 707-40-01

**Прадам кнігі**: «Беларускі арнамэнт» Кацара, «Споведзь» Л.Геніюш, «Тэўтонскі ордэн» А.Краўцэвіча, «Армія Краёва на Беларусі», «Беларуска-расейскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча (Менск, 1926), «Вяртаньне», «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», 1—5 т. ды шмат іншага, багаты выбар кніг, гісторыя, паэзія, этнаграфія. Т.: 753-70-05

**Кнігаабмен:** Т.: 753-91-96

**Беларускае аўдыё**. «Старажытная зямля», калекцыя беларускіх касэт, CD, у тым ліку аўтэнтычны фальклёр, «Я нарадзіўся тут», сучасная і архаічная музыка. Т.: 753-91-96

**Пэрыёдыка**: шматгадовы камплект часопісаў «Крыніца», розныя нумары «Студэнцкай думкі», «ARCHE», газэты «Новы час», «Наша слова», беластоцкая «Ніва», што-небудзь падару. Т.: 753-91-96.

**Прапаную**: «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, стараруская мовах і іншае. Т.: 753-91-96

**«Сьпіс землеўладальнікаў Менскай губэрні»**, «Міндаў, кароль Літовіі» (стасункі ВКЛ і Паўночнага ордэну), мэтрыкі. Т.: 753-91-96

**Пераклады**: кнігі, перакладзеныя з польскай, ангельскай, нямецкай, расейскай моў, у тым ліку «Дзяды», «Санэты» Міцкевіча, падручнікі па журналістыцы і іншае. Т.: 753-91-96

### ПРАЦА

**Беларускамоўныя няні** і гувэрнанткі ў сем'і, дзе размаўляюць на роднай мове. Т.: 226-50-31, 750-14-11. Іна

**Беларускі тамада** й вядоўца імпрэзаў. Вясельны мэнэджмэнт, мерапрыемствы «пад ключ». Тэл. 658-47-78

**Вусныя/пісьмовыя** пераклады з/на італьянскую мову. Дыяна. Т.: 757-42-97

**Navuču** niamieckaj movie. Padrychtuju da paśpiachovaj zdačy testu ci ispytaŭ pa niamieckaj movie. Т.: 290-47-72

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72

**Шукаем беларускамоўную няню**. 8 0296 73 40 36.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Перахваліў**

Малады хлопец, купляючы гадзіньнік, пытаецца крамніка:

— А ці добра ён ходзіць?

— Уга! Ён бегае, ня тое, што ходзіць! Гляньце, яшчэ полудня няма, а ён ужо пятую вечара паказвае.

М. **Капыль**, Менск. губ., Слуцк. пав. «Прыйшла Пакрова — зіма гатова»; на Пакровы ў нас выпаў першы сьнег.

**А.Гурло.**

М. **Рожышча**, Менск. губ., Мазырск. пав. Нядаўна памёр тут кравец-жыд; калі капалі для яго яму на жыдоўскіх могілках, натрапілі на гаршчок, поўны літоўскіх грошай з 1400—1500 гадоў.

**А.Гурло.**

У **Рызе**, разгружаючы карабель з дрэвам, што прыйшоў з Бразыліі, знайшлі ў дуплох шмат вужак, — адзін даўжынёй аршыны два з чвэрцю (1,6 м. — «**НН**»).

**1910, №41.**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3426. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 20.00 04.11.2005.

Замова № 6304.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а